Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 41 (4536) 30 кастрычніка 2009 г.

У нумары:

Храм народнай Перамогі

Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — адлюстраванне трагічнай біяграфіі ўсёй краіны.

Стар. 2

Пясняр Беларусі — у цэнтры Масквы

Вытокі стварэння помніка Янку Купалу на Кутузаўскім праспекце — народная ініцыятыва.

Стар. 4

Зямля пад белымі крыламі

У падарожжа запрашаюць краязнаўцы.

Стар. 12-13

«Паэт — Боская птушка...»

Анатоль Сыс і час. Да юбілею.

Стар. 14

Князёўна Ірына — візітоўка Гомеля

Памятаюць у горадзе мецэнатку і пісьменніцу XIX стагоддзя.

Стар. 16

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА Ў IV КВАРТАЛЕ 2009 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў:
1 месяц — 7760 руб.
Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска:
1 месяц — 10060 руб.
Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: на 1 месяц — 5200 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска для ўстаноў культуры і адукацыі:
1 месяц — 7870 руб. Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

Адметнае месца ў гісторыі беларускай культуры і літаратуры XX ст. займае Максім Лужанін, чый голас у паэтычным шматгалоссі не губляўся, а гучаў своеасабліва, адметна, непаўторна. Усё жыццё самааддана, нібы рупны селянін-працаўнік, шчыраваў на ніве роднай літаратуры гэты пісьменнік. А яно яму было наканавана надзвычай доўгае і плённае.



«Вярнуся ветрам»

Калі паглыне мяне шлях няблізкі
У край курганаў і абеліскаў,
Адбіць навалу над родным домам
Вярнуся громам.
А звянуць травы, асмягнуць вусны, —
Дажджом вярнуся.

Калі ж нашчадкам не будзе трэба
Ні збройны выбух, ні бохан хлеба,
У час іх зорны, час запаветны
Вярнуся ветрам.
Калі дзе знойдзем, слязу асушым,
Калі прыгаслі, раздзьмуем душы.

Нідзе не дзенуся з Беларусі,
Кім пажадае, тым і вярнуся, —
Жыло, жыве і жыць застанецца
Тут маё сэрца!

Нарадзіўся Аляксандр Амвросьевіч Каратай (сапраўднае імя паэта) 2 лістапада 1909 года ў вёсцы Прусы Салігорскага раёна ў сялянскай сям'і. У 1928 годзе скончыў Мінскі педагагічны тэхнікум, затым вучыўся на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. У час вучобы М. Лужанін прымаў удзел у рабоце першага з'езда літаратурнага аб'яднання "Маладняк". Пачатак творчай біяграфіі юнака быў паспяховы і яркі.

У 1928 г. выйшла першая паэтычная кніга "Крокі", калі аўтару споўнілася ўсяго васемнаццаць гадоў. Кніга атрымала станоўчы водгук ад Я. Купалы і Ц. Гартнага.

Час быў лозунгавы, поклічны, абнаўляльны. Станавілася на ногі новае жыццё, імкліва развівалася нацыянальная культура. Таму і вершы пісаліся бадзёрыя, сонечныя. "Сонцавы дзеці і сонцу аддадзены", — так напісаў М. Лужанін у адным з вершаў пра сябе і сваіх равеснікаў. У першы перыяд творчасці выходзілі кнігі з вершамі, прасякнутымі эмацыянальна-рамантычным успрыманнем рэчаіснасці, душэўным уздымам, акрыленасцю. "Новая ростань", "Галасуе вясна за вясну", "Кастрычнікам! Ліпенем! Маем!", "Першамайская вуліца".

У 1933 г. М. Лужанін быў рэпрэсіраваны і высланы ў Сібір (пакаранне адбываў у Марыінску Кемераўскай вобласці). Яму пашанцавала: праз два гады ён змог вырвацца са сталінскіх путаў.

У 1935 г. паэт вярнуўся да літаратурнай дзейнасці, працаваў на пасадзе рэдактара-арганізатара Галоўнай рэдакцыі літаратуры па машынабудаванні ў Маскве, пасля вайны — у рэдакцыях газеты "Звязда", часопіса "Вожык", рэферэнтам АН БССР. З 1959 па 1971 г. — на кінастудыі "Беларусфільм", у 1967 г. стаў яе галоўным рэдактарам.

На век М. Лужаніна прыпалі ўсе значныя падзеі XX стагоддзя. Ён памятаў Першую сусветную вайну і Кастрычніцкую рэвалюцыю, ваяваў на Другой сусветнай вайне, удзельнічаў у баях пад Масквой і Сталінградам. Ваенныя вершы склалі змест зборніка "Шырокае поле вайны", які расказаў, чым жыў паэт у гэты трагічны час. Жыццёвы і духоўны вопыт дазволіў аўтару падняцца на новы мастацкі ўзровень, адшукаць свой асабісты падыход, мову, метад. Вайна ў яго творах паўстае як парушэнне асноўных законаў Сусвету. Чалавечая агрэсіўнасць супрацьпастаўляецца гармоніі прыроды.

У кнігах, выдадзеных пасля вайны — "Поступ", "Святло Радзімы", "Моваю сэрца", "Прасторы" і іншых — заўважаецца шырокі погляд М. Лужаніна на мінулае Радзімы, праўдзіва адлюстроўваецца вышыня чалавечага духу і тое, на што быў здольны народ. Новай ступені мастацкасці, гармоніі формы і зместу, лірычнай глыбіні і жыццёвай праўдзівасці дасягае М. Лужанін у 1970 — 80-я гг., калі выходзяць кніга за кнігай: "Росы на коласе", "Прага крыла", "Лявоніха", "Моваю сэрца", "Паразмаўляй са мной, зямля", "Вярнуся ветрам". Аўтар дасканала валодаў прыёмамі вершаскладання. Рытміка і рыфма многіх яго вершаў з'яўляюцца ўзорамі высокай паэзіі, творамі сапраўднага мастацтва.

Пісьменнік плённа працаваў і як празаік, крытык, перакладчык, сцэнарыст. Цікавая спадчына М. Лужаніна-празаіка. Свет пабачылі некалькі кніг апавяданняў, аповесцей, успамінаў: "Дванаццаць вячорных вогнішчаў", "Людзі, птушкі, прастор", "Сустрэчы", "Трое", але асабліва вылучаецца сярод іх кніга "Колас расказвае пра сябе". За яе ў 1965 г. аўтар атрымаў Літаратурную прэмію БССР імя Я. Коласа. Матэрыял для кнігі збіраўся падчас работы М. Лужаніна рэферэнтам АН БССР, сакратаром Я. Коласа.

Не абмінуў пісьменнік у сваёй творчасці і дзяцей. Ім адрасаваны: паэма-казка "Хто робіць пагоду", "Добры хлопец Дзік" — эмацыянальнае апавяданне пра дружбу чалавека з сабакам. Як крытык выдаў зборнікі "Вачыма часу" (успаміны, артыкулы, эсэ), "З ранку да вечара" (роздум, накіды партрэтаў), кнігу публіцыстыкі "Рэпартаж з рубцом на сэрцы" і інш. М. Лужанін — аўтар сцэнарыяў мастацкага фільма па аднайменнай п'есе Я. Купалы "Паўлінка" і дакументальнага — "Народны паэт" (пастаўлены ў 1952), з А. Куляшовым напісаў сцэнарыі мастацкіх фільмаў "Першыя выпрабаванні" (пастаўлены ў 1960), "Запомні гэты дзень" (пастаўлены ў 1967).

Яму належаць пераклады на беларускую мову шэрага вельмі значных не толькі па мастацкай вартасці, але і па аб'ёме твораў. Сярод іх "Вечары на хутары ля Дзіканькі" і "Выбраныя творы" М. Гогаля, "Падарожжа з Пецярбурга ў Маскву" А. Радзішчава, "Гора ад розуму" А. Грыбаедава і інш. Пісьменнік пераклаў з рускай і польскай моў асобныя творы А. Пушкіна, М. Някрасава, А. Міцкевіча, У. Сыракомлі, У. Маякоўскага.

Калі сабраць усё разам, што выдадзена Максімам Лужаніным за доўгую творчую дзейнасць, то атрымаецца вялікая кніжная паліца. Зроблена шмат, і самае галоўнае — зроблена адмыслова, па-мастацку дасканала. Лепшыя яго творы ўвайшлі ў "залаты" фонд беларускай літаратуры.

Кацярына ВАРАНЬКО

Фота Уладзіміра Крука з фонду Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры.

Пункцірам

● Памятным медалём "Міленіум Літвы" Саюз мастакоў Беларусі адзначыў шэраг найбольш значных дзеячаў культуры краіны. "Гэтым медалём Саюз мастакоў ушанаваў найбольш выбітных асоб, якія працуюць на ніве нацыянальнай гісторыі і культуры", — адзначыў першы намеснік старшыні Саюза мастакоў Рыгор Сітніца. Сярод узнагароджаных музыка Віктар Скорабагатаў, гісторыкі Анатоль Грыцкевіч і Алесь Краўцэвіч, літаратуразнаўца Адам Мальдзіс, мастакі Гаўрыла Вашчанка, Арлен Кашкурэвіч, Васіль Шаранговіч. Пасмяротна ўганаравалі Міхася Раманюка і Яўгена Куліка.

● У Брэсцкім абласным грамадска-культурным цэнтры працуе мастацкая выстава па выніках другога міжнароднага пленэру, прысвечанага памяці жывапісца Фёдара Дарашэвіча. Пленэр праходзіў 17-22 кастрычніка на радзіме мастака ў Камянцы. Яго ўдзельнікамі былі сямёра мастакоў з Брэсцкай вобласці і трое з Польшчы. На выставе яны прадставілі 20 карцін. У экспазіцыю таксама ўвайшлі 15 прац з мінулагодняга пленэру. Працуе выстава да 6 лістапада.

● "У Беларусь павінны вярнуцца карціны і партрэты, якія некалі знаходзіліся ў Нясвіжскім замку", — такая пазіцыя сям'і Радзівілаў. Пра гэта ў інтэрв'ю Польскаму радыё заявіў прадстаўнік нясвіжскай лініі Радзівілаў Мацей Радзівіл. Як паведамлялася раней, у Варшаве 26 кастрычніка адбылася перадача беларускаму боку 48 лічбавых копій партрэтаў прадстаўнікоў роду Радзівілаў, што знаходзяцца ў фондах Нацыянальнага музея Польшчы. Копіі будуць дастаўлены ў Дзяржаўны гісторыка-культурны музей-запаведнік "Нясвіж".

На думку Мацея Радзівіла, "партрэты і карціны вядомага магнацкага роду павінны знаходзіцца на сваім месцы, гэта значыць у Нясвіжскім замку, сцены якога яны ўпрыгожвалі на працягу стагоддзяў". Нашчадак Радзівілаў падкрэсліў, што карціны перш за ўсё ўяўляюць гістарычную каштоўнасць. "Наколькі мне вядома, беларускі бок некаторы час таму звярнуўся да Польшчы з просьбай вярнуць карціны. Я лічу, перадача копій — гэта толькі пачатак", — дадаў Мацей Радзівіл і пры гэтым падкрэсліў, што ён і яго сям'я зробяць усё, што ад іх залежыць, каб карціны вярнуліся ў Беларусь.

В. К.

● Дварцова-паркавы комплекс "Свяцк" (Гродзенская вобласць) бязвыплатна перададзены санаторыю "Азёрны". Санаторыю выстаўлены ўмовы. Пры ўзнаўленні і эксплуатацыі аб'екта павінна быць забяспечана выкананне закона аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Закон абавязвае ўладальніка ў месячны тэрмін падпісаць ахоўныя дакументы. Свяцк будзе выкарыстаны пад рэстаранна-гатэльны комплекс. Будуць уладкаваны залы для прыёмаў, узноўлены паркі, сажалкі, стайні. На рэалізацыю праекта можа спатрэбіцца ад 3 да 5 гадоў. Былы палац роду Валовічаў быў пабудаваны ў канцы XVIII стагоддзя.

● У краязнаўчым музеі Віцебска адкрылася выстава, прысвечаная 150-годдзю беларускага калекцыянера Антона Брадоўскага. У экспазіцыі прадстаўлены прадметы са збораў Брадоўскага. Адным з рарытэтаў яго калекцыі з'яўляецца срэбраны пас, які належаў, па легендзе, каралю Польшчы і вялікаму князю літоўскаму Стэфану Баторыю. Акрамя гэтага, можна ўбачыць розныя ювелірныя ўпрыгожванні, калекцыю нумізматыкі.

Падрыхтаваў Павел РАДЫНА

У Саюзе пісьменнікаў Беларусі

У Мінск, на з'езд

Як паведамлялася ў "ЛіМе", пісьменнікі дзвюх краін — Расіі і Беларусі — вядуць перамовы аб стварэнні аб'яднанага творчага саюза. У адным з мінулых выпускаў штотыднёвіка згадвалася пра асацыяцыю літаратараў. Нягледзячы на разыходжанні ў назве, праца па падрыхтоўцы ўстаноўчага пісьменніцкага з'езда распачалася. Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец распавёў пра падрыхтоўку да форуму:

— Пасля кансультацый з саюзамі пісьменнікаў Расіі, старшынямі пісьменніцкіх саюзаў Масквы, Санкт-Пецярбурга мы прыйшлі да высновы, што новую творчую арганізацыю будзем называць не асацыяцыяй, а Саюзам пісьменнікаў. Пераважная большасць, з кім мне давялося пагаварыць, менавіта за гэта. Хаця я хацеў назваць асацыяцыяй, каб не было такога спалучэння: Саюз пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы. Вырашана, што з'езд трэба праводзіць у пачатку снежня ў Мінску. Для гэтага ў нас ёсць свая зала. Маюцца і іншыя варыянты. Але з'явілася ідэя прасіць урад і асабіста Юрыя Лужкова, каб правесці асноўнае пасяджэнне ў Доме Масквы. Гэта будзе сімвалічна: у Мінску ў зале з назваю "Масква" праводзіцца з'езд літаратараў дзвюх краін.

Для правядзення ўстаноўчага з'езда плануецца запрасіць па 36 чалавек з кожнага боку. Рэгіёны Расіі, пэўна, будуць дэлегіраваць пісьменнікаў прапарцыянальна. І мы б хацелі, а так яно і будзе, каб у склад нашай дэлегацыі ўвайшлі прадстаўнікі ўсіх абласцей і горада Мінска. Калі будзе ўтворан сам саюз, відаць, будзе правільна прызнаць усіх прысутных, канечне, пры іх жаданні, членамі Саюза пісьменнікаў Расіі і Беларусі. З'езд упаўнаважаны вырашаць такія пытанні.

Цяпер мы працуем над стварэннем аргкамітэта. У яго ўвойдуць прадстаўнікі нашых дзвюх дзяржаў. Задачы аргкамітэта — падрыхтаваць усе неабходныя дакументы: статут, бланкі дакументаў, пасведчанняў ці мандатаў, удзельнікам — запрашальныя білеты на з'езд і г.д. Разлічваем, што прыедуць да нас вядучыя пісьменнікі Расіі.

Штаб-кватэр новага пісьменніцкага саюза, на маю думку, павінна быць дзве — па прыкладзе выканкама Саюзнай дзяржавы. Думаю, трэба, каб меліся два сустаршыні — пісьменнікі дзвюх краін. Неабходна падумаць, і якія стварацьорганы самога саюза, секцыі, аддзелы: з тым, каб яны маглі плённа працаваць. Натуральна, неабходна камісія па прыёме ў саюз. Будзе створаны прэзідыум, праўленне. І яшчэ: на стадыі распрацоўкі дакументаў мы ўлічваем магчымыя варыянты для таго, каб у склад саюза маглі ўваходзіць пісьменнікі іншых краін, калі яны падзяляюць наш статут. Асноўныя ж патрабаванні да сябраў саюза — спрыяць умацаванню адносінаў паміж дзвюма краінамі і народамі, развіццю славянскай літаратуры.

Рыта СТАХ

За падзеяй

Гімн «Alma-mater»

Колькі гадоў таму прафесар кафедры псіхалогіі і педагогікі Акадэміі МУС Васіль Голубеў са старшым выкладчыкам гэтай жа кафедры Паўлам Гарбаруком праявілі ініцыятыву: правесці конкурс "Гімн Альма-матэр" — на лепшы твор, прысвечаны навучальнай установе. Правядзенне такога конкурсу ў акадэміі становіцца традыцыяй.

Вось і сёлета пад канец кастрычніка ў Акадэміі МУС прайшоў чарговы конкурс. Калі раней у ім удзельнічалі навучэнцы і курсанты толькі ваенізаваных навучальных устаноў, то сёлета "Гімн Альма-матэр" набыў больш шырокае распаўсюджанне, у ім змаглі прыняць удзел студэнты дзевяці вышэйшых навучальных устаноў сталіцы.

У прывітальным слове начальнік акадэміі Іван Сяргей выказаў спадзяванне, што калі-небудзь з конкурснай сцэны прагучыць такі твор, які стане гімнам якой-небудзь вышэйшай навучальнай установы ці прафесіі.

Прадстаўнічаму прафесійнаму журы ў складзе паэтаў Валянціны Паліканінай і Канстанціна Цыбульскага, Інгі Ліпай (намесніка дэкана музычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў), Вадзіма Мартысевіча (дырыжора аркестра Галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінгарвыканкама) і іншых асоб цяжка было вылучыць сярод мноства канкурсантаў самых лепшых. Адбор праводзіўся ў дзвюх намінацыях — "Лепшая песня" і "Лепшы верш".

У намінацыі "Лепшя песня" ўзнагарода знайшла студэнта 5-га курса Беларускага дзяржаўнага універсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Сяргея Башлыкевіча, а першае месца ў намінацыі "Лепшы верш" прысуджана курсантцы чацвёртага курса Камандна-інжынернага інстытута Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Дар'і Лысановіч.

Анатоль КУДЛАСЕВІЧ

Хата без сяброў не хата

Вечарыны

Гэты кастрычнік быў адзначаны цэлым шэрагам мерапрыемстваў, прысвечаных 50-годдзю Анатоля Сыса. Сябар паэта Алесь Квяткоўскі прысвяціў яго юбілею дзве выставы — першая пад назвай "Мая хата без сяброў не хата" прайшла ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча, другая — "На крыле ў пчаліной маткі..." адкрылася ў Гомелі, у Карціннай галерэі імя Гаўрылы Вашчанкі. Такім чынам мастак звярнуўся да жыхароў горада: "Няхай шаноўны глядач пачытае вершы, падумае над карцінамі і, пайшоўшы з выстаўкі, зразумее, што побач з ім, у вёсцы Гарошкаў Рэчыцкага раёна, зараз вядомай на ўвесь свет, жыў і пахаваны цудоўнейшы паэт Беларусі Анатоль Ціханавіч Сыс...".

А ў дзень народзінаў паэта, 26 кастрычніка, у Дзяржаўным музеі гісторыі літаратуры сабраліся яго сябры, знаёмыя, тыя, хто незалежна ад стаўлення да самой супярэчлівай асобы Анатоля Сыса, заўсёды аддаваў даніну яго паэтычнаму таленту. З успамінамі выступілі Віктар Шніп, Сяржук Сыс, скульптар, аўтар помніка паэту Генік Лойка ды іншыя. Падчас прэзентацыі гучаў і голас самога паэта — усе прысутныя змаглі пачуць у запісе яго вельмі своеасаблівае, эмацыянальнае чытанне ўласных вершаў. Дэманстраваліся фотаздымкі паэта, гучалі песні на яго словы. Падчас вечарыны прэзентавалася таксама новая кніга вершаў-прысвячэнняў Анатолю Сысу "Ягамосць".

Саша ДОРСКАЯ

Сутнасць — адвечная

Прэзентацыі

У малой зале гарадскога Палаца культуры горада Барысава зноў панавалі паэзія і музыка. Члены мясцовага літаб'яднання "Натхненне" прэзентавалі свой калектыўны зборнік "Званы памяці", які пабачыў свет напярэдадні 65-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Кіраўнік літаратарскай суполкі Валянціна Леві адкрыла вечар прывітальным словам, адзначыўшы, што наступны 2010 год, будзе праходзіць пад знакам 65-годдзя Вялікай Перамогі. Яна яшчэ раз падзякавала спонсарам, якія падтрымалі выданне кнігі "Званы памяці".

— Выпуск новага зборніка — гэта працяг традыцый таго літаб'яднання, якое было ў Барысаве 50 гадоў таму. Яго былая назва "Бярэзіна" змянілася, а сутнасць засталася, — зазначыла В. Леві.

Вечарына складалася з трох частак — "ваенныя" вершы і песні, лірыка ды гумар. Свае вершы на тэму вайны, мужнасці, подзвігу франтавікоў чыталі Людміла Малчанская, Алена Дзегцярова, Раман Рубінчык, Лёля Багдановіч, Раіса Гузеева, Аляксандр Ляўша, Уладзімір Дзяміда... Байкі і гумарыстычныя творы гледачы пачулі ў выкананні Людмілы Валасевіч і Міхаіла Градовіча.

У сцэнарый вечарыны былі гарманічна ўплецены музычныя нумары, у якіх прынялі ўдзел салісты народнага хору ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і працы (канцэртмайстар Любоў Усціновіч) — Аляксандра Арцюховіч, Іван Кірнас, Нэла Дзядова, а таксама маладыя салісты эстраднай студыі і ўзорны харэаграфічны ансамбль "Натхненне" Палаца культуры.

Аляксандр МАЦВЕЕЎ

На здымку: свае вершы чытае Алена Дзегцярова.

Канферэнцыі

Павага нашчадкаў

"Другія Тышкевіцкія чытанні" — пад такой назвай праходзіла ў Лагойскім гісторыка-краязнаўчым музеі навуковая канферэнцыя, прысвечаная Канстанціну і Яўстафію Тышкевічам, заснавальнікам айчыннай археалогіі, краязнаўства і музеялогіі.

Удзел у канферэнцыі прынялі вядомыя навукоўцы з Інстытута гісторыі НАН Беларусі, выкладчыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, краязнаўцы і музейныя супрацоўнікі з Лагойска і Вілейкі. Пры падрыхтоўцы сваіх выступленняў яны звярнуліся да розных аспектаў багатай спадчыны братоў Тышкевічаў, якія пры жыцці атрымалі прызнанне ў навуковых колах Расіі і іншых краін свету.

Тэматычны дыяпазон паведамленняў на канферэнцыі вызначаўся разнастайнасцю. Асаблівую цікавасць выклікалі кароткія даклады "Вяртанне навуковай спадчыны братоў Тышкевічаў у беларускую археалогію", "Гравюры ў мастацкай калекцыі К. і Я. Тышкевічаў", "Экспедыцыйнае даследаванне Лагойшчыны ў 1923 г".

Віктар НЕСЦЯРОВІЧ

З верай

Крыніцы — шэсць стагоддзяў

Кажуць людзі, што пры канцы XIV стагоддзя ў Вішневе з'яўлялася Маці Божая. Маліўся адзін вясковец непадалёк ад вішнёвага дрэва і раптам заўважыў: адтуль глядзіць на яго Панна Марыя. Яна сказала, што на гэтым месцы павінен быць пабудаваны дом Божы. А неўзабаве тут з'явілася крыніца.

У 1424 годзе ў Вішневе, што на Міншчыне, быў пабудаваны драўляны храм. Пасля пажару, які знішчыў святыню, на яе месцы з часам паўстаў новы касцёл... У гады ваяўнічага атэізму гаючую крынічку засыпалі. Цяпер жа яна ачышчаная, адроджаная і зноў нясе людзям сваю жыватворную сілу, сімвалізуючы непераможнасць шчырай веры і духоўнай чысціні.

Менавіта ў гэтай святой мясціне сёлета ў першую суботу кастрычніка адбылося асвячэнне крыніцы, што непадалёк ад старажытнага вішнеўскага касцёла Адведзінаў Найсвяцейшай Панны Марыі. Ва ўрачыстасці, якая сабрала шматлікіх вернікаў, удзельнічалі Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч, святары архідыяцэзіі, прадстаўнікі Праваслаўнай Царквы, мясцовых улад. У працяг цырымоніі імі былі пасаджаны вішнёвыя дрэвы — як напамін пра гісторыю з'яўлення цудадзейнай крыніцы. Пройдзе нейкі час, і побач з гэтым вытокам святой вады пабудуюць купель.

Лана ІВАНОВА

Святыні

Храм народнай Перамогі

Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адчыніў свае дзверы для наведвальнікаў 22 кастрычніка 1944 года, праз тры месяцы пасля вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Экспанаты для яго пачалі збіраць яшчэ ў час акупацыі Беларусі.

З нагоды 65-годдзя Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адбылася прэс-канферэнцыя.



Сёння фонды музея налічваюць больш як 140 тысяч экспанатаў — сведчанняў трагедыі і гераічнай барацьбы беларускага народа супраць акупантаў. Унікальным калекцыям музея — партызанскім рукапісным часопісам і самаробнай партызанскай зброі — Пастанаўленнем Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 19 жніўня 2009 года прысвоены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці першай катэгорыі. Штогод музей наведваюць больш як 150 тысяч вучняў, турыстаў і дэлегацый з іншых краін.

Дырэктар музея Сяргей Азаронак падкрэсліў: "Для беларусаў гэта не проста музей, гэта адлюстраванне яго складанага лёсу, трагічнай старонкі біяграфіі краіны".

"Для нас, ветэранаў, якія прайшлі вайну, няма больш адказнай задачы, чым данесці да маладога пакалення подзвіг тых, каго сёння з намі ўжо няма. Музей вайны — гэта храм беларусаў. Храм, дзе захоўваецца гісторыя жудасных ваенных падзей", — перакананы ветэран вайны, намеснік старшыні Беларускага рэспубліканскага савета ветэранаў Міхаіл Жукоўскі.

На прэс-канферэнцыі размова ішла таксама пра перспектывы развіцця музейнай установы. Музей плануе змяніць месца "прапіскі", пераехаць у новы будынак. Журналісты мелі магчымасць убачыць яго мультымедыйную прэзентацыю. Гэта сапраўды ўражвае.

— Без перабольшвання можна сказаць, што рыхтуецца музей будучыні, — адзначыў прафесар архітэктуры, галоўны архітэктар будынка Віктар Крамарэнка. (Нагадаем, ён з'яўляецца аўтарам будынка Нацыянальнай бібліятэкі і Мінскага чыгуначнага вакзала). Сёння ідзе вельмі напружаная праца па праектаванні будынка музея, які размесціцца на праспекце Пераможцаў, каля абеліска "Мінск — горад-герой". Плануецца, што ўжо 9 мая 2010 года першы камень у падмурак новага музея закладзе Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка. Два гады адведзена на пабудову і год — на афармленне экспазіцыйных залаў.

65-годдзю адкрыцця музея была прысвечаная і Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, якая адбылася ў Доме літаратара. На ёй з прывітальным словам выступілі міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец, дырэктар мемарыяльнага комплексу "Брэсцкая крэпасць-герой" Валерый Губарэнка ды іншыя. На мерапрыемстве прысутнічалі таксама кіраўнікі замежных місій, дырэктары многіх беларускіх музеяў і ўстаноў культуры, ветэраны а таксама прадстаўнікі замежных музеяў Вялікай Айчыннай вайны. Міністр культуры Павел Латушка ў сваім уступным слове адзначыў: "Музей Вялікай Айчыннай вайны падтрымлівае дастаткова шырокія міжнародныя сувязі, вельмі прыемна, што развіваецца супрацоўніцтва з Расіяй, Украінай, Германіяй, ЗША, Францыяй, Славакіяй ды іншымі краінамі".

Уладзімір ПАДАЛЯК,
Аляксандра ХАЛОПІК

На здымку: намеснік дырэктара музея Вячаслаў Казачонак прэзентуе прысутным новы альбом "Захоўваем і памятаем" — пра гісторыю ўстановы.

З-пад пяра

Як паведамлялася ў "ЛіМе", па ініцыятыве Пасольства Італіі ў нашай краіне з 1 кастрычніка па 14 лістапада ажыццяўляецца культурны праект "Італьянскае Адраджэнне ў Беларусі". Так, у Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылося ўрачыстае адкрыццё выстаўкі "Італьянскія кнігі на беларускіх землях часоў Боны Сфорцы", прымеркаванай да IX Сусветнага тыдня італьянскай мовы. Выставачная экспазіцыя цалкам прысвечана старадрукам, выдадзеным у Італіі ў другой палове XV — XVI ст.

Увазе наведвальнікаў — выданне знакамітага паэта Італіі Дантэ Аліг'еры "Боская камедыя" (Фларэнцыя, 1481). Гэта першае ілюстраванае выданне, здзейсненае італьянскім друкаром Мікола дэ Ларэнца ў родным горадзе паэта, і адно з самых ранніх выданняў з гравюрамі на метале. Іх выканаў фларэнтыйскі гравёр Бачыа Бандзіні паводле малюнкаў вядомага мастака Сандра Батычэлі.

Цэнтрам кніжнай вытворчасці на італьянскіх землях у другой палове XV — XVI ст. была Венецыя. У экспазіцыі — кнігі знакамітага італьянскага друкара Рэнесанса — Альда Мануцыя, заснавальніка выдавецкай фірмы Альдаў, якая праіснавала каля 100 год. А яшчэ — італьянскія старадрукі з творамі антычных філосафаў Арыстоцеля, Плутарха, Цыцэрона...

Ул. інф.

Асіповіцкая раённая бібліятэка, адна са старэйшых публічных бібліятэк краіны, адзначыла сваё 90-годдзе. Павіншаваць калектыў прыйшлі намеснік старшыні райвыканкама Аляксандр Шаўлюга і начальнік аддзела культуры райвыканкама Ірына Раманчук. Звяртаючыся да калектыву, А. Шаўлюга адзначыў вялікі ўклад цэнтральнай бібліятэкі ў развіццё культурнага патэнцыялу раёна і энтузіязм яе супрацоўнікаў.

Высокая ацэнка дзейнасці прагучала ў віншаваннях супрацоўнікаў Нацыянальнай і Магілёўскай абласной бібліятэк. Адзначалася, што Асіповіцкая бібліятэка займае лідэрскія пазіцыі не толькі ў вобласці, але і ў краіне. На належным узроўні вядзецца краязнаўчая работа, пра што сведчаць неаднаразовыя перамогі ў рэспубліканскіх і абласных конкурсах "Бібліятэка — асяродак культуры" і "Край мой Магілёўшчына".

Александрына ПАРШЫНА

У бібліятэцы № 5 горада Мінска прайшоў аўтарскі вечар Таццяны Лейкі — з нагоды выхаду ў свет яе зборніка паэзіі "Ветра евразийские"(рэдактар Мікола Шабовіч). Павіншаваць гераіню імпрэзы прыйшлі шматлікія прыхільнікі яе творчасці і калегі па пяры. Вядучым быў паэт, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Міхась Башлакоў. З прывітальным словам выступіла загадчыца бібліятэкі Алена Калейнік. Сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, старшыня Мінскага гарадскога аддзялення СПБ Міхась Пазнякоў уручыў паэтэсе Ганаровую грамату за шматгадовую плённую працу на ніве літаратуры, а таксама з нагоды нядаўняга юбілею паэтэсы. Хораша прыняла публіка выступленні пісьменніка Міколы Шабовіча, крытыкаў Георгія Кісялёва, Таццяны Андрэйчанкі. Кампазітар Дзмітрый Пятровіч выканаў некалькі песень, напісаных ім на словы гераіні імпрэзы. А потым і сама Таццяна Аляксандраўна парадавала ўсіх гасцей свята сваёй паэзіяй. Было шмат жадаючых купіць кнігу таленавітай паэтэсы. Дарэчы, пасля імпрэзы ніводнага зборніка не засталося — усе экземпляры набылі прыхільнікі яе творчасці.

Дзмітрый РЫМША

«Добры дзень! Перапіс насельніцтва»

Гэтыя словы ў якасці перапісчыка я гаварыў сотні разоў

Актуальна

Апошнім часам на вуліцах і ў грамадскім транспарце можна было ўбачыць дзяўчат і юнакоў з зялёнымі чамаданчыкамі. Гэта мы, перапісчыкі. Звычайныя студэнты ВНУ, якія часова "перакваліфікаваліся" і сталі галоўнай сілай у перапісе насельніцтва Беларусі 2009 года.

У Мінску для гэтай нялёгкай справы задзейнічана было каля 80 працэнтаў студэнтаў. Па выніках жараб'ёўкі мне выпаў дзевяціпавярховы трохпад'ездны дом па праспекце Пушкіна.

Цікава, што ў нашых людзях ужываюцца такія якасці, як перасцярога і адкрытасць. Вось, напрыклад, адзін дзядуля выйшаў да мяне ў калідор з мініяцюрным ножыкам у руцэ — раён, маўляў, неспакойны, калі што, дык...

Нехта наогул дзверы пабаяўся адчыняць: "Я вас не ведаю і адчыняць не збіраюся, а пасведчанне і падрабіць можна. Лепей сама на ўчастку перапішуся". Ці наадварот: "Вой, заходзь, сыночак, ты ж перапісчык? Не, пасведчанне не трэба, я табе веру. У цябе вочы добрыя. Можа, каву ці чай будзеш?" У асноўным такімі даверлівымі былі старэнькія бабулькі, якія жывуць адны. Я заўсёды папярэджваў іх: "Давярайце, але правярайце".

...Пры ўсіх намаганнях перапісаць больш як 50 чалавек у дзень (гэта прыкладна 17 кватэр) нават фізічна няпроста.

Спачатку патрэбна было запоўніць ліст на кватэру (прыкладна 12 — 15 пытанняў). Потым на кожнага жыхара паасобку: у такім лісце ўжо каля 30 пытанняў. Калі ў гаспадара кватэры нехта гасцяваў, на яго таксама патрэбна было запаўняць перапісны бланк. На замежных жыхароў — іншы ліст. Калі ў чалавека ў прыватнай уласнасці была яшчэ адна кватэра ці нейкае іншае жылое памяшканне, запаўняўся дадатковы бланк. Жыхарам, якія перапісваліся не па месцы прапіскі, выдавалася даведка. Звесткі заносіліся ў журнал, а на перапісным участку падлічвалі колькасць кватэр, дзе адчынілі дзверы, дзе — не, а таксама колькасць мужчын і жанчын і г. д. Дзякуй тым, хто прапанаваў зайсці і прысесці, бо, стоячы на калідоры, працаваць было вельмі нязручна.

Большасць жыхароў размаўлялі са мной на рускай мове, але ў графе "Якая ваша родная мова?" каля 80 працэнтаў пазначалі беларускую. А на пытанне "На якой мове вы звычайна размаўляеце дома?" — адказвалі: "Руская". Што тычыцца нацыянальнасці, то без перабольшання можна сказаць, што дзесьці каля 95 працэнтаў на маім участку назвалі сябе беларусамі.

Карыстаючыся магчымасцю, заўсёды прапаноўваў запоўніць бланк па-беларуску. Шмат хто пагаджаўся. Але беларускамоўных перапісных лістоў нам выдалі ўсяго па восем экземпляраў. Вось, напрыклад, як выказаўся наконт беларускай мовы былы выкладчык фізічнага факультэта БДУ, пенсіянер Георгій Пятровіч:

— Я вельмі люблю беларускую мову. Яна надзвычай меладычная. У асяроддзі сяброў, дома я ўсё больш і больш стараюся размаўляць па-беларуску. Ва універсітэце вёў заняткі на беларускай мове. Не магу сказаць, што я заўсёды размаўляю па-беларуску. Гэта залежыць ад абставін. Калі бачу, што чалавек паважае мову, а галоўнае ведае, заўсёды яго падтрымаю.

Чакаецца, што інфармацыя па выніках перапісу будзе апублікавана ўжо ў лютым 2010 года.

Уладзімір СТАЛОВІЧ,
перапісчык Фрунзенскага раёна

Фота аўтара

Праекты

Магілёў: эксперыменты

Тыдзень таму Магілёўскі абласны драматычны тэатр прадставіў публіцы новы спектакль: баладу "...І Вера".

У аснове эксперыментальнай пастаноўкі рэжысёра Віктара Куржалава, прысвечанай сёлетняй знамянальнай даце з часу вызвалення Беларусі ад фашысцкага ярма і 65-годдзю Перамогі, — аповесць класіка айчыннай літаратуры Васіля Быкава "Кар'ер". Для тэатра праца адказная, бо сам літаратурны матэрыял вымагае асаблівай шчырасці ў размове з гледачом пра маральны выбар чалавека, пра захаванне чысціні душы, пра суд памяці. Рэжысёр В. Куржалаў, першапраходца ў сцэнічным увасабленні гэтага быкаўскага твора, падкрэслівае, што стваральнікі пастаноўкі імкнуліся, захаваўшы сутнасць і дух аповесці Быкава, нагадаць: не толькі на вайне, але і ў мірны час агульначалавечыя каштоўнасці вышэй за ўсё, і дзякуючы ім працягваецца жыццё на планеце, а ў нас трывае вера ў Чалавека.

Сёлета на магілёўскай сцэне рыхтуюцца яшчэ тры прэм'еры: спектакль паводле п'есы расійскага аўтара Максіма Курачкіна «Знішчальнік класа «Медэя» ў рэжысуры Уладзіміра Пятровіча, "Мой унук Веніямін» расійскай пісьменніцы Людмілы Уліцкай у пастаноўцы маладога акцёра Александра Палкіна ды "Калядныя прыгоды восліка" — "Дарога на Віфліем» Сяргея Кавалёва (прэм'ера прысвячаецца юбілею нашага вядомага драматурга). А сустрэўшы Новы год, калектыў тэатра зоймецца рускай класікай: запланаваны спектакль паводле п'есы Аляксандра Сухаво-Кабыліна «Смерць Тарэлкіна» ў пастаноўцы рэжысёра з Літвы Саўлюса Варнаса і "Навальніца" Аляксандра Астроўскага, працаваць над якой запрошаны расійскі рэжысёр Барыс Гурэвіч.

Лана ІВАНОВА

На здымку: ля ўвахода ў Магілёўскі абласны драматычны тэатр.

Фота Віктара Кавалёва

На прэмію Саюзнай дзяржавы

Беларуска-расійскі аўтарскі калектыў — стваральнікі помніка Янку Купалу ў Маскве скульптары Леў і Сяргей Гумілеўскія, архітэктар Юрый Грыгор'еў — сярод намінантаў на прэмію Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва за 2009 — 2010 гады.

Пясняр Беларусі — у цэнтры Масквы

Натхненне ў чатыры рукі

"З вокнаў рэдакцыі "ЛіМа" відаць былую дваровую качагарку, шмат гадоў таму пераўтвораную ў скульптурныя майстэрні. Тут, у блізкім суседстве з намі, вядзецца праца над помнікам Янку Купалу, прызначаным для размяшчэння ў цэнтры Масквы. Аўтары праекта — Леў ды Сяргей Гумілеўскія..." — пачынаю чытаць і адсоўваю ўбок старую — аж за 14 мая 2004 года! — газету. Бо ўспаміны прыходзяць ужо самі, без падказкі.

Той вясною бацька ды сын Гумілеўскія ці не суткамі шчыравалі ў майстэрні. Планавалася, што адкрыццё новага помніка ў расійскай сталіцы ўрачыста пройдзе на пачатку верасня. То бок пры канцы жніўня ён мусіў ужо туды прыбыць. Час прыспешваў, скульптары хваляваліся: увасобіць твор у воску, "перавесці" ў бронзу, папрацаваць над зварнымі швамі... Усё трэба было рабіць хутка і на высокім узроўні вытворчай культуры, з ювелірнай акуратнасцю і трапнасцю, каб задуманае — прагучала...

Для шаноўнага майстра, народнага мастака Беларусі Льва Гумілеўскага гэта быў новы погляд на Купалу. (Згадайма, што ў 1974-м яго манументальная праца ў сааўтарстве з Анатолем Анікейчыкам Андрэем Заспіцкім — вядомая скульптура песняра ў купалаўскім парку нашай сталіцы — была ганараваная Дзяржаўнай прэміяй БССР).

Для маладзейшага Сяргея Гумілеўскага, праз творчасць якога з першых юнацкіх работ лейтматывам праходзяць постаць Максіма Багдановіча і вобразы яго паэзіі, гэта быў сур'ёзны дэбют у Купаляне.

Іх натхнёная праца ў чатыры рукі (аднаму майстру ўвасобіць вобраз у манументальнай выяве, агараўшы складаны мастацка-вытворчы працэс ад пластылінавай мініяцюры да адліўкі ў бронзе, практычна немажліва) пачалася з удзелу ў конкурсе на лепшы праект помніка Янку Купалу для Масквы.

Мала хто ведае, што сама ідэя стварэння такога помніка была, па сутнасці, народнай ініцыятывай, бо належала тамтэйшай беларускай дыяспары. Да таго ж, маскоўскія беларусы памкнуліся паставіць яго за ўласныя сродкі. Але збор грошай ішоў цяжка. І тады ідэя выйшла на высокі афіцыйны ўзровень. Вынікам беларуска-расійскіх перамоў і ўзгадненняў стаўся абвешчаны ў 2002-м годзе Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь конкурс на лепшае скульптурнае ўвасабленне гэтага сур'ёзнага, па сутнасці міжнароднага, праекта.

Бацька і сын Гумілеўскія, у якіх яшчэ да конкурсу быў грунтоўны наробак па купалаўскай тэме і таму працавалася даволі хутка, выйшлі з конкурсу пераможцамі. Але толькі пасля паказу і абмеркавання іх работы ў розных інстанцыях, у тым ліку ў Маскве, былі прапанаваныя варыянты "прывязкі" манумента да ландшафту расійскай сталіцы. Месца на Мівускай плошчы нашы мастакі адразу адхілілі: ускраіна горада. А вось сквер памерам 140х70 метраў на Кутузаўскім праспекце прывабіў: цэнтр, людное месца, прасторная тэрыторыя, магістраль, якую можна лічыць дарогай на Беларусь...

Той вясною, пабачыўшы макет новага твора на фотаздымках, што па нашай просьбе прынёс у рэдакцыю Сяргей Гумілеўскі, паслухаўшы яго каментар і дадаўшы крыху ўласнай фантазіі, я ўжо ўяўляла помнік на штучным насыпным кургане; і камень-валун, атрыманы праз адмысловую апрацоўку гранітнага маналіта, што надае ўстойлівасць бронзавай фігуры і дапаўняе мастацкі вобраз; і адліты ў метале крылаты радок: "Мне сняцца сны аб Беларусі"; і ўмоўную сцяжыну праз курган — да паэта, пазначаную каменнымі плітамі...

Мала хто ведае, што сама ідэя стварэння такога помніка была, па сутнасці, народнай ініцыятывай, бо належала тамтэйшай беларускай дыяспары. Да таго ж, маскоўскія беларусы памкнуліся паставіць яго за ўласныя сродкі. Але збор грошай ішоў цяжка. І тады ідэя выйшла на высокі афіцыйны ўзровень. Вынікам беларуска-расійскіх перамоў і ўзгадненняў стаўся абвешчаны ў 2002-м годзе Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь конкурс на лепшае скульптурнае ўвасабленне гэтага сур'ёзнага, па сутнасці міжнароднага, праекта.

Зразумела, выбар асяроддзя вымагаў карэкціроўкі пачатковага праекта, якую яго аўтары праводзілі ўжо ў кантакце з архітэктарам, добрым знаўцам гэтага асяроддзя, Юрыем Грыгор'евым. Збіраліся — і неаднойчы, як з беларускага боку, так і з расійскага — пасяджэнні мастацкай рады. Колькі заўваг, даволі рознагалосных, не заўсёды кампетэнтных і абгрунтаваных, колькі кампрамісных рашэнняў з'яўлялася з часу прэзентацыі эскіза да канчатковага, рэалізаванага варыянта! Мабыць, таму і ўстаноўлены помнік быў толькі ў 2005 годзе. Ды, пры ўсіх адрозненнях задумы ад яе ўвасаблення (давялося адмовіцца і ад валуна, і ад паэтычнай цытаты), аўтарскі калектыў здолеў захаваць свае мастацкія прынцыпы.

Пачэсна. Адказна...

І пра своеадметны, планетарны ды глыбінна беларускі мастацкі свет кожнага з іх, і пра супольную творчую працу Гумілеўскіх можна распавядаць і разважаць гадзінамі. Прыгадваць, што разам бацька і сын стварылі манумент Кірылу Тураўскаму, устаноўлены на цэнтральнай плошчы Гомеля; трыпціх "Сказ пра Нясвіж", які аздобіў інтэр'ер Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі; помнік Максіму Багдановічу, што ў Ялце, на старых могілках, пазначае апошні прытулак паэта; скульптурную постаць Францішка Багушэвіча — доўгачаканы набытак старажытнай Смаргоні, урачыста прэзентаваны шматлікім гасцям сёлетняга свята беларускага пісьменства...

— *Кожная мастацкая праца — гэта як старонка жыцця. І колькі б гадоў не прайшло з часу адкрыцця помніка, ён нейкім таямнічым чынам вабіць аўтара да сябе; думаеш пра тое, каб зноў апынуцца там, паглядзець на завершаную работу ды ўспомніць, як усё адбывалася, — прызнаецца Сяргей Гумілеўскі. — Янка Купала для мяне тэма невыпадковая. Яшчэ ў студэнцкія гады зрабіў па ёй некалькі напрацовак: захапляўся раннім Купалам, паэмамі "Бандароўна", "Магіла льва", "Яна і я", "Курган". А стварыць помнік такому дзеячу — пра гэта можна толькі марыць! Гэта шчасце. Але і вялікі абавязак. Калі гэтым летам я прыязджаў па справах у Маскву і надарыўся вольны час, я схадзіў туды, дзе стаіць наш Купала. І застаўся задаволены працай, тым, як ён жыве ў гэтым асяроддзі. Ведаю, што гэта не пустое месца ў Маскве, там бываюць людзі, яны збіраюцца, адзначаючы важныя для Беларусі падзеі, прыходзяць проста — без нагоды; за помнікам глядзяць, прыносяць Купалу кветкі...*

Леў Мікалаевіч, у адрозненне ад сына, не бачыў сваю работу з таго кранальнага моманту, калі бронзавая Купалава постаць па-мастацку пераканаўча і вобразна пазначыла прысутнасць беларускага духу ў цэнтры расійскай сталіцы. А не так даўно ён зноў увасобіў купалаўскі вобраз маскоўскага перыяду: нібы перакуленая бронзавая скульптурная выява пад назваю "Я адплаціў народу..." перадае самую трагічную, апошнюю кульмінацыю паэтава жыцця — яго смяротны палёт...

— *Янка Купала — гэта цалі́на, той пласт беларускай культуры, якога хопіць на ўсіх творцаў, мысляроў, філосафаў. Гэта наша поле, і мы на ім аратыя. Невычэрпная Купалава тэма не толькі абавязак, але і патрэба для кожнага мастака, бо гэта — роднае, — разважае Леў Гумілеўскі. — Мы хацелі, каб не проста наш помнік стаяў у Маскве, а каб стаяў наш Паэт, павернуты тварам да Беларусі; каб яго паэтычная думка адчувалася ў самім паветры. Як Пушкін для Расіі, як Шаўчэнка для Украіны, як Шандар Пецёфі для Венгрыі, як Хрыста Боцеў для Балгарыі — так для нас Янка Купала: цэнтральны вобраз і для Беларусі, і для нашага мастацтва.*

Дзвюх сталіц архітэктар

Муза скульптуры, вядома ж, не можа вольна і самастойна лунаць у гарадскім асяроддзі: яе абавязкова суправаджае "строгая апякунка" — архітэктура. На пэўным этапе працы над манументам беларускаму класіку да творчага дуэта Гумілеўскіх далучыўся трэці, але зусім не лішні голас Юрыя Грыгор'ева, чый аўтарытэт, прынамсі, паспрыяў удаламу, па-мастацку абгрунтаванаму выбару месца для ўсталявання помніка.

Гэтага вядомага і ўплывовага чалавека называюць архітэктарам дзвюх сталіц, і вось чаму. Юрый Грыгор'еў, ураджэнец Расіі, выпускнік Маскоўскага архітэктурнага інстытута, працаваў у праектных арганізацыях нашай рэспублікі і яе сталіцы, а ў сярэдзіне 1970-х стаў намеснікам старшыні Дзяржбуда БССР і адначасова галоўным архітэктарам Мінска. Такім чынам, на працягу больш як дзесяці гадоў ён фактычна кіраваў у Беларусі працэсамі горадабудаўніцтва. Распрацоўваў генеральныя планы шэрага прамысловых і грамадскіх аб'ектаў, праектаваў жылыя мікрараёны, стаў адным са стваральнікаў Дома літаратара, стэлы

"Мы хацелі, каб не проста наш помнік стаяў у Маскве, а каб стаяў наш Паэт, павернуты тварам да Беларусі; каб яго паэтычная думка адчувалася ў самім паветры. Як Пушкін для Расіі, як Шаўчэнка для Украіны, як Шандар Пецёфі для Венгрыі, як Хрыста Боцеў для Балгарыі — так для нас Янка Купала: цэнтральны вобраз і для Беларусі, і для нашага мастацтва", — кажа Леў Гумілеўскі.

"Мінск — горад-герой", Мінскага крытага катка, першай лініі метрапалітэна... Ужо больш як два дзесяцігоддзі Юрый Грыгор'еў, народны архітэктар Расіі, заслужаны — Беларусі, ганаровы грамадзянін горада Мінска, з'яўляецца першым намеснікам галоўнага архітэктара Масквы. Але раз-пораз вяртаецца ў краіну маладосці, дзе жывуць яго дзеці ды ўнукі, дзе пахаваныя бацькі. Для Мінска ён у сааўтарстве з расійскімі скульптарамі Юрыем ды Рыгорам Арэхавымі стварыў помнік Аляксандру Пушкіну. І сёлета непадалёк ад помніка вялікаму паэту (яго аўтарскі калектыў таксама вылучаны на атрыманне прэміі Саюзнай дзяржавы) паўстаў Дом Масквы, галоўным фасадам падобны да мэрыі расійскай сталіцы: ідэйным натхняльнікам гэтага праекта называюць Юрыя Грыгор'ева...

Успамінаючы супрацоўніцтва з ім, Гумілеўскія, не згаворваючыся, дзякуюць Юрыю Панцеляймонавічу за вялікую падтрымку: Масква даволі насычаны архітэктурай горад, выбраць гожае месца для такога помніка ў яго цэнтры вельмі складана, няпроста было і абараніць ужо вызначаную пляцоўку ад іншых прэтэндэнтаў, якія хацелі прыдбаць лапік тэрыторыі ў прэстыжным раёне для пабудовы там забаўляльнага цэнтра.

Купалава прысутнасць

"Як вядома, у Беларусі ёсць нямала помнікаў геніям расійскай літаратуры. У Маскве ж манументаў вялікім беларускім пісьменнікам пакуль няма. Разам з тым творчасць цэлага шэрага беларускіх пісьменнікаў, у тым ліку Янкі Купалы, у свой час зрабілася набыткам не толькі нацыянальнай, але і савецкай культуры ў цэлым. Немалаважны і той факт, што апошнія месяцы свайго жыцця Янка Купала правёў у Маскве", — на многіх інтэрнет-сайтах пяць гадоў таму можна было прачытаць такія словы, яны суправаджалі афіцыйныя паведамленні пра заключны этап працы над вялікім творчым праектам.

І вось Купала — у Маскве. Стаіць на кургане, як яго легендарны Гусляр, абапіраецца на вясковую агароджу. Бронзавая фігура паўстала ў атачэнні родных для беларускага паэтычнага свету знакаў: кнігі, мудрагеліста злучанай з лістом папараці — расліны, сакральнай для беларусаў, сімвалічнай для Купалля і для Купалы; уяўнай папараць-кветкі яго паэзіі; празрыстай крынічкі (у цёплы час года бяжыць з-пад зямлі жывая вада). Імя паэта ў выглядзе факсімільнага подпісу размясцілася на пастаменце.

Я ведаю, што, працуючы над вобразам народнага паэта, скульптары імкнуліся пераадолець пэўныя і ўжо досыць устойлівыя стэрэатыпы айчыннай Купаляны. Ім было цікава ўявіць і паказаць яшчэ маладога класіка ў той перыяд яго жыцця, што быў асабліва плённы для творчасці. Бронзавая постаць аптымальна выбранага памеру (вышыня 4 м 20 см) арганічна ўпісваецца ў асяроддзе. І таму асабліва ўражвае псіхалагічна вытанчанае аблічча Купалы: выразная пластыка рук, адухоўлены і самапаглыблены, нейкі стрыманы пагляд ("стрыманасць — гэта калі ёсць што стрымліваць", — заўважыў адзін мудры чалавек)... Знакавая і значная дэталь: паварот паставы спараджае адчуванне, што Янка Купала насамрэч пазірае ў той бок, дзе Беларусь...

А тым часам у сэрцы Беларусі, у цэнтры яе сталіцы, з'явілася паменшаная копія маскоўскага манумента. Дакладней — невялікі бронзавы макет, вышынёю каля 70 см, зроблены Львом і Сяргеем Гумілеўскімі адмыслова для Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы ў 2007 годзе. Новая скульптура пакуль "прыхаваная" ў фондах. Але музейныя супрацоўнікі плануюць праз год, калі Купалаў дом будзе адзначаць сваё 65-годдзе, наладзіць юбілейную выстаўку і там упершыню паказаць шырокай публіцы мініяцюрны варыянт помніка, створанага таленавітымі майстрамі, кожная работа якіх — унікальная, сур'ёзная і вартая захаплення.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

На здымку: помнік народнаму паэту Беларусі Янку Купалу ў Маскве.

Часопісы-2010: «Маладосць»

Час вялікіх раманаў мінаецца

Рэдактары літаратурных часопісаў даўно пачалі клапаціцца пра зімні сезон, пераглядаць рэдакцыйныя партфелі і ўвіхацца над творамі, бы слоікамі з вітамінным сочывам, каб расквеціць самую шэрую і халодную пару года новай цікавай літаратурай. Чым парадуе нас часопіс "Маладосць" у першым паўгоддзі 2010 года? Пра гэта распавяла яго галоўны рэдактар Раіса Баравікова.

— Гледзячы па тэкстах, што дасылаюцца ў "Маладосць", якія тэндэнцыі вы можаце адзначыць у сучаснай прозе, якія тэмы абіраюць аўтары?

— У асноўным — гісторыю, сучаснасць і прыгоды. Гэтыя тэмы запатрабаваныя і будуць прадстаўляцца на старонках "Маладосці" на самы размаіты густ. Да прыкладу, у першым паўгоддзі будзем друкаваць гістарычную хроніку Яна Длугаша "Грунвальдская бітва" ў перакладзе Аляксандра Вашчанкі. Гісторыя заўсёды прыцягальная, тым больш, што летам 2010 года спаўняецца 600 гадоў з дня Грунвальдскай бітвы. Напэўна, чытачам "ЛіМа" не трэба тлумачыць, што для беларусаў і іншых народаў азначала гэта перамога. У творы апісаная не толькі сама бітва, але і ўвесь перыяд гісторыі, набліжаны да яе.

Мне здаецца, сёння час вялікіх раманаў мінаецца, таму ў партфелі "Маладосці" больш аповесцяў. Вось у першым нумары наступнага года мы мяркуем апублікаваць аповесць Ягора Конева "Каляднае паданне", будзе друкавацца кінааповесць Анатоля Дзялендзіка, аповесць для падлеткаў Алеся Бадака "Смерць Стэндаля ў цэнтры Мінска", плануюцца таксама аповесці Маргарыты Прохар, Таісы Супрановіч, Людмілы Кебіч, ёсць і мой прыгодніцкі, фантастычны твор "Дзімка з планеты Жоўтага хакера" для падлеткаў. Чакаем новых твораў і ад старэйшага пакалення нашых пісьменнікаў, якія можна аднесці да шэрагу класікі. Нам даўно ўжо абяцае сваю новую аповесць Віктар Карамазаў.

На старонках усё-ткі з'явяцца і некалькі раманаў, праўда, невялікіх па памеры — Міколы Адама "Не вер, не бойся, не прасі" і маладой аўтаркі Надзеі Статкевіч "Папялішча".

Бачна, што ў першым паўгоддзі часопіс будзе вельмі насычаны прозай — як мінімум адна аповесць на нумар, а яшчэ і апавяданні. Напрыклад, мяркуем надрукаваць творы Кацярыны Безмацерных, Святланы Саўко, ёсць п'еса Алены Паповай "Блін-даж", пастаўленая ў ЦЮГу да 65-годдзя Перамогі, пабачыць свет проза пісьменніка, які жыве на Віцебшчыне, Генадзя Пацюенкі "Пакуль куля ляціць". Думаю, нашы чытачы з цікавасцю ўспрымуць казкі Адама Глобуса, а таксама легенды і паданні ў пераказе Уладзіміра Ягоўдзіка.

— Ці будуць новыя імёны, адкрыцці?

— Упершыню выступіць у друку з прозай Міхаіл Зізюк з Навагрудка. Цікава, што сам аўтар не філолаг, а прадпрымальнік, і вось раптам так даволі ўдала прыхінуўся да літаратуры.

— Што да паэзіі, перавага будзе аддадзена маладым аўтарам?

— Літаратурная моладзь актыўна друкуецца ў "Маладосці". На наступнае паўгоддзе падрыхтаваныя нізкі вершаў Аксаны Спрынчан, Зміцера Арцюха, Арцёма Кавалеўскага, Святланы Явар, Алы Нікіпорчык, Волі Чайкоўскай, Марыі Паўлоўскай. Але мяркуем, што чытач пабачыць на старонках часопіса і творчасць старэйшых літаратараў — Уладзіміра Мазго, Валянціна Лукшы, Міколы Мятліцкага, Міколы Шабовіча ды іншых.

Саша ДОРСКАЯ

Чалавек — гэта магчымасць, а жыццё — творчасць

Віцебская зямля заўсёды славілася сваімі культурна-мастацкімі традыцыямі, нават стала фестывальнай сталіцай. Яна шчодра ўзбагачала сваімі мастакамі, музыкантамі, пісьменнікамі культуру не толькі Беларусі, але і ўсяго свету. Феномен Віцебска заўсёды прыцягваў розных даследчыкаў. Так было і гэтым разам, калі нядаўна ў абласным цэнтры ладзілася IV Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Свет мастацтва і дзеці: праблемы мастацкай педагогікі". Яна праходзіла ў межах святкавання 100-гадовага юбілею Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П. Машэрава, які ўстанова адукацыі будзе адзначаць у наступным годзе. Ініцыятарам была кандыдат мастацтвазнаўства, загадчык кафедры тэорыі музыкі і музычнага інструмента ВДУ Нэлі Мацабярыдзе, а арганізатарамі выступілі Міністэрства адукацыі Беларусі, ВДУ і педагагічны факультэт гэтай ВНУ.

Праводзілася яна ў гістарычным будынку педагагічнага факультэта. Раней тут было мужчынскае духоўнае вучылішча, потым музычна-мастацкі факультэт.

З уступным словам да прысутных звярнуўся прарэктар універсітэта Вячаслаў Туркоўскі, які зазначыў, што немагчыма перабольшыць ролю музыкі і мастацкага слова, якія люструюць і спалучаюць ідэі дабрыні, гуманізму, адказнасці ды талерантнасці ў цэласным выхаванні асобы... Потым слова брала дэкан педагагічнага факультэта, дацэнт Іна Шарапава, якая расказала пра гісторыю факультэта, які яна ачольвае, і падкрэсліла, што канферэнцыя вельмі актуальная і закранае шмат якія педагагічныя праблемы. Таксама Іна Анатольеўна прадставіла гасцей мерапрыемства: навукоўцаў і прадстаўнікоў творчых саюзаў, вядучых ВНУ нашай краіны, розных рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі, Латвіі, Нідэрландаў ды Кітая.

У сваю чаргу ад імя гасцей канферэнцыі да прысутных са шчырымі словамі ўдзячнасці і павагі звярнулася даўні сябар факультэта кандыдат педагагічных навук, дацэнт Марыйскага дзяржаўнага універсітэта (г. Йошкар-Ала) Раіса Турчанкова.

Перапынкі паміж выступленнямі аздабляліся нумарамі святочнага канцэрта з удзелам узорнага хору "Мара" мясцовай гімназіі № 3 імя А. Пушкіна (кіраўнік — дацэнт ВДУ Б. Кажэўнікаў), мужчынскага народнага хору ВДУ (кіраўнік — дацэнт Т. Захарава), вакальнага ансамбля "Кантылена" студэнтаў-завочнікаў ВДУ (кіраўнік — Б. Кажэўнікаў), узорнага духавога аркестра Віцебскай ваеннай камендатуры (кіраўнік — В. Міцкевіч). Да слова, гэты аркестр тры гады запар перамагае ў рэспубліканскім конкурсе сярод духавых аркестраў.

Пасля ўрачыстага адкрыцця адбылося пленарнае пасяджэнне. Кандыдат педагагічных навук, дацэнт БДПУ імя М. Танка Алена Палякова адзначыла, што ролю мастацкай адукацыі ў духоўным выхаванні нацыі немагчыма пераацаніць. А мэтазгоднасць звароту да праблемы гуманізацыі вызначаецца запатрабаваннямі грамадства ў захаванні і ўмацаванні мастацкай і, у прыватнасці, музычнай адукацыі ва ўмовах мадыфікацыі адукацыйнай практыкі. Маладое пакаленне нашай краіны павінна быць далучаным да мастацтва, бо менавіта яно дапамагае гарманізаваць шматгранныя адносіны асобы са светам. Дырыжор, выкладчык харавых дысцыплін, мастацкі кіраўнік творчага калектыву "La Pellegrina" Дзірк'ян Харрынга з Нідэрландаў падзяліўся сваім вопытам правядзення музычных курсаў за мяжой.

Свет прыроды цудоўны і адметны. Аднак далёка не ўсе здатныя бачыць гэту прыгажосць, шматстайнасць колеру і форм, разнастайнасць адценняў неба, лістоты... Уменне "глядзець" і "бачыць", "слухаць" і "чуць" не развіваецца само па сабе, не даецца ад нараджэння ў гатовым выглядзе, а выхоўваецца.

Кандыдат педагагічных навук МДУ імя А. Куляшова Валянцін Рэва агучыў даклад пра мастацтва ў кантэксце асобаснага досведу чалавека. Традыцыйна, у навуковай літаратуры асобасны аспект мастацтва разглядаецца, як правіла, скрозь прызму яго сацыяльных функцый, параметраў мастацкай культуры, яе прадметнага і вартасна-сэнсавага ўтрымання, псіхалагічных і знакавых форм функцыянавання. Музычнае ж мастацтва прадстаўляе не толькі асобную з'яву жыцця, але адначасова і спосаб яго пазнання, неабходнага для ўзбагачэння інтуітыўна-вобразнага вопыту асобы. А такі вопыт асабліва патрэбны чалавеку XXI стагоддзя, які пастаянна сутыкаецца з сітуацыямі прыняцця неардынарных рашэнняў, які жыве ва ўмовах псіхалагічных стрэсаў, дэфіцыту часу для абдумвання, рацыянальнай аргументацыі сваіх дзеянняў, учынкаў, высноў у самых нечаканых сітуацыях грамадскай і сацыяльнай практыкі.

Прафесар кафедры дашкольнай і пачатковай адукацыі ВДУ Вера Мінаева распавяла пра эколага-эстэтычнае выхаванне дашкольнікаў, бо яно займае ў развіцці асобы асаблівае месца і не абмяжоўваецца якой-небудзь адной сферай дзейнасці, а датычыць усяго, што засвоіў чалавек у матэрыяльнай вытворчасці, у навуковым досведзе, маральных стасунках у грамадстве.

Успрыманне прыгажосці прыроды неад'емна ад яе разумення і пазнання. У сувязі з гэтым у дашкольнікаў фарміруюцца веды пра адзінства і разнастайнасць прыроды, сувязі і ўзаемасувязі паміж рознымі яе аб'ектамі і з'явамі, пастаянныя змены і стасункі між жывымі істотамі, рацыянальнае выкарыстанне багацця прыроды і неабходнасць яе аховы. Паралельна з гэтым ідзе фарміраванне ў дзяцей здольнасці эстэтычна адносіцца да свету, успрымаць і цаніць прыгажосць, задумвацца над узаемаадносінамі людзей і прыроды.

Удзельнікі канферэнцыі — людзі неабыякавыя да нашай агульнай будучыні, якая ўвасоблена ў цудоўным слове "дзеці". Які ён, свет дзяцінства ў сучаснай мастацкай прасторы, якія тэарэтычна-метадалагічныя праблемы існуюць у мастацкай творчасці, як здзяйсняецца выкладанне прадметаў мастацтва ў школе і ВНУ, як суадносіцца дзіцячая мастацкая творчасць з найноўшымі інфармацыйнымі тэхналогіямі? Прыкладна такое кола пытанняў вынеслі для секцыйных абмеркаванняў спецыялісты ў галіне педагогікі, метадалогіі і музыказнаўства.

Дацэнт, хормайстар ВДУ Барыс Кажэўнікаў зрабіў акцэнт на тым, што ва ўсе часы, незалежна ад сацыяльных змен у грамадстве, харавы пеўчы жанр і асабліва акадэмічныя харавыя спевы развівалі культуру народа. Прыкладам таму паўстаюць краіны Еўропы, Балтыі, Грузія, Арменія... А выхаванне спеўнай культуры пачынаецца ў сям'і, затым у школе і ўдасканальваецца ў студэнцкія гады. Сярод найбольш значных абгрунтаванняў неабходнасці і магчымасці ўкаранення дадзенага жанру музычнай культуры ў сферу моладзевага і студэнцкага асяродку з'яўляецца яго даступнасць.

У Беларусі, нягледзячы на эканамічныя цяжкасці, яшчэ захоўваецца ў дзяржаўным маштабе падтрымка харавога выхавання. З былых саюзных рэспублік толькі ў нашай краіне захавалася і працягваецца навучанне ў школах з музычна-харавым ухілам (школы з агульнаэстэтычнай скіраванасцю), дзе існуюць харавыя ступені дзіцячага акадэмічнага харавога выхавання...

На секцыях абмяркоўваліся разнастайныя праблемы мастацкай педагогікі: скарачэнне гадзін на творчыя прадметы ў школе, роля тэатра, кіно, літаратуры, мастацка-дэкаратыўнай творчасці, масавай культуры ў развіцці ды выхаванні дзятвы і шмат якія іншыя.

Таксама для ўдзельнікаў мерапрыемства былі падрыхтаваны выстаўкі творчых дыпломных работ студэнтаў, выпускнікоў і выкладчыкаў педагагічнага факультэта.

А яшчэ гасцей канферэнцыі чакаў прыемны сюрпрыз — у Віцебскай абласной філармоніі быў наладжаны канцэрт арганнай музыкі. На велічным аргане грала Ірына Маштакова, сваім голасам слухачоў зачароўвала салістка філармоніі Аксана Новікава, да іх дадаваліся шчымліва-ўзнёслыя гукі скрыпкі ў віртуозным выкананні Галіны Шнітман. Прагучалі творы Пакельбеля, Карэлі, Гендэля, Манюшкі, Баха, Качыні, Маціеўскага... Да слова, віцебскі арган зроблены спецыяльна для гэтай установы культуры нямецкай арганабудаўнічай фірмай "Гластэр-Гётц" у стылі мадэрн, але па гучанні з'яўляецца ўзорам французскага рамантычнага аргана. Ён не зусім звычайны — яго трубы размешчаныя па дзвюх секцыях замест звыклай адной і сіметрычна месцяцца па баках сцэны.

Што можа быць гарманічней, чым гучанне і спалучэнне класічнага голасу і гукаў аргана. Такое адчуванне, што знаходзішся ў нейкім адухоўленым, святым месцы. Але ж сапраўдная музыка і ёсць духоўнасць і святасць. Яна то ласкавая і далікатная, то аптымістычна-натхняючая і ўзнёслая, часам нават гарэзлівая, як музычная палітра ўсяго чалавечага жыцця з яго радасцямі, сумам і надзеяй.

Віктар КАВАЛЁЎ

На здымках: узорны хор "Мара" гімназіі № 3 імя А. Пушкіна (кіраўнік — дацэнт ВДУ Б. Кажэўнікаў); канцэрт арганнай музыкі ў абласной філармоніі.

Фота аўтара

Хоць непрыкметны, пахаваны быў
Без некралогаў, памінальных песняў,
Ды Бог асвеціць шчасцем твар рабу
І душанька нарэшце ўваскрэсне...

Так у падрыхтаваным да друку зборніку, якому не наканавана было пабачыць свет пры жыцці аўтара, Яўген Прадзядовіч сумна прадвызначыў уласны лёс і нават пэўным чынам выявіў творчае крэда: пісаць толькі для душы. Летась стараннямі блізкіх людзей, колішніх калег, а таксама выдавецтва "Каўчэг" была выдадзена яго адзіная пасмяротная кніга пад той жа назвай, што і запланаваны раней зборнік — "Астральныя сны". Яна ўключыла цалкам змест нявыдадзенага зборніка, а таксама паэзію розных гадоў з асабістага архіва аўтара.

Вандроўнік на Млечным Шляху

На першы погляд, кніга не шмат уносіць новага ў скарбонку айчыннай паэзіі. Акрамя вечных пытанняў непадзеленага кахання, вышэйшай абранасці паэта, тут распрацоўваюцца звыклыя і нават ужо трохі надакучлівыя тэмы: заняпад беларушчыны, экалагічная катастрофа, духоўны Чарнобыль, выраджэнне вёскі — асабліва характэрныя для паэзіі туманных 90-х гадоў. Але гэта толькі на першы погляд. Калі паглыбіцца ў сімволіку кнігі, то стане відавочным, што стандартныя тэмы і матывы Я. Прадзядовіч намагаецца ўзнесці на глабальны касмічны ўзровень, на планку духоўнай глыбіні і універсальнага зместу. Не заўжды гэта ў яго атрымліваецца, але само імкненне надаць простай беларускай — нават вясковай — паэзіі касмічнае гучанне,безумоўна, вартае ўвагі. І справядліва ў прадмове да зборніка калега аўтара па творчай суполцы "Белазоры" Валянціна Беланоўская, абышоўшыся без якіх-небудзь высакамоўных ацэнак яго творчасці, сціпла называе Я. Прадзядовіча "паэтам ад Бога". З гэтым я цалкам пагаджаюся, бо сваю вернасць паэзіі Я. Прадзядовіч пранёс праз усё жыццё, не прэтэндуючы на якія-кольвек лаўры, ды і глыбокія тэмы, якія ён намагаўся раскрыць, кажуць пра развітую творчую інтуіцыю — сапраўды талент ад Бога.

Хацеў вялікім мастаком / Зрабіцца і дабіцца славы <...> / Хацеў людзьмі я кіраваць / Ды выступаць на стадыёне — / Гляджу: нікога не відаць, / Апроч святога на іконе... ("***Сябе я пераацаніў")

Аўтар быў далёкі ад таго, каб быць паэтам-трыбунам, таму пераважная большасць яго вершаў носяць глыбока інтымны характар. І паэзію ён успрымаў, відаць, як сваю асабістую вузкую сцежку — свой Млечны Шлях — на якім яму, на жаль, не давялося сустрэць спадарожнікаў — ні па жыцці, ні ў творчасці. Верш-споведзь, верш-малітва і апраўданне перад Богам — такія ўмоўныя жанры дамінуюць у кнізе Я. Прадзядовіча. Але як бы сціпла ні ацэньваў свае здольнасці паэт і ні адмаўляў сабе ў амбіцыях, разам з тым ён катэгарычна ўпэўнены ў сваёй вышэйшай абранасці, нават экстрасенсорных уласцівасцях:

І што з таго, што адмаўляю стому, / Што памятаю, дзе, калі я жыў, / Што Бог мне дасылае ў падсвядомасць / Дня заўтрашняга цуды-міражы? ("Ну што з таго?")

Тут, на жаль, даводзіцца зрабіць некаторыя заўвагі. Бясспрэчна, у яго лірыцы прысутнічае касмічны пачатак і духоўнае дальнабачанне, але яно не сягае вышэй асабістых перажыванняў, абмяжоўваючыся ўнутраным светам паэта. Калі б ён здолеў накіраваць свой унутраны позірк звыш, паспрабаваць ахінуць універсум, а не толькі ўласную душу, то яго творчасць загучала б нашмат шырэй, стала б блізкай вялікай колькасці людзей. Напэўна, гэтая акалічнасць і адрознівае творчасць вялікіх паэтаў, нацыянальных геніяў. А так мы маем справу з інтымнай паэтычнай споведдзю, і залішняя інтымнасць у дадзеным выпадку ператвараецца ў загану. Але, як бы тое ні было, творчасць Я. Прадзядовіча заслугоўвае ўвагі, бо , на жаль, не так шмат шчыроўцаў на ніве роднай літаратуры імкнуцца зазірнуць у космас і спасцігнуць універсальныя заканамернасці быцця ў сусвеце.

Што гэта? Не жыццё маё? / Касмічны дух — то я, мой дружа. / Мы з небам звязаны задужа / І помнім Боскае... Сваё. ("Мы помнім Боскае")

Паэт кажа пра наяўнасць у свеце вышэйшых сіл, таямнічых прынцыпаў быцця, намякае на іх прысутнасць, але, на жаль, не раскрывае іх. Ён усведамляе сябе носьбітам вышэйшай паэтычнай місіі ("Не прыняты ад Сонца пасол..."), распавядае пра свае звышздольнасці і прасвятленні ("Я птахам вогненным лятаю па Сусвету..."), але толькі кажа пра іх і рэдка перадае іх змест, робіць адкрыцці. Калі б Я. Прадзядовіч здолеў яшчэ крыху ўзняцца над сабой, не проста адчуваючы падсвядома ўздзеянне духоўнага свету, а сузіраючы яго прыроду, то ён здолеў бы выйсці на якасна новы ўзровень і ў творчасці. Ён здолеў бы вырвацца з палону цьмянага XX стагоддзя ў стагоддзе новае, і вершы б яго не гучалі так трывожна і безнадзейна. Ён, як і многія іншыя выбітныя творцы, стаў нявольнікам свайго часу, эпохі нацыянальнага адраджэння і яго згасання. Эпохі, праз якую нам так цяжка перакрочыць.

Адыходзячы ад праблем маральных і метафізічных, хацелася б паразважаць менавіта над паэтыкай твораў Я. Прадзядовіча. Адзін з самых лепшых, на мой погляд, вершаў у зборніку ўздымае тэму непадзеленага кахання — шырока прадстаўленую ў творчасці аўтара і, напэўна, лёсавызначальную для яго асобы.

Замнога год ёй, шэры дождж... / Замнога ёй, яму — замала... / Да ранку вуліцамі кроч — / Ніколечкі лягчэй не стала.

Прамокла ты даўно наскрозь — / Яго ж дзяўчына цалавала. / Замнога год ёй, шэры дождж. / Замнога ёй, яму замала. ("***Замнога год ёй, шэры дождж...")

Гэты твор адрозніваецца надзвычайным эмацыянальным напалам, сціснутасцю ў словах, недаказанасцю, шырокім падтэкстам. У адрозненне ад іншых вершаў інтымнага характару, што сустракаюцца ў кнізе, у ім не гаворыцца пра асабістыя перажыванні аўтара, а змадэлявана ўяўная сітуацыя няшчаснага кахання немаладой ужо жанчыны да маладога хлопца. Ад уяўнасці твор нікольк не прайграе, а вельмі тонка перадае пачуцці самога паэта.

Няхай настрой большасці твораў кнігі "Астральныя сны" роспачны, меланхалічны, але гэта шчыра выпакутаваныя радкі, што дазваляе дараваць аўтару і традыцыйную прастату формаў, і зрэдчас некаторую паэтычную няўклюднасць.

Тэматычны дыяпазон лірыкі Я. Прадзядовіча даволі шырокі. Пачынаецца кніга з нізкі вершаў, прысвечаных пэўным прадметам, месцам, істотам, што, нягледзячы на свой матэрыяльны характар, становяцца часткай унутранага свету аўтара: "Камень", "Дом", "Возера", "Дах", "Падлога", "Птушка" — што нагадвае пра адпаведную "рэчыўную" лінію ў творчасці Алеся Разанава. З гэтымі творамі перагукаецца нізка анімалістычных вершаў, змешчаная ў канцы зборніка: "Карова", "Зайка", "Змяя", "Шчупак", "Кабан". Тут аўтар вельмі таленавіта, па-філасофску звяртаецца да вобразаў жывёл, праецыруе іх на чалавечае грамадства, судакранае з глабальнымі — экалагічнымі і іншымі — праблемамі: "Мой зайка беленькі, малы сынок. / Твой лёс — у лесе жыць, / а жыць там страшна..."

У мастацкіх вобразах лірыкі Я. Прадзядовіча пераважае містычная і апакаліптычная сімволіка: тут згадваюцца анёлы, серафімы, дэманы, Зніч-Палын, Вельзевул, Воланд і г. д. Вельмі цікавы аўтарскі сімвал чорнага Задыяка — як сінонім злога року, кармы. Кажучы пра сябе: "Я — птушка белая з аспіднай меткай," — паэт скіроўвае свой зрок на цёмны бок чалавечай душы, як у вершах "Антысвет", "Змова". Услед за Аляксандрам Блокам узнікае ў яго паэзіі вобраз чорнага чалавека — прывіда, што паўсюль суправаджае паэта. Узнікае тут і больш светлы містычны вобраз двайніка ("О дасканаласці маёй двайнік!"), alter ego, вядомы з міфалогіі і эзатэрычнай літаратуры — дух-спадарожнік, які і прымушае паэта тварыць. Каб падагульніць разважанні наконт сімволікі творчасці Я. Прадзядовіча, скажу толькі, што пры чытанні яго вершаў узгадваюцца палотны нашага суайчынніка Аляксандра Ісачова, дзе ў апакаліптычным мроіве спалучаюцца самыя разнастайныя міфалагічныя персанажы, рэлігійныя і культурныя сімвалы.

Як ужо было заўважана, лірыка Я. Прадзядовіча традыцыйная па форме, і па змесце яна блізкая да прыроды і сельскага жыцця. Нават складанне вершаў паэт параўноўвае з касьбой ("Не да пяра, канечне, у працы — / Кашу разору, сам не свой...") — але і гэтая касьба атрымлівае ў аўтара касмічнае гучанне: "З Сусветам зорным на самоце, / Калі балючы мозг не спіць, / Я — у паэзіі, ў рабоце, / Мой верш расою зіхаціць!" Я. Прадзядовіч яскрава даказвае, што родная паэзія можа гучаць сучасна і закранаць самыя высокія — астральныя — узроўні, не адыходзячы ад сваіх прыродна-вясковых вытокаў.

Другая частка кнігі, у якую ўвайшлі творы з асабістага архіва аўтара, атрымала слушную назву "Грамовае дрэва", паколькі яе наскрозь перакрыжоўвае гэты універсальны сімвал. Грамовае дрэва Я. Прадзядовіча — гэта ў адначассе і міфалагічнае Дрэва Сусвету, і радаводнае дрэва, і святое месца. Гэта тое дрэва, што захоўвае ў сваім нутры духоўную спадчыну нацыі, праносячы яе праз усе навалы і ліхалецці, каб данесці да нашчадкаў гэту святую ісціну: "Спрадвек сячэ яго залева, / Маланка паліць, глушыць гром. / Дык мо таму грамовым дрэва / Завецца ўсім наўкол сялом". Гэты сімвал — у аснове нацыянальнага быцця, гісторыі, повязі часоў і пакаленняў: "<...> Ды памяць не зарыта. / Пра будучыню крона, карані / Турбуюцца, шапочуць знакаміта / Ў грамовым дрэве нашым дзень пры дні". Але, на жаль, аўтар не паспеў надаць гэтаму ўдаламу вобразу належнае развіццё, ён застаўся дарэшты не распрацаваным, эпізадычным, вылучыўся , найперш, дзякуючы старанням складальніка кнігі.

Некалькі сваіх вершаў творца прысвячае калегам па пяры, арыгінальна трактуючы вобраз паэта не толькі як героя-падзвіжніка, але і белую варону, ахвяру агульнага неразумення. Не забывае ён і пра крытыкаў-нядобразычліўцаў, што "правінцыйных рамантыкаў светлых / абіраюць, каб вочы заліць". Улюбёны паэт Я. Прадзядовіча, мяркуючы па яго згадках — Максім Багдановіч, хоць ёсць тут твор "***Хто рассыпаў жменяй зоры..." — яўнае наследаванне Купалы. Мае аўтар і свайго непасрэднага настаўніка ў паэзіі Міхася Стрыгалёва, якому ў знак удзячнасці прысвяціў вершы "Ода майстру" і "Вучыцелю".

Як відаць па позніх вершах Я. Прадзядовіча, апошнія гады ён дажываў у цяжкім душэўным стане. Расчараваўшыся канчаткова ў магчымасці ўзаемнага кахання ("Навошта дасылаеш мне любоў, / Што не разродзіцца дзіцём ніколі?"), стаміўшыся ад бясплённых спробаў дабіцца прызнання свайго таленту ("Мне не прабіцца ў вышыню стралой. / Тым дрэвам, што другіх абыдзе..."), адчуваючы сваю татальную — касмічную — адзіноту, ён усё часцей звяртаецца да Бога ("Што я жыву, адзін Ты рады..."). Прычым звяртаецца са страшнай для 50-гадовага чалавека — просьбай: "Таму мяне, прашу я, забяры / З зямлі тваёй пакутніцкага твару". І каб не раптоўная смерць, гэтыя радкі здаваліся б самаўлюбёным пазёрствам. У апошніх вершах яскрава дамінуе развітальны матыў. Людзі звычайна стараюцца абыходзіць гэткія тэмы, але творы Я. Прадзядовіча якраз прымушаюць перажываць гэтае пачуццё марнасці зямнога існавання, прычым змест гэтых вершаў далёкі ад суіцыдальных матываў. Застаецца толькі спачуваць трагедыі жыцця чалавека, трагедыі яго адзіноты ў сусвеце, трагедыі паэта Я. Прадзядовіча. Нішто не трымае аўтара на зямлі: ні сям'я, якой не накавана было ўтварыцца, ні каханне, ні сябры і блізкія людзі — і нават уласная творчасць для яго губляе якое-небудзь значэнне: "Пыл абтрасаю са слядоў — / Бывайце, псеўдавершы, / Бывай, краіна псеўдаслоў..." Безумоўна, такая паэзія ніяк не прызначана для масавага чытача, але, з прычыны гранічнай шчырасці, яна дае магчымасць адчуць сапраўдны катарсіс, асэнсоўваючы асабістую трагедыю жыцця і лёсу аўтара, што раскрыта ў яго вершах.

Паэт Я. Прадзядовіч заслужыў і ўдзячную памяць нашчадкаў, і прызнанне свайго таленту. Сведчаннем таму стаўся выхад у свет яго кнігі "Астральныя сны", што выбіваецца з кагорты апошніх паэтычных выданняў і індывідуальным аўтарскім стылем, і філасофскай паглыбленасцю, а, галоўнае, высокім — касмічным — узроўнем асэнсавання рэчаіснасці, што выяўлены ў змешчаных тут вершах.

Алесь СУХАДОЛАЎ

Анкета «ЛіМа»

1. Раскажыце коратка пра сябе.

2. З якой пары і з якой прычыны вы з'яўляецеся чытачом нашай газеты?

3. У чым палягае лімаўская адметнасць у параўнанні з іншымі выданнямі падобнага накірунку?

4. Хто з аўтараў (штатных і пазаштатных) найбольш імпануе вам сваім мысленнем і стылем? Якія рубрыкі вам найбольш цікавыя?

5. Якія тэмы газета павінна закранаць глыбей і шырэй (перыядычна)?

6. Што перашкаджае вам быць нашым пастаянным аўтарам?

1. Калі коратка — **Юрась Нераток.**

2. З "ЛіМа" пачынаў шлях у беларускай літаратуры. Уладзімір Казбярук у 1996 годзе амаль за руку падвёў да Міколы Гіля з першай нізкай вершаў на беларускай мове. З таго часу — і пастаянны чытач, і перыядычны аўтар.

3. Люблю казаць, што "ЛіМ" — "раёнка" пісьменніка. Даволі аператыўныя і разнастайныя матэрыялы. А што не ўсё кожнаму чытачу цікава — то і ў раённых газетах так, аднак у курсе галоўных падзей будзеш.

4. Як пісьменніка, цікавіць літаратура ў чыстым выглядзе (паэзія-проза, стар. 8 — 9), крытычныя агляды часопісаў, буйных або цікавых праектаў, альтэрнатыўная крытыка, матэрыялы пра выбітных і блізкіх па духу творцаў. Заўсёды позірк спыняецца на матэрыялах Жанны Капусты, Леаніда Галубовіча, Ірыны Шаўляковай, Анатоля Кудласевіча, Сяргея Грышкевіча, апошнім часам — Ціхана Чарнякевіча...

5. Добра было б мець пастаянную жывую рубрыку кшталту гэтай анкеты, дзе можна было б абмяняцца думкамі. Ці, напрыклад, інтэрв'ю (з нагоды юбілею, выхаду кнігі або публікацыі буйнога твора, здзяйснення пэўнага праекта). Падаецца, што больш празрыста павінна паказвацца дзейнасць кіраўніцтва СПБ, каб было менш чутак і звад. Робіцца шмат чаго для літаратуры, аднак не варта беларусам падзяляцца на касты, а то ў выніку "грамадзянскай" вайны шмат хто застанецца за літаратурным працэсам, што азначае пагібель часткі творцаў і далейшае супрацьстаянне. Пісьменнікі ўсё ж хоць і творчая, але інтэлігенцыя...

6. Здаецца, дагэтуль нічога не перашкаджала: выходзілі матэрыялы і калі галоўным рэдактарам быў Алесь Пісьмянкоў, пасля — Віктар Шніп, і да нядаўняга часу — Анатоль Казлоў (здаецца, рэкардсмен сярод галоўных рэдактараў у гісторыі "ЛіМа"). Зрэшты, стараюся даверам лімаўцаў не злоўжываць — газета не гумовая.

Настальгія па будучым

Даўно я не чытаў кніжку з такім захапленнем. А іх, добрых і ўсякіх, было больш чым дастаткова, ды і праца абавязвае. А гэтая вось — "Охота на майских жуков" — нечакана "прыплыла" аж з самой Японіі, транзітам праз беларускія Бялынічы.

Яшчэ па гадах вучобы ў Маскве знаёмы я з рускамоўным паэтам Вячаславам Казакевічам, з якім не губляў сувязі нават пасля яго ад'езду ў 1993 годзе на працу ва універсітэт горада Таяма. І менавіта там пачаў ён пісаць прозу, больш за тое, выдаваць яе кніжкамі. Ад яго мастацкіх (у нечым па-добраму эсэістычных) тэкстаў вее помным супакаеннем савецкага часу... Ён вяртае нас (усіх каму за 45 і болей) у наша лапушына-кукурузнае дзяцінства і сацыялістычную маладосць.

Прасцей кажучы, аўтар піша пра сябе і свой дзіцячы час. Проза яго феерычна-аўтабіяграфічная, хоць і не без фантасмагорыі. Сцвярджаю, бо, як кажуць, аднойчы бываў на яго малой радзіме і шапачна знаёмы амаль з усімі героямі рэцэнзуемай тут кніжкі...

Зрэшты, здзіўляцца яго прозе можа толькі не абазнаны ў яго паэтычнай творчасці чалавек. Бо, як зазначае ў сваім артыкуле сучасны рускі крытык Аляксандр Лабачоў, *"поэзия Казакевича действительно вырастает на прозаической почве, которая утоптана ногами самого автора."* Нельга не пагадзіцца і з іншымі яго развагамі наконт прозы В. Казакевіча. Прынамсі сцвярджэннем, што *"Охота на майских жуков", несмотря на традиционность самой темы детских воспоминаний, на современном фоне отечественной прозы смотрится особняком. (...) Может быть, это происходит именно в силу того, что автор совершенно не намерен кого-либо удивить сюжетной выдумкой или поразить оригинальностью стиля. Он просто воссоздает родной мир, ему есть что сказать... (...) ... он поэт не столько медитативный, сколько рассказывающий, с улыбкой да усмешкой горстями рассыпающий случаи из жизни, которые тут же обретают собственное существование и продолжают жить по своему разумению. (...) Зная стихи автора, повесть вполне можно прочесть как своего рода прозаический комментарий к стихам."*

Такі тон гаворкі з чытачом (даверліва-раскаваны, шчыры, амаль сяброўскі) дадае шарму ўсяму твору цалкам. Савецкая рэчаіснасць, запомненая вачыма падлетка, не падаецца ўжо такой закабаленай, ідэалагізаванай, змрочнай, а наадварот — нейкай правінцыйна захапляльнай, прыцягальнай сваёй простасцю і чалавечнасцю, маральнасцю адносна цяперашняга часу, і ў рэшце рэшт, настальгічнай любоўю да свайго мінулага... Аўтар са свайго цяперашняга веку стараецца як мага менш і заўважней рэдагаваць свае малалетнія ўражанні той пары.

Даўно нічога падобнага не чыталася ў сучаснай мастацкай літаратуры пра камуністычную эпоху, напісанага такім раскаваным і праўдзівым стылем. Паказаць сваё мінулае, не ачарніўшы яго, але адмыўшы (дзіцячым смехам і слязьмі) да празрыстасці...

Сям'я адказнага работніка райвыканкама ў дзесяцітысячным пасёлку (Бялынічы). Яе станаўленне і ўнутранае жыццё з прымешкам грамадскіх і сацыяльных падзей акаляючага свету. Рэч наскрозь біяграфічная. (Застаецца толькі здзіўляцца, як такое па сутнасці празаічнае правінцыйнае *бытаванне* аўтар змог перастварыць у такое ўзвышанае, драматычнае і займальнае...) Талент, безумоўна (*"Будешь знаменитым!" — предсказывал брат."*) Галоўныя героі: бацька, нянька, брат і маці...

Найбольш удала і каларытна выпісаны вобраз нянькі Мар'яны (*"пайдзі туды — не знаю куды, прынясі то — не ведаю што"*), мамінай сваячкі, якую ўзялі з вёскі для догляду за дзецьмі і хатняй гаспадаркай. Вышэйагучаны мной крытык А. Лабачоў намякнуў нават на асацыяцыю з пушкінскай Арынай Радзівонаўнай. Я з гэтым не пагаджуся, бо тыпаж беларускай прасталюднай цёмнай і ў нечым недалёкай жанчыны, безумоўна, глыбейшы і шырэйшы за знаны намі са школьных гадоў спецыфічны вобраз нянькі Пушкіна. Гэта, не пабаюся сказаць, вобраз гогалеўскага маштабу. Перад намі неадшліфаваны і неагранены каштоўны алмаз, якому мы да апошняга часу не ведаем цаны. Паслухайце яе вулічны маналог пра "сваю сям'ю": *"Ходят! — воздев пятерни к небу и по-вратарски расставив ноги, интригующе воздвигалась она перед отшатывающимся прохожим. — Старший сын ходит и младший. Старший — лунатик, ему луна надо* (дарэчы, хто ведае творчасць аўтара як паэта, не можа не ўспомніць яго зборнік вершаў "Лунат", што як бы пацвярджае біяграфічнасць яго мастацкай прозы), *а младшему — горшок. Как покойники, с закрытыми глазами встают. И хозяин топает. С вечеру выпьет горелки, а потом давай ему воды озеро! И не абы-какой, а шипучей, с содой! А лучше с медом! И матка шаркает. Капли от сердца пьет... Нервенная очень! Чуть что не так — в крик. И кошка гоцает. Глаза, что лампы! И по чердаку некто грукает... Весь дом ходуном ходит! — качала она серенькой жидкой косицей с вплетенной в нее узкой красной тесемкой. — Одна я лежу, нишкни!"* Апроч няўтомнага языка, рук і адноснага здароўя, Мар'яна нічога не мае. Але не зважаючы на дадзеную ёй аўтарам карыкатурную характарыстыку і пастаяннае ёрнічанне над ёй, усё ж падтэкстам ідзе і пераважвае менавіта любоў і ўдзячнасць да старой жанчыны: *"Была наша няня простодушно жалостлива и простодушно беспощадна. Этой странной, чисто русской смесью доброты и жестокости она и вскармливала нас"*; *"её речь казалась просто дикой и деревенской. Только спустя годы я с удивлением понял, что Марьяна болтала, пела, молилась на древнерусском, русском, белорусском, литовском, польском языках"*)... З гэтымі філалагічнымі, падкрэсленымі мной надумамі аўтара дазволю сабе не пагадзіцца...

Давайце па парадку. Вось, да прыкладу яркая інтэрнацыянальная карціна канца пяцідзесятых-пачатку шасцідзесятых гадоў мінулага стагоддзя: *"К «Волге» мы выходили при полном параде. Не вникая в мудрёные взаимоотношения Азии и Европы, мать наряжала нас в суконные тёмно-синие матроски, белоснежные гольфы и в заросшие цветочками узбекские тюбетейки. Отец влезал в украинскую рубашку с вышивкой и в праздничный костюм, к лацкану которого прикреплял значок депутата райсовета. Сунув в шкаф под горку трусов и маек партбилет, он нахлобучивал на голову твёрдую двугорбую шляпу и начинал в носках топать по комнатам, с проклятием разыскивая сапожную щётку. Мать в платье из искусственного шёлка ярче обыкновенного красила губы, взбивала кудрявый перманент и наполняла дом благоуханием «Серебряного копытца."*

Бацька, райвыканкамавец, мае службовую машыну, аднак сам па сабе мужык праставаты, са схільнасцю да граху ("ничто человеческое ему не чуждо"). З гэтай прычыны ў яго з жонкай нацягнутыя адносіны (былая вясковая дзеўка раптам стала занудна-крыклівай, хваравітай і прагматычнай мяшчанкай з поўным наборам характарыстык жонкі раённага начальніка; на жаль, рана памерла і чамусьці адносна бацькі, аўтар апісвае яе неяк прахалодна-адстаронена). Даволі значнае і займальна-камічнае месца ў кніжцы аддадзена бацькаваму завочнаму навучанню (па блату, вядома) у розных сярэднетэхнічных і вышэйшых вучэбных установах...

Але найбольш мяне ўстрывожылі два эпізоды на ваенную тэму. Першы такі: *"Отец з гордостью начинал рассказ о своём друге, сокрушителе графинов Косте Макарине.*

— Было у нас с ним такое дело. Возвращались мы с Костей из увольнения в часть. Стояли тогда под Бранденбургом. Выпили, конечно. Идём, а на другом конце поля, ну, может, метров пятьсот от нас, какой-то немец идёт. «Давай на бутылку коньяка, — говорит Костя, — кто в немца попадёт!»

Савецкая рэчаіснасць, запомненая вачыма падлетка, не падаецца ўжо такой закабаленай, ідэалагізаванай, змрочнай, а наадварот — нейкай правінцыйна захапляльнай, прыцягальнай сваёй простасцю і чалавечнасцю, маральнасцю адносна цяперашняга часу, і ў рэшце рэшт, настальгічнай любоўю да свайго мінулага...

Пострелять хочется. Залегли с карабинами в одуванчики. Костя — первый. Мимо! Немец оглядывается: кто стрелял? Откуда? Моя очередь — трах! — упал немец. Но Костя коньяка не поставил. Такой нахал!»

І ўсё. Ніякага тлумачэння ці пасляслоўя да гэтага эпізода няма. Як бы між іншым. Ну, падумаеш, падстрэліў бацька "какого-то немца" (не на вайне, не ў баі, а проста на спрэчку)... Тут я аўтара не разумею. Магчыма, ён і пакінуў гэтую сцэну на каментар збоку, "умывши руки" як той Пілат, каб пачуць голас крытыкі, альбо каб голас зверху пачуў сам бацька?.. Бо, трэба зазначыць, што характарыстыкі ўсім сваім родным і блізкім (у тым ліку і сабе!) В. Казакевіч дае бязлітасна-праўдзівыя, а нярэдка нервова-крыўдлівыя і нават балюча-сакрушальныя. Але менавіта дзякуючы гэтаму і заварожвае ды інтрыгуе чытача.

Праўда, тут, на супрацьходзе, можна прыпомніць расповед дзеда пра першыя дні вайны. Далі, значыць, яму і калгаснаму пастуху позвы з'явіцца ў райцэнтр для мабілізацыі. Пайшлі, а там ужо афіцыйныя паперы паляць: ідзіце, маўляў, у другі райцэнтр. Пайшлі лесам. Грыбоў набралі. І нечакана для сябе наткнуліся на забітых чырвонаармейцаў. Пастух сцягнуў з аднаго з іх хромавыя боты. Зняў свае лапці — і ногі ў афіцэрскія боты. *"А возле городка наскочили на них чужие мотоциклетки. Оказалось, тут власть уже не советская, а немецкая.*

— Ком, ком! — поманили мотоциклисты.

Слез один с мотоцикла, поглядел на пастуховы сапоги и — винтовку с плеча: "Комиссар!"

— Паночки! — взмолился тот. — Я пастух. У него спросите!

— Комиссар! — не соглашается немец.

Повалился пастух на задницу.

— Я сейчас эти сапоги сниму и вам отдам!

(...) Но немец тах из винтовки, и тот затих. И по гладкому склону лаковых голенищ скользнуло смутное небесное облачко."

Але ці ўраўнаважваюцца прыведзеныя мной поруч два эпізоды гібелю гэтых двух людзей? Наўрад ці... Зноў жа сітуацыя аддадзена чытачу на роздум і ўласны прысуд. Праўда жыцця найперш. Мастацкая — следам...

Наводдаль не лішні і такі ўспамін бацькі: *"Дашь цыганёнку яйцо, он танцует и поёт перед тобой. За одно яйцо целый концерт! — разливался отец. — Жили плохо, но весело. Время было такое, что всё пело и благоухало — тридцать седьмой год!"*

А вось погляд яго сына наконт тагачаснай ідэалагічнай работы бацькі: *"Он призывал повысить надои молока, расписывал, сколько сказочных блюд можно приготовить из кукурузы, уговаривал собирать высокие урожаи и горы яиц. Результаты этой неустанной деятельности оказались странноватыми. Чем больше он пропадал на мотоцикле в захолустье, тем реже в магазине на нашей улице появлялось молоко. А за хлебом с рассвета стали выстраиваться очереди, будто в поселке появилось несколько тысяч голодных жителей."*

Нейкім чынам гэта адказ на шматлікія пытанні нашага нядаўняга грамадскага жыцця.

Мова твора перасыпана гарадской трасянкай і беларускай вясковай лексікай (*"стихни, похвалиться, кличет, Перун, сховай"*) ды безмацюжнай лаянкай-сваркай (*"Что б его буря разорвала! — досадливо желала сорняку Марьяна."*; *"Холера его возьми! — негодовала мать."*; *"Что б ты горой стал! — пожелала мать* (мышаняці, "мышонку" — **леГАЛ**)*"*. Магчыма, аўтар наўмысна ўнікаў больш поўных праяў беларушчыны, хоць і праз наяўныя яркія маналогі і дыялогі шырока праяўляюцца наскрозь нацыянальныя характары.

Сам літаратурны стыль — каларытны, з іранічным прымешкам, а падчас і лёгкім сцёбам, метафарычны, — які не трымае чытача на павучальнай дыстанцыі, а наадварот — далёка ад сябе не адпускае...

Магчыма, аўтар наўмысна ўнікаў больш поўных праяў беларушчыны, хоць і праз наяўныя яркія маналогі і дыялогі шырока праяўляюцца наскрозь нацыянальныя характары.

Агулам ад парадаксальных вобразаў і метафар В. Казакевіча, як ад тых майскіх жукоў, сцяпаешся на кожнай старонцы... Скажам, як вам такое: *"И везде мог оказаться наш отец, мчащийся на гремучем мотоцикле с толстым бревном света, торчащим из фары."*

Пра людзей таго часу аўтар піша з вялікай чалавечай любоўю, нярэдка надзяляючы іх аўрай святасці і вялікадушнасці.

"Пойдём, прабабушку покажу, — звала Ягнеша.

Прабабушка была вся белая и не вставала так давно, что её бледность передалась вещам вокруг. Она лежала на раздольной белоснежной постели с белой горой больших подушек под головой, в льняной некрашеной сорочке, с аккуратно расчесанными длинными седыми волосами, с застывшими на свежайшем пододеяльнике прозрачными руками. Белое облако заглядывало в полуоткрытое окно над её изголовьем, и белая занавеска волновалась над белым подоконником.

— Сколько мне годиков? — экзаменовала нас прабабушка.

— Сто один, — отвечали мы.

— Неправда! —торжествовала прабабушка. — Уже сто два."

Прырода ў творы паўстае сімвалам жыцця ("жыватворная" крыніца ў дзедавай вёсцы, якую з бацькавай ініцыятывы так "акультурылі", што людзі перасталі піць з яе ваду, таму неўзабаве ўсе: *"железные бессмертные люди сгинули* (доўгажыхары вёскі — **леГАЛ**), *будто могли существовать лишь до тех пор, пока пили железную воду"*).

Твораў такой мастацкай вартасці ў сучаснай беларускай літаратуры няшмат. Кніжка напрошваецца на пераклад ці хоць бы надрукаванне асобных тэкстаў у часопісе "Нёман" (зазначу, што "Охота на майских жуков" публікавалася ў мінулым годзе ў расійскім часопісе "Знамя" і атрымала высокую ацэнку крытыкаў). Як на маю думку, Вячаслаў Казакевіч адназначна — творчая постаць узроўню Ігара Шклярэўскага, які, на жаль, аказаўся адрэзаным ад нашай літаратуры. Мяркую, з В. Казакевічам нам трэба было б пазбегчы падобнай памылкі.

Не выходзіць з галавы фантазія Мар'яны пра доўгачаканую і сто раз снёную ёй паездку ў сваю родную вёску: *"Всё чаще Марьяна мечтала вслух, как отправиться в дорогу одна. "Там же моя родина, — заводила она. — Все знакомые. Поеду, погляжу, как они в земле роются". И она строила планы, как поедет с автостанции до областного центра, там распытает добрых людей, где автобус в её сторону. Попросит шофёра остановиться на шоссе возле лесничества. А уж оттуда з завязанными глазами дорогу найдёт.*

— Ботинки сниму, там песочек бархатный, как зола из печки. Пойду березняком. Кругом совы спят, кукушки кукуют. Потом горами три версты, пока старый монастырь из земли не вылезет. Воды из колодца напьюся. И опять — марш! Пруд миную, ляшушек там миллион. И все квакают. Дальше ельник и голый шлях. Две деревни пропущу, а как Гадюкин лес засинеет, вот она, значит, моя родина. Тут я ботинку надену, серыги в уши втыкну и в первую же хату зайду. "Узнаёте?" — спрошу."

Ці не самому аўтару прыкладна такім рамантычным уяўляецца яго магчымае вяртанне на Бацькаўшчыну? Гэта нават адчувае ў сваім Уладзівастоку ўжо знаёмы нам крытык А. Лабачоў, калі піша, што *"провинциальный мир белорусской глубинки представал в поэзии Казакевича одновременно знакомым и привычным — от фикуса на окне до козы, грызущей в огороде рябину, и чудесно преображенным, когда народная сказка и детская фантазия, взяв друг друга за руки, бродят по окрестностям тех же Бельничей, где «с золотой луной сундук зарыт». В россыпи лучших стихотворений из первых книг, сверкающих, как в детстве колотый на твердой ладони отца комковой сахар, эти счастливые захолустные Бельничи и сегодня горят домашними огнями под затопившей мир луной"*.

Таму — давай, Слава, не затрымлівайся! Пазнаем і прымем, пакуль яшчэ не забылі...

Бо насамрэч можа здарыцца і так як з нянькай, якую бацька неўзабаве *"отвез в дом престарелых. Это был дом для состарившихся провинциальных совпартработников. Няньку туда бы не взяли, если б не отцовские связи. По его словам, Марьяна была очень горда, что попала в такое завидное место"*.

Аднак праз некаторы час *"из дома престарелых позвонили и сообщили о смерти Марии Ивановны Миколуцкой. Где её похоронили, неизвестно. Ни один из нас не побывал на её могиле. А нынче эту могилу уже не сыщешь"*.

Так канчаецца чалавек і гэтая дзіцячая споведзь аўтара. Але не выбітная літаратурная творчасць нашага земляка Вячаслава Казакевіча, ад якога мы чакаем новых выдатных кніг пра нашу цудоўную Беларусь нават з *"такого завидного места"*, як Японія...

Леанід ГАЛУБОВІЧ

Ганад ЧАРКАЗЯН

Чаргаві

* * *

Баюся сцюжы, баюся здрады,
Якая, як сцюжа, дыхае ўслед.
Падману і зайздрасці
хто з нас рады?
На праўдзе адзінай
стаіць наш свет.

* * *

Пасміхніся, жонка мая, і даруй.
Сон, дачушка, змахні рукой.
Прычакаем утрох мы дасвецця зару
Над унучкай — балесна малой.

* * *

Пасадзіў яшчэ дрэва адно,
Адладаваў хаціну старую.
І канца клопатам не відно.
Часам ці гэтак сваім ахвярую?

* * *

Міма праходжу — застаўся пагляд
На развітальнай тваёй усмешцы.
І час не верне цябе назад,
Услед хваляванне
памчыць па сцежцы.

* * *

Павер чалавеку —
груз панясе вялікі,
Адказнасць адчуе сваю за давер.
А спраў распачатых
пакіне без ліку —
Не верыў нікому,
пражыў у акружжы хімер.

* * *

Лекаў няма ад адзіноты,
Нішто не разгоніць
самоту і скруху.
Калі не сыдзе ў нябыту цянёты,
То скажуць ухвальна
пра моц яго духу.

* * *

Не вечны гелію ў Сонцы запас,
Выш гляне аднойчы
зоркамі згаслымі.
Той пераможца, хто цэніць свой час
І ўцешны за створанае
рукамі ўласнымі.

* * *

Свеціцца шчасцем
ад вынікаў працы:
Поплаў скасіў і сена высушыў сёння.
А хтосьці ад сквапліых
думак гібее ў палацы,
Ніяк не прагоніць свайго бяссоння.

* * *

Калі жывеш годна —
чуеш радасць быцця,
Сэрцам не згаснеш
у коле адданых сяброў.
Толькі часам пытаеш,
як пытае дзіця:
Якая мараль у здрайцаў і ліхвяроў?

* * *

Туман і дажджы —
свету цьмяныя вёрсты,
Ад зморы скразной
і птушцы не заспяваць.
Ратунак адзін мудры і просты:
Братоў сваіх меншых ісці ратаваць.

* * *

Жанчына, прыгажосць,
святлынь, каханне —
Стагоддзямі прамаўляе свет.
І іншае прамаўляць ці стане,
Любові дасюль не адкрыўшы сакрэт.

* * *

Зноўку ў думках той шэры валун...
Дакрануўся, як да ледзяша.
Не пачуеш душы чуйных струн,
Калі каменем стала душа.

* * *

Моцны чалавек, ды не з металу,
Яму пад сілу любая завея.
Супраць устане жыццёвага шквалу.
Толькі душой, бывае, ржавее.

* * *

Маці і бацька...
І час, што з імі пагас.
Жорстка з намі, жывымі,
абходзіцца лёс.
Зорыць на нас Вечнасці зорны папас
Іскрамі слёз...

* * *

Позірк вачэй падыму —
Птушку злаўлю пад небам.
І зразумею, чаму
Каменю крылаў не трэба.

* * *

Пагляд вачэй
зайздрослівых — пусты.
Няма дабра ад поўнай каліты.
Бядняк у сне надзею напаткае,
Прачнецца — і надзея уцякае.

* * *

Кветкамі на ўсякія лады
Шыбы вокнаў распісаў мароз.
Птушак прыгадай у халады —
Што ім сыпануў і што прынёс.

* * *

Сыходзіць трава,
каб зноўку прыйсці.
Каб зноў расцвітаць, нямеюць сады.
За зменамі змены ідуць у жыцці.
І свет паўстае па вясне малады.

* * *

Не дрэва, не трава ён, а чарот.
І без яго маўчыць мая жалейка.
Стагоддзі голас слухае народ —
Усё пра ўсіх раскажа, салавейка.

Пераклад з курдскай
Міколы Мятліцкага

Дэбют

Алесь КОТАЎ

Студэнт Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П. М. Машэрава Алесь Котаў — натура арыгінальная хоць бы ўжо тым, што ён адзіны матэматык сярод сяброваў літаратурнага аб'яднання "Зараначка", якое існуе на факультэце беларускай філалогіі і культуры. Па-мужчынску прывабная і небяспечная для дзяўчат знешнасць шчасліва лучыцца ў яго асобе з высакародным і нават цнатлівым стаўленнем да кахання, а прафесійная логіка і высокі інтэлект — з рамантычнай натхнёнасцю, зачараванасцю родным словам, добрым веданнем сваіх каранёў і культурнай традыцыі. Упэўнена, што яго пакліканасць да літаратурнай творчасці невыпадковая і мы яшчэ сустрэнем гэтае імя на старонках літаратурных выданняў.

Вольга РУСІЛКА

Прыйшло дваццаць першае стагоддзе...

Прыйшло дваццаць першае стагоддзе.
Мінулае згарэла,
як запалка, як свечка,
Пакідаючы пасля сябе
толькі шызы дым успамінаў,
Часам цяжкіх, горкіх,
Але заўсёды маіх...
маіх і толькі маіх.
Прыйшло новае стагоддзе,
новая эра кахання,
Новая эра жыцця.
І я жыву, спадзяюся і мару,
Я жыву ўсім сэрцам,
я жыву ўсімі вамі,
Я жыву на сваёй зямлі
І ўдзячны Богу за гэта.

Белы снег

На бязмежнай роўнядзі поля
Ён — нібы чысты аркуш паперы
Са сшытка майго жыцця.
Гляджу на яго і пішу новы ліст
Небу, Сонцу, Ветру...
Я пішу і маўчу... уголас,
Я пішу і крычу... ледзьве чутна.
Я аддзячыць хачу ўсім сэрцам
Полю, зямлі і кветкам...
Аддзячыць хачу за тое,
Што пачулі мяне, падтрымалі
Водарам, мяккім пялёсткам,
Лесу чароўнай усмешкай.
Я пішу гэты ліст.
А навошта?
Ведаю, прыйдзе завея,
Літары, словы знікнуць,
З'явіцца новы аркуш,
І я зноў буду пісаць лісты
Небу, сонцу і кветкам.

Васіль ЖУКОВІЧ

Музей Багдановіча ў Мінску

Таццяне Шэляговіч

Гаспадыньцы харошай
храма прасветлага
вячэрняю ціхай парой
Я кажу:
— Крочу прыступкамі
ганка крутога
Да неўміручай зоркі — Максіма,
Пад аўру яго любові,
У яго мілагучны Сусвет —
І паўтараю
Гэта чалавечае,
сардэчнае — як запавет:
"Нашто ж на зямлі
Сваркі і звадкі, боль і горыч,
Калі мы ўсе разам ляцім
Да зор?"

Верш для Н.

Так хораша ты выглядаеш
Пад ношай
"пяцьдзесят плюс пяць"!
Такая гожа-маладая
Душа ў цябе, па ўсім відаць.

Міжволі ўспомніў: выйшла з казкі
Насуперак вятрам крутым.
Гарэлі на сукенцы краскі,
Як на кіліме лугавым.

Трыялет

Калі ёсць каго кахаць,
Маем верасень здаецца!
Весялей і сэрца б'ецца,
Калі ёсць каго кахаць.
Хай жа век не давядзецца
Вам на долю наракаць...
Калі ёсць каго кахаць,
Маем верасень здаецца!

Мая трывога

1.

Я цябе дажджлівым раннем
З Тройцаю павіншаваў.
За тваё з бядой змаганне
Гераіняю назваў.

Ты з прыглушаным адчаем
Адказала, што злягла,
Пра страшэнны боль начамі
Колькі словаў дадала.

Цяжкае тваё дыханне
Чуйны тэлефон данёс.
На папраўку спадзявання
Не дае суровы лёс.

2.

Чарнобыль злы наносіць
Свой сакрушальны ўдар.
У Бога сэрца просіць:
Дай рады, Валадар!

Нічога больш, мой Божа,
Не могуць урачы.
А Ты, Ўсявышні, можаш
Усё перамагчы.

Няўжо дасі дачасна
У Гомелі ўначы
Таму агню пагаснуць,
Што трэба зберагчы?

Санет для дачкі

Сюжэт пра капітана Грэя
І пра шчаслівую Асоль
Чытала ў лютую ты золь, —
Чужое шчасце слаба грэла.

Нямала маяў адгарэла.
Аціх няўпэўненасці боль.
Ты, быццам Грынава Асоль,
Надзеі ветразі сустрэла.

Калі прыйшла вясна кахання
Ў жыццёвым моры-акіяне,
У міг прастор твой праяснеў.
Нябёсамі благаславёна,
Чытала Грына так натхнёна
У новай — сонечнай — вясне!

* * *

Дзіяне

Пазнаёміўся з сакрэтам
Ўсмешкі сонечнай тваёй:
Ты народжаная летам,
Цёплай чэрвеньскай парой!

Ў сонейка ўзяла шмат ласкі,
Каб усмешкай асвятляць
Праз гады прастор брытанскі,
Вабіць любага й кахаць.

Асабліва расцвітаеш
У абдымках ты яго,
Як раз-пораз прылятаеш
З ім да сонейка свайго.

Даверaны гожых мелодый

(Акраверш)

Узрушвае, будзіць ён душы,
Лагодны і чуйна-відушчы,
Адметны ў музычнай прасторы,
Даверaны гожых мелодый,
З якімі імкне ён да зораў
І свету нясе асалоду.
Мелодыям жыць у народзе
І славіць пры кожнай нагодзе
Радзіму, каханне, прыроду.
Бог даў — не забіць, не закрэсліць
У таленце сілу й пяшчоту.
Душа пераможа маркоту,
Натхнёная і маладая,
І зможа па-над родным краем
Крыляць мілагучнаю песняй.

Фота Кастуся Дробава

Азмрочаная радасць

1957 год. Шчаслівы, радасны, з "залатым" атэстатам у кішэні, з вёскі Чырвоны пасёлак, што ў Пухавіцкім раёне, еду ў Мінск паступаць у педінстытут імя Максіма Горкага. Чаму менавіта ў гэтую ВНУ, сам не ведаю. Відаць, падсвядома памятаў свайго першага настаўніка Аляксандра Аляксандравіча Севасцьянава. А можа, на гэты маленькі подзвіг натхніў Васіль Іванавіч Фралоў — выкладчык рускай мовы і літаратуры? Удзельнік абароны Ленінграда. Закаханы (слова **ўлюбёны** тут недастаткова) у мастацтва слова, ён і сам пісаў вершы. Запомніліся радкі:

Санный путь напрямик
Через речку пролёг,
И спешил ученик
В то село на урок.

Хацелася пісаць так, як пісаў ён. Патаемна думалася: "А раптам змагу пісаць лепей!".

Мужчына-весялун на падпітку, што сядзеў насупраць, заўважыў апантанасць хлопца ў вельветцы на "маланках", у шырачэзных портках, ладна паношаных туфлях.

— Чаго такі вясёлы? Закахаўся? Да дзяўчыны едзеш?

— Школу закончыў. Паступаць у інстытут буду.

— І куды, калі не сакрэт?

— У педінстытут.

Жартаўнік вытрымаў інтэрвал. А затым — як усё роўна выліў на галаву, па-руску кажучы, "ушат вады":

— Мед, пед — хуже нет.

Палемізаваць не захацеў: не дарос да такога ўзроўню камунікацыі. Аднак горкі смак непрыемнага чуцця ад гэтых слоў нашу ў сэрцы і да сённяшняга дня.

Рэктар на сумоўі (медалістаў прымалі без экзамена) падліў масла ў агонь.

— Медаліст, а чаго на настаўніка хочаш вучыцца? Ды яшчэ на філолага?

У адказ прамямліў нешта накшталт:

— Вершы пішу.

На сваё мямленне атрымаў вычарпальнае рэктарскае:

— Дурань, думаеш, што тут цябе навучаць гэтай справе лепш? Не навучаць, а развучаць.

Так і жыву з болем у сэрцы: а можа, мае сумоўцы мелі рацыю? Быў бы цяпер інжынерам, будаваў масты, кіраваў вытворчасцю мінскіх самазвалаў. А то і вёў лясную гаспадарку — люблю лес з яго гукамі, фарбамі, патаемнасцю. А чым кепска — аграномам: клапаціўся б пра ўраджай, эксперыментаваў з гароднінай? А токар вышэйшай кваліфікацыі? З яго стабільнымі прафесарскімі (а цяпер і значна большымі) заробкамі. Чым кепска? Аднак стаў настаўнікам, а затым — настаўнікам настаўнікаў. Насуперак мамінаму: "Не выйдзе з цябе нянькі, сынок!". Насуперак кпіваму з вуснаў выпадковага спадарожніка: "Мед, пед — хуже нет!".

У кожнага — свой шлях. Мой шлях — "настаўніцкі нялёгкі хлеб" (цытую Ф. М. Янкоўскага). Хлеб гэты адрабляю на ніве народнай асветы блізка паўстагоддзя, а як з улікам студэнцкіх гадоў — дык усе 52 гады. І шкадаваць няма патрэбы. Ды ўжо і няма калі: час ставіць кропку!

І смех, і грэх

У студэнцкія гады былі мы розныя. Я — сумленны і правільны, выконваў усе ўстаноўкі, загады, інструкцыі. Лёня, Міша трымаліся супрацьлеглых прынцыпаў, дэкларуючы: бедныя студэнты, што з іх возьмеш. Пра беднасць — ніжэй. А пра нетрадыцыйныя (нават анекдатычныя) выпадкі раскажу тут...

Міхась вельмі любіў смачна паесці. Грошай не так і многа, а таму сёе-тое прыдумляў. Па-першае, чаргаваў сталоўкі, шукаў, дзе танней, дзе дабрэйшыя раздатчыцы: ці на Газетным завулку (цяпер там тэатр музычнай камедыі), ці ў студэнцкай сталоўцы (цяпер за Чырвоным касцёлам харчовы комплекс). Сапраўдны разведчык, вадзіў нас і ў сталоўку вагонарамонтнага завода. Вучыўся сам і вучыў нас быць сапраўднымі гурманамі і дэгустатарамі-прафесіяналамі.

Знаёмыя паварыхі і раздатчыцы "в воздух чепчики бросали", як яго бачылі, павялічвалі яму порцыю працэнтаў на пяцьдзесят, нам, каля яго, — на дваццаць. Але невысокаму, хударляваму, яму і гэтага было мала. (У дужках заўважу, што часта ён браў дзве порцыі другога, дзве па сто грамаў смятаны). Таму і пускаўся на хітрыкі...

Трошку, на дне, не даесць порцыю смачнага баршчу, зловіць муху і кідае ў талерку. Затым паважна, у выцягнутай руцэ посуд, са сцятымі вуснамі ідзе на раздачу.

— Памяняйце. Варыва гэтае ешце самі.

— Ды мы... Ды вы...

— Паклічце адміністратара.

Адміністратара не клікалі. Пытанне вырашалі на месцы.

Пераможца, не спяшаючыся, шырокімі крокамі (хадзіць прыстойна і прыгожа нас у вёсках ніхто не вучыў), кіраваўся да стала. Мы, чакаючы, чым жа закончыцца эпапея, ледзьве стрымліваліся ад смеху. А ён па-гаспадарску намазваў бясплатны (быў такі ў першай палове 60-х гадоў) сталоўскі хлеб бясплатнай гарчыцай і з задавальненнем паядаў дадатковую порцыю першага.

Муха не спрацоўвала датычна другога блюда. А шніцэлі былі, як нашы далоні, на паўталеркі. Вядома, Міхасю не хапала і такога аднаго. У дадзеным выпадку быў прыдатны волас: на галаве ж іх хапала. Недаедзены кавалак шніцэля "з воласам" (смак яго, шніцэля, помню і зараз) раздатчыцы заменьвалі новым, чыстым. Паколькі такая тактыка не магла апраўдваць сябе часта, наш сакурснік пастаянна мяняў месца дыслакацыі ў мінскіх сталоўках, а калі ленаваўся ездзіць у далёкія, дык цаляў трапіць на фабрычны-кухні кожны раз у новую змену.

Вялікі арыгінал, наш Міхась выкручваўся без грошай і з больш складаных сітуацый. Паважна, з горда ўзнятай галавой, напрыклад, пераходзіў вуліцу ў не прызначаным месцы, парушаў правілы абыходу транспарту ("Абыходзь трамвай сперади, а тралейбус — ззаду"). Прывучаныя да дысцыпліны, мы не раз назіралі, як з ім разбіраўся міліцыянт-рэгуліроўшчык дарожнага руху. Даставаў адразу па затрыманні квітанцыю на штраф. Міхась — адначасна даставаў кубышку з кішэні з сабранымі манетамі-адзінкамі (былі такія; адну ў аўтамат укінеш і пракуліш шклянку газаванай вады без сіропу; а як грукнеш па ім кулаком, то ён, здаралася, і з сіропам налье). Ды гэта ўжо іншая справа. І вось Міхась пачынаў адлічваць штраф — тры рублі — адзінкамі. Рабіў гэта павольна, не падганяючы падзеі, нібыта і лекцыі, і практычныя заняткі яго не чакалі. Міліцыянт кідаў рэзкае:

— А іншых грошай няма?

Адказваў сур'ёзна:

— Няма. А гэта што — не грошы?

Праз гады

Мікола МІШЧАНЧУК

Абразкі

Страж парадку рабіў адмашку левай рукой — у правай трымаў свісцюльку, і Міхась шырока крочыў па вуліцы сваім маршрутам. Ну, чым не вялікі камбінатар? Такі талент загінуў: пайшоў працаваць не ў цырк ілюзіяністам, а ў школу лагапедам.

P.S. Наконт свісцюлькі ў правай руцэ кіраўніка руху мой настаўнік выказаўся дасціпна і трапна:

— Вось гэта праца: свісне — і тры рублі ў кішэні. Свісне дзесяць разоў — трыццаць рублёў. Мікола, а ты колькі зарабляеш? Сто пяць за месяц? А ён — за тры дні столькі ж. Думаеш, ён усе штрафы дзяржаве аддае?

Вакол пісьменнасці

Нехта мае талент экстрасенса — бачыць, што, дзе, калі і як адбывалася. Часам маніць, часам угадвае, трапляе ў цэль. Другі — з дзяцінства прыроджаны спартсмен. Тут я ўвогуле ні да чога, як казаў мой вясковы сусед Фэлік. У школе шпурляў гранату (было такое практыкаванне пасля вайны), пасрэдна, на шэст без ног ускарабкваўся з цяжкасцю, стометроўку прабягаў не першы (праўда, і не апошні), з бервяна злятаў у адзінаборстве з дужэйшымі равеснікамі. Адным словам, быў шэранькім серадняком.

Па прыездзе ў Беларусь у 1954-м годзе, пасля смерці Сталіна, пайшоў у Суцінскую сярэднюю школу, што ў Пухавіцкім раёне Мінскай вобласці. І тут у галіне спорту не дасягаў вышыняў. З лыжнымі гонкамі яшчэ сяк-так не першы, затое ў прызёрах цаной вялікіх намаганняў. А вось са стральбой з дробнакаліберкі (нам выкладалі дысцыпліну "ваенная падрыхтоўка") з-за блізарукасці — не ў дугу. Прэтэндэнт на залаты медаль — і каб такое! Сорам. Асабліва перад дзяўчатамі адчуваў сваю мужчынскую непаўнацэннасць. Вось тут мне і спатрэбіўся талент не экстрасенса, а пісьменнасці. Талент гэты, на маю думку, быў прыроджаны толькі часткова. Патлумачу, чаму. Па-першае, мама хадзіла ў школу "год з калідорам", як сама казала. Пісала з памылкамі ў кожным слове, якія я ёй літасціва дараваў, пра якія ніколі не ўзгадваў. Бабулька па мамінай лініі Фядора — была ўвогуле непісьменная: чужыя людзі лісты ёй расчытвалі і адпісвалі пры рэдкай патрэбе. А вось дзядуля Апанас (таксама па мамінай лініі, бацьку Івана Архіпавіча — шахцёра і хлебапёка, які загінуў без вестак у вайну, яго родзічаў не ведаў і не ведаю) быў пісьменны чалавек. Ды пісьменнасць пайшла яму не на карысць. Згадваюцца "Віленскія камунары" М. Гарэцкага. Тут у яго розніца з героем твора класіка нашай літаратуры толькі ў імёнах і прозвішчах. А лёс аднолькавы. Як і герой Гарэцкага — народны заступнік, высланы ў Сібір, дзед таксама адстойваў праўду — напісаў заявы непісьменным "адыходнікам" з калгаса пасля сталінскага артыкула "Галавакружэнне ад поспехаў" — і загрымеў далей, чым дзед Мацея Мышкі, — на Далёкі Усход, у Амурскую вобласць. Дзедавы гены, відаць, мне перадаліся. Не ведаю, як у яго было з арфаграфіяй і каліграфіяй, а з пісьменнасцю ў плане агульна-філасофскім, культуралагічным было, пэўна, усё ў парадку.

Пісьменнасць увогуле ды яшчэ плюс арфаграфічная — вынік не толькі ўплыву генаў дзядулі, а і чытання. Чытаў у дзяцінстве шмат, усё, што мог, што было ў сціплых бібліятэках. Асабліва Жуль Верна. Чытаў да страты зроку, якая адчувальная і цяпер. Чытаў запоем. Адсюль — маторны рэфлекс правільнага пісьма: рука сама ведае, які знак прыпынку ставіць, а якую літару напісаць — падказвае зрок. Можа, чуццё рытму мовы, яе эмацыйных узлётаў і падзенняў дапамагае расстаўляць і аўтарскія знакі прыпынку. Але так было не ў школе, так — цяпер.

Вернемся ж да тэмы пра арфаграфічную пісьменнасць на раннім этапе. У пятым класе Юхцінскай сямігодкі (Амурская вобласць, Свабодненскі раён) амаль увесь клас (асабліва ўкраінец Підкуймуха) спісвалі ў мяне дыктоўкі. Ведалі, што не памылюся. А новая настаўніца рускай мовы — маладая і порсткая — не прызнала майго арфаграфічнага (часцей — інтуітыўнага, ледзь не экстрасенсавага) таленту. Адбылося гэта па той прычыне, што не любіў завучваць выключэнні з граматычных правілаў: самі правілы ведаў, а выключэнні — не ўсе. Першая чвэрць — усе пяцёркі, па рускай мове — чатыры. Другая чвэрць — тое самае. Не ведаю, што рабілася ў настаўніцкай, чый бок трымала дырэктрыса цягам гэтых дзвюх чвэрцей, а я перажываў глыбока. Мама казала, што нават схуднеў ад філасофскіх роздумаў над прычынай сітуацыі. Не ведаю таксама, як доўга працягваўся б канфлікт "настаўніца — вучань", каб не клас. Цішком ад мяне аднакласнікі (здаецца, усе, як адзін) пайшлі да дырэктрысы школы. Як адбывалася камунікатыўнасць, не магу сказаць. Толькі ў сёмым класе Підкуймуха перадаў па сакрэце, што вучні тады гаварылі: "Мы ўсе ў яго спісваем. Нам, як і яму, ставяць чацвёркі і пяцёркі. А чаму яму чацвёрка? Ён ведае лепш за нас". У сталінскі час учынак маіх сяброў быў вельмі смелы.

Гаворачы карацей, у трэцяй, чацвёртай чвэрцях, а затым за год меў пяцёрку і па рускай мове.

У Суцінскай школе руская мова давалася мне лягчэй, чым маім равеснікам. Дзеці вёскі, яны лепш за мяне валодалі сваёй роднай мовай і вучылі мяне ўзгадваць свае беларускія карані. Я ж чатырнаццаць гадоў гаварыў і пісаў толькі па-руску. "Ахвяра" пісьменнасці мусіў працаваць на клас... Гена Шамак меў выдатны зрок, а таму страляў з дробнакаліберкі хутка і трапляў "у цэнтру самую" сваёй і маёй мішэні. "Махальнікі" не заўважалі вокамгненнай замены зброі. Дараваў і ваенрук. А дыктоўкі рэгулярна спісваліся ў мяне на "добра" і — радзей на "пасрэдна" выдатнікам баявой падрыхтоўкі з Каменкі, што недалёка ад Суціна. Чуў, што даўно ўжо яго з намі няма. І Гена Кірыльчык — мой лепшы школьны сябра, зямны вобраз якога часта згадваю, ужо даўно не з намі. І так амаль увесь клас. Спісвалі, хто як мог. Помню, што перадача арфаграфічнай інфармацыі ішла праз двух Генадзяў. Мой жа абавязак быў чыста тэхнічны: тэкст трымаць адкрытым, не захінаць ад Сакалінага Вока сябра. Што я спраўна рабіў, хоць і перажываў пакуты сумлення: камсамолец, а такое творыць злачынства. Але на што не пойдзеш дзеля сяброў!

У Мінскім педінстытуце імя Максіма Горкага (цяпер — педуніверсітэт імя Максіма Танка) мой аўтарытэт дзякуючы арфаграфічнай кампетэнтнасці значна ўзрос (калі разважаць у стылі Мрыевага героя). Па-першае, таму што цяпер ужо павялічыўся кантынгент маіх падшэфных з каля дзесяці да звыш трыццаці чалавек. Па-другое, схема "Пішы правільна" пачала спрацоўваць ужо на два франты — на рускую і беларускую мову, асабліва ж датычна расстаноўкі знакаў прыпынку, і значна ўскладнілася, хоць мае абавязкі заставаліся ранейшыя: напісаў — адхіліся крыху ўбок, пакладзі тэкст так, каб было відаць таму, хто за тваёй спінаю. Далей звёны схемы выглядалі так... Ролю каардынатара і дырыжора выконваў 28-гадовы Аркаша з Гарадзеншчыны (параўнай — мне было 18) — былы матрос з выключным зрокам і шырачэзным клёшам на портках — у пяўметра, не менш. Гэтаму клёшу мы ўсе, сем хлопцаў (у войску не служылі толькі двое) зайздросцілі бясконца. Зайздросціў і былы сяржант з войскаў паветранай абароны Алесь, на тры гады маладзейшы за Аркашу.

Дык вось, ужо Аркаша, а не Гена Шамак, як у школе, дзякуючы сакаліным вачам, капіраваў цяжкія выпадкі правапісу з майго рукапісу, часам штурхаючы (нямоцна!) мяне ў спіну, каб не захінаў тэкст. За ім квадратна-гнездавым спосабам рассаджваліся хлопцы-пісарчукі і мая каманда (пэўная частка пяцідзесяціадзінкавага кантынгента трымалася Ніны, якая закончыла педтэхнікум і мела больш цвёрдыя, чым яе сяброўкі, навыкі правільнага пісьма). У арыфметычнай прагрэсіі капіраванне разыходзілася па аўдыторыі і бар'ер непісьменнасці пераадольваўся. (У дужках заўважу, што з 50 з хвосцікам студэнтаў 1-га курса філфака спецыялізацыі "руская і беларуская мова і літаратура" толькі двое напісалі першую дыктоўку пасля залічэння ў ВНУ на чатыры. У ліку дваіх была і мая асоба). Што датычыцца матроса-адстаўніка, дык ён ці не пяцьдзесят памылак зрабіў.

Паступова хлопцы-вяскоўцы, ды і дзяўчаты, пераадольвалі бар'ер непісьменнасці, пісалі ўсё лепш і лепш, але сістэма ўнутранай кансультацыі па гэтай праблеме прадаўжала дзейнічаць. Нават Ніна, якая ўсё ведала пра кожнага і ведамі гэтымі дзялілася з дэканам, нас "не заклала". Гэта пазней яна падставіла мяне, калі паехаў пасля першага курса на цаліну і захварэў, перасіліўшыся, ды трапіў у санаторый: маўляў, сімуляваў хваробу. З кім не бывае. Даўно дараваў ёй яе неблагачынства.

І вось аднойчы давялося нашу сістэму ўдасканальваць... А справа ў тым, што я напісаў дыктоўку на чатыры, бо зрабіў адну-адзіную памылку, а Аркадзь — на пяць, бо падаў слова па-свойму і якраз правільна. Цудоўная выкладчыца-русістка Валянціна Рыгораўна зразумела: нешта тут не так. І адсадзіла ад мяне за тры парты Аркадзя. Аднак і тут яна пралічылася: спісаць і з такой адлегласці Сакалінаму Воку было раз плюнуць.

Мой аўтарытэт у ВНУ як чалавека пісьменнага быў непарушны. Акрамя гэтага, ён мацаваўся і тым, што я чытаў усю абавязковую літаратуру і звыш таго, што накладвала адбітак на мае паводзіны: мой абавязак быў пракансультаваць па тэкстах, якія сябры і сяброўкі не паспелі прачытаць, ці да экзамена (калі ішоў апошні), ці пасля яго (калі здаваў першы).

Пасля такой цяжкай працы я, як кансультант, быў у цэнтры ўвагі, акружаўся, атульваўся клопатам старэйшых хлопцаў у інтэрнаце: яны і гатавалі, і (у межах прымальнага, без злоўжывання) налівалі.

Цяпер, праз гады, не адчуваю цяжкасцей у пісьме і вусным выказванні. Адзінага асцерагаюся ў першым выпадку — аўтарскіх знакаў прыпынку, якія перадаюць хваляванне душы, суб'ектыўныя адносіны да прадмета. У другім — што часам ад саштурхоўвання думак і пачуццяў (нібыта спаборнічаюць, наперагонкі спяшаюцца дасягнуць фінішу) страчваю ніць аповеда, парушаю логіку выказвання ў цэлым, надаю ўвагу пабочным тэзісам.

Праз гады бачу постаці родных аднакласнікаў, студэнтаў-аднакурснікаў, шаноўных настаўнікаў.

Праз гады...

Маё знаёмства з творчасцю Міхася Гуліна і Антаніны Слабодчыкавай адбылося ў верасні 2008 года падчас адкрыцця Першай беларускай біенале жывапісу, графікі і скульптуры. Сярод работ, выстаўленых тады ў сталічным Палацы мастацтва, вылучалася вялікае палатно з выкананай у тэхніцы калажа гратэскавай выявай жанчыны, падпісанае: "А. Слабодчыкава. Торс". Вылучыўся таксама муж і паплечнік Тоні — Міхась Гулін: выставачная камісія адмовілася ў поўным аб'ёме прыняць яго работу для экспазіцыі, і мастак зладзіў у колішняй галерэі "Падземка" альтэрнатыўную выставу твораў, якія "не прайшлі" адбор на біенале. Вось мне і закарцела даведацца, хто гэтыя дзёрзкія і амбітныя маладзёны, што намагаюцца чыніць бунт у ціхай затоцы беларускага арту.

У змаганні з пафасам

Праз нейкі час я наведаў выставу гэтага творчага тандэма, якая атрымала назву "Не best (то бок "не лепшае"): Для рэгрэсіўных". Не скажу, што атрымаўся канцэптуальны праект — хутчэй, своеасаблівая творчая справаздача. У маленькае памяшканне "Падземкі" ўціснуліся творы абсалютна розных жанраў-тэматычнай скіраванасці: калаж, жывапіс, арт-аб'екты. У цэнтры гэтага трэшавага міксу размясцілася інсталяцыя "Зона высадкі" — куча кардонных скрыняў і разнастайнага смецця, з якога ледзь прыкметна вытыркаліся фігуркі зялёненькіх іншапланецянаў. Але найменне выставы не толькі пазначала яе будзённы характар, але і скіроўвала да думкі, што для мастацтва не прымальныя якія-небудзь ацэначныя парадыгмы, кшталту "горшае — лепшае". І гэтай думкай М. Гулін кіруецца ў сваёй творчасці:

*— Чаму я абраў гэты стыль прымітывізму і стаў на такі шлях? Проста мне хочацца прыбраць з мастацтва ўсе моманты спаборніцтва. Мне не трэба, каб, гледзячы на маю работу, хтосьці казаў: "Ой, як ён файна працуе рукамі". Ці наадварот: "Гэты дурань нават вочы напісаць не ўмее". Для мяне найперш важна, **што** намалявана, а не **як**. І я не прымаю ніякіх параўнанняў, накшталт таго, хто з'яўляецца больш перадавым.*

Карціны на той выставе былі пададзены адмысловымі блокамі. Тэматычна аднародны блок твораў М. Гуліна пад назвай "Несанкцыянаванае скарыстанне колеру" прадстаўляе гераінь дыснееўскіх мультфільмаў, "пацярпелых" ад нязвыклай расфарбоўкі. А вось згуртаваныя ў адзін блок размаітыя калажы А. Слабодчыкавай страчваюць сваю эпатажную прыцягальнасць, бо ва ўласным кантэксце няма з чым іх параўнаць. Аднак мастакам, як яны патлумачылі, патрэбна было, каб наведвальнік не паглыбляўся ў творчыя індывідуальнасці аўтараў работ, а, найперш, быў агаломшаны агульным эфектам убачанага. Вось тут і адчуваецца "слабіна" праекта: пры атаясамленні самой творчасці са сродкам уздзеяння на масавую свядомасць губляецца ўвага да яе зместу і глыбіні. Ды ўзнікае вялікая небяспека, што за знешняй крыклівасцю і красамоўнымі абгрунтаваннямі можа хавацца ўнутраная пустэча і прагматычны разлік.

Нягледзячы на тое, што Міша і Тоня шчыльна знітаваныя ў сваіх творчых пошуках, гэта два зусім розныя чалавекі, пра якіх досыць цяжка пісаць агулам. У творчасці М. Гуліна няпроста знайсці якія-небудзь традыцыйныя нацыянальныя рысы, яна адштурхоўваецца ад глабальных маскультурных рэалій, такіх, як коміксы, рэклама, палітычная ідэалогія і інш. Складваецца ўражанне, што лірычны герой мастака стаміўся ад бясконцых праглядаў дробнабюджэтных баевікоў ды жахаў, адклаў убок свой поп-корн і кока-колу і, натхнёны відовішчам, узяўся за пэндзаль.

Міша і Тоня пазіцыянуюць сябе канкрэтна: як "барацьбіты з пафасам ва ўсіх яго праявах". Але, успомніўшы біблейскае: "Лекару! Ацалі самога сябе", — хочацца дадаць, што самавызначэнне мастакоў гучыць напышліва і малапераканаўча. Можа, Міша і неблагі стыліст, які робіць свае антыэстэтычныя выявы з тонкім, няхай і вычварным, густам. Але, выступаючы за простасць і даступнасць сродкаў, ён у той жа час абстаўляе сваю немудрагелістую творчасць высокаінтэлектуальнымі сентэнцыямі, ганарліва падкрэслівае ўласны прафесіяналізм — паняцце, у кантэксце прымітывізму недарэчнае. Такая супярэчлівая пазіцыя...

Яго жонка Тоня надзеленая аніяк не меншым талентам, але большай сціпласцю і, выдае на тое, з'яўляецца рэальным лідэрам у сумесных творчых пошуках. І слушна выказваецца пра асаблівасці сваёй і Мішавай творчасці:

— Мужчыны абараняюцца інтэлектам і вельмі рэдка насамрэч выяўляюць свае эмоцыі. Мужчыны наогул — вельмі пафасныя істоты. Жанчыны — больш чуллівыя, і таму жаночае мастацтва — больш шчырае.

Стыль яе работ наіўны, але з пэўным налётам эпатажу: гэта датычыць як неахайна склееных калажоў, так і "сакрэцікаў" — выяў, што змяшчаюцца пад шкло ў грунт. Але ў цэнтры ўвагі гэтых твораў рэчы зусім не дзіцячыя:

— Перадусім мяне хвалююць пытанні жыцця, смерці і кахання, і ў гэтых трох паняццях я корпаюся. Мяне надзвычай непакоіць пытанне смерці, гэтай жахлівай і незразумелай з'явы, бо ўсе мы памром і ўсе гэта ўсведамляем — у тым і унікальнасць кожнага чалавека. І нельга нікога лічыць блазнаватым, смешным ці неглыбокім, бо ўрэшце кожны ж ведае пра глабальную драму нашага жыцця.

Закрануўшы тэму кахання, нельга не аддаць належнае гарманічным узаемаадносінам Мішы і Тоні. Сваім прыкладам яны руйнуюць распаўсюджаны стэрэатып, што творчыя людзі цяжка між сабой ладзяць. Паводле Мішавага меркавання, узаемная творчасць, наадварот, дазваляе кожнаму арганічна развівацца ў сямейным асяроддзі. Тоня ж лічыць, што яны прыкметна выраслі, дзякуючы адно аднаму: і творча, і на інтэлектуальным узроўні, — асабліва ў параўнанні са сваімі аднакурснікамі, якім не было наканавана сустрэць у жыцці такога ўзаемаразумення. Важна, што гэтых дзвюх цікавых асоб, акрамя сямейных абавязкаў, лучыць творчае аднадумства. А мацаваць свае адносіны ім наканавана не толькі ў разам перажытых радасцях, але і ў агульнай барацьбе за права на альтэрнатыўны мастацкі погляд. Бацька Тоні, выкладчык Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Уладзімір Слабодчыкаў, прадстаўнік старэйшага, больш кансерватыўнага пакалення, шчыра выказвае захапленне той смеласцю і рашучасцю, з якой яго дзеці трымаюцца на ўласным шляху:

— Творчасць Мішы і Тоні можна не прымаць, можна адпрэчваць, але, безумоўна, яна ўражвае. Магчыма, людзі яшчэ не падрыхтаваныя да гэтага — на фоне нашага спакойнага мастацтва, дзе рэзкія рухі не распаўсюджаныя. Можна было б пайсці ціхім, больш традыцыйным шляхам, але Тоня і Міша абралі складаны шлях — шлях пошуку сябе, свайго самавыяўлення. Іх эпатажныя амбіцыі ў нейкай ступені сябе апраўдваюць: прыйшоў ужо час нашай публіцы трохі прызвычайвацца да актуальных у свеце тэндэнцый.

Алесь СУХАДОЛАЎ

На здымках: творы Міхася Гуліна, з нізкі "Несанкцыянаванае скарыстанне колеру" і Антаніны Слабодчыкавай, з нізкі "Чорныя плямы".

Фота аўтара

Сярод шэрасці і будзённасці, бясконцага кланіравання "шэдэўраў"-аднадзёнак і ўсеагульнай камерцыялізацыі мастацтва часцей і часцей прыгадваюцца словы Поля Верлена: "Музыка перш за ўсё"...

Працяг будзе!

Гомельская абласная філармонія адкрыла новы канцэртны сезон незвычайна рамантычнай імпрэзай, спалучыўшы мастацтва навамоднага маскоўскага арт-праекта "Тэнары XXI стагоддзя" і ўласнага эстрадна-сімфанічнага аркестра. Такім чынам горад над Сожам атрымаў унікальную магчымасць паслухаць у адным канцэрце самае лепшае з набыткаў сусветнай музыкі.

Тэмпераментныя артысты адразу знайшлі агульную мову са слухачамі. Сапраўды, замест "зашпіленых на ўсе гузікі" чапурыстых оперных выканаўцаў на сцэну выйшлі вельмі абаяльныя спевакі, у выкананні якіх прагучалі знакамітыя песні з рэпертуару Лучана Паваротці, Пласіда Дамінга, Хасэ Карэраса і Марыо Ланца. Гэта была музыка, здатная выклікаць бясконцую чараду эмоцый і асацыяцый. І, магчыма, кожнаму ў зале здавалася, што яна гучала толькі для яго аднаго, кранаючы нешта глыбока схаванае ў душы.

Сем гадоў таму сем вядучых выканаўцаў маскоўскіх тэатраў вырашылі працаваць разам. Так, у адрозненне ад легендарнага трыо Паваротці — Карэрас — Дамінга расійскі арт-праект "Тэнары XXI стагоддзя" налічвае ажно сем спевакоў. Кожны з іх валодае непаўторным тэмбрам і з'яўляецца ўладальнікам шматлікіх музычных рэгалій. Музычны кіраўнік праекта — лаўрэат усерасійскіх і міжнародных конкурсаў, уладальнік прэміі Фонду Ірыны Архіпавай Дзмітрый Сібірцаў. Яго спадзвіжнікі — лаўрэаты

міжнародных конкурсаў Аляксандр Захараў, заслужаны артыст Рэспублікі Інгушэція, саліст Вялікага тэатра Расіі; Аляксандр Багданаў, лаўрэат прэміі Фонду Ірыны Архіпавай, саліст Маскоўскага муніцыпальнага тэатра "Новая опера"; Максім Пастэр, лаўрэат прэміі Фонду Ірыны Архіпавай, саліст Вялікага тэатра Расіі, тэатра "San Carlo" (Неапаль, сезон 2006 г.) і тэатра "Communale" (Балонья, сезон 2007 г.); Міхаіл Урусаў, заслужаны артыст Расіі, уладальнік прэміі Фонду Ірыны Архіпавай, саліст Маскоўскага акадэмічнага музычнага тэатра імя К. Станіслаўскага і У. Неміровіча-Данчанкі, а таксама тэатра "La Scala" (Мілан, сезон 2006 г.); Эдуард Сямёнаў, саліст канцэртнага агенцтва "Артысты XXI стагоддзя"; Аляксандр Скварко, саліст тэатра "Новая опера". Артысты праекта "Тэнары XXI стагоддзя" жаданыя госці на медыйных і свецкіх мерапрыемствах, а іх выступленні на сусветна вядомых сцэнах у Нью-Йорку, Мілане, Лос-Анджэлесе — найлепшы доказ майстэрства і запатрабаванасці.

Госцем таго вечара стаў і галоўны дырыжор Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь Віктар Бабарыкін. Маэстра быў за дырыжорскім пультам у І аддзяленні канцэрта. Яго знаёмства з удзельнікамі арт-праекта "Тэнары XXI стагоддзя" адбылося яшчэ летась у Мінску падчас закрыцця III Міжнароднага фестывалю Юрыя Башмета.

Нягледзячы на напружаны канцэртны графік — пяць гарадоў за працоўны тыдзень, артысты знайшлі час для прэс-канферэнцыі. Шчырыя словы падзякі прагучалі на адрас кіраўніцтва Гомельскай абласной філармоніі за мастацкае выхаванне аўдыторыі а таксама на адрас мастацкага кіраўніка і дырыжора эстрадна-сімфанічнага аркестра Станіслава Шныра за высокі творчы ўзровень аркестра. Падчас выступленняў паміж удзельнікамі арт-праекта "Тэнары XXI стагоддзя" і эстраднасімфанічным аркестрам Гомельскай абласной філармоніі ўсталяваліся сяброўскія адносіны. І таму гісторыя іх творчага супрацоўніцтва толькі пачынаецца. Плануюцца сумесныя канцэрты, якія, магчыма, адбудуцца ў наступным маі. Як кажуць, to be continued...

Яніна ЧАРПУХІНА-АНДРЭЕВА

На здымку: удзельнікі праекта "Тэнары XXI стагоддзя".

г. Гомель

Тэатр сілкуецца любоўю







Гастрольная дэкада Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа ў Мінску завяршылася, артысты вярнуліся ў Віцебск, адкрылі на сваёй роднай сцэне чарговы сезон. І між намі зноў — пара соцень кіламетраў. Але што значаць адлегласць ды час для сталічных прыхільнікаў віцебскай Мельпамены і для самога тэатра, які заўсёды чакае водгукаў на сваю творчасць...

I

Як прыемна: людзі ходзяць у тэатр! Ходзяць — абвяргаючы бязлітасную да яго статыстыку, якая сведчыць пра зніжэнне папулярнасці аднаго з найстаражытных і традыцыйна масавых відовішчаў. Вось і падчас інтэрактыўнага апытання гледачоў, якое суправаджала нядаўняе тэлевізійнае ток-шоу "Выбар" на канале АНТ, прысвечанае сцэнічнаму мастацтву, абсалютная большасць прызналася: "У тэатр не хаджу, бо нецікава". Але ж гастрольныя спектаклі коласаўцаў, зладкаваныя ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М. Горкага, збіралі публіку, і кожную пастаноўку яна вянчала фінальнай авацыяй!

Дык хто ж наведваўся ў залу?

Штовечар я заўважала там дзесятак-паўтара знаёмых і вядомых твараў. Тэатрал-філосаф, які не толькі ў самай шараговай мізансцэне, а і нават на вокладцы праграмкі знойдзе зачэпку для разваг пра эстэтычны складнік нашага быцця. Тэатрал-скептык, чые глядацкі досвед, кніжная абазнанасць і прыдбаная жыццёвая мудрасць ужо не дазваляюць яму, як некалі, з наіўнасцю неафіта захапляцца ўбачаным, але і засцерагаюць ад катэгарычных высноў і ацэнак. Тэатрал-максімаліст з эмоцыямі пераходнага ўзросту, амбіцыямі першапраходцы і загнанай глыбока ў падсвядомасць няспраўджанай марай пра рэжысёрскую кар'еру. Памяркоўны рэцэнзент, у якога нямала сяброў-акцёраў. Мастацтвазнаўца з душой пракурора і яго антыпод — абаронца тэатра. Малады крытык з пакуль не страчанымі ілюзіямі ды нерастрачаным жаданнем выказацца і быць пачутым. Самы з'едлівы заўсёднік партэра: не крытыкан, а прафесійны крытыкайла, які ходзіць па розных тэатрах, але з нязменнай прэтэнзіяй — прэтэнзіяй на ісціну ў апошняй інстанцыі....

Люд хаця і адмысловы, аднак нешматлікі. Вось і атрымліваецца, што кожны вечар запаўняў залу (хай сабе часам і не надта шчыльна), падтрымліваў віцебскіх артыстаў самы звычайны і шчыры, неангажаваны глядач. Той, каму проста цікава ў тэатры, і дзеля каго тэатр працуе, жыве.

Сентыментальны экспромт у пяці эпізодах (з працягам)

II

Быў час, калі я перагледзела ўвесь актыўны рэпертуар коласаўцаў, ездзіла на прэм'еры, добра ведала творчасць віцебскіх акцёраў, часта пісала пра гэты тэатр. Так што рызыкую трапіць зараз у пастку ўласных сентыментальных успамінаў... Зінаіда Канапелька, Галіна Маркіна, Георгій Дубаў, Уладзімір Куляшоў, Іосіф Матусевіч, Мікалай Цішачкін, Генадзь Шкуратаў, Фёдар Шмакаў, Яўген Шыпіла: незабыўныя імёны, на якіх трымаецца некалькі дзесяцігоддзяў гісторыі нацыянальнага тэатра. Вядома, не ўсё ў гісторыі коласаўцаў было бездакорна. Але крытычным стрэлам і сентэнцыям, скіраваным у іх бок, заўсёды процістаяў магутны зарад павагі, сімпатыі, любові.

Так і цяпер... А як жа яшчэ ставіцца да тэатра, які ва ўмовах татальнай камерцыялізацыі, уплыву крызісных фінансава-эканамічных з'яў, наступу глабалізацыі, уціску спрадвечных духоўна-эстэтычных прыярытэтаў, падмены галоўных нацыянальных каштоўнасцяў масавай сурагатнай прадукцыяй, кан'юнктурнымі падробкамі пад культурна-мастацкія набыткі; ва ўмовах крытычнага стану мовы тытульнай нацыі краіны, — імкнецца падтрымліваць лепшыя традыцыі айчыннай сцэны, захоўваць непаўторную самабытнасць свайго аблічча, зберагае беларускі дух, жывую Коласаву мову і прытым не цураецца наватарства?

Пазіцыю і ўнутраны стан тэатра, а ў большай меры — тактыку яго мастацкага кіраўніцтва люструе гастрольны рэпертуар. Зважаючы на гэтую акалічнасць, не варта здзіўляцца, чаму мінскія гастролі коласаўцы адкрылі, скажам, не спектаклем "Несцерка", сённяшняй сваёй візітоўкай (хрэстаматыйную камедыю паводле В. Вольскага ўвогуле не прывезлі), а драмай "Васа", пастаўленай у пазамінулым сезоне да юбілею Святланы Акружной — адзінай і незаменнай выканаўцы галоўнай ролі. У Рыда Таліпава, які толькі сёлета ўзначаліў тэатр у Віцебску, гэта была адзіная магчымасць паказаць уласную работу (як рэжысёра, сцэнографа і аўтара музычнага афармлення ў адной асобе), ажыццёўленую на славутай сцэне, а да таго ж прадставіць коласаўцаў як акадэмічны рэпертуарны тэатр.

Паказ п'есы М. Горкага на сцэне сталічнага тэатра, які носіць імя класіка рускай літаратуры і ў якім параўнальна нядаўна была таксама, хаця, вядома ж, зусім па-іншаму ўвасоблена "Васа Жалязнова", прывабіў увагу тэатралаў. І спарадзіў гледачоў-апанентаў, чый палемічны пафас можна выказаць адной фразай: "Мне Васа ўяўляецца не такой".

Цікава, што ў лістападзе далёкага 1910 года ў Віцебску акцёрская трупа пад кіраўніцтвам В. Віктарава іграла першы варыянт "Васы Жалязновай" — спектакль пад назвай "Маці". Як сведчыць гісторыя, тагачасны рэцэнзент ухваляў выканаўцу галоўнай ролі М. Чаркасаву-Лаўрэцкую за ўвасабленне ўсіх тонкасцяў цяжкага, дэспатычнага, злоснага характару і "ўтоенай злачыннасці" гераіні, вакол якой усе падаваліся няшчаснымі, гаротнымі, нібы зацкаваныя звяркі. На пачатку 1950-х "Васа Жалязнова" ставілася ў коласаўскім тэатры з удзелам Я. Глебаўскай, якая ўвасабляла вобраз нешараговай, але жорсткай і сквапнай асобы — уладальніцы капіталу, заклапочанай яго прымнажэннем, а яшчэ — апантанай мараю выхаваць з унука дастойнага спадкаемцу. У свой час на савецкай сцэне і ў кіно склаўся стэрэатып вобраза Васы як "жалезнай" драпежніцы, бяздушнай самаўладнай гаспадыні, глухой да патрэб уласных дзяцей. А ўрэшце творчая практыка прывяла да разбурэння стэрэатыпаў. Вось і Р. Таліпаў, адмовіўшыся ад "антыбуржуазнага" выкрывальніцкага пафасу п'есы вялікага пралетарскага пісьменніка, стварыў на сцэне актуальную гісторыю сям'і. Гісторыя хваробы і распаду аднаго канкрэтнага сямейства гучыць як абагульнены одум перад сусветнай праблемай дэгуманізацыі чалавечых адносін, крызісу роднасных стасункаў, страты маральных арыенціраў, спрадвечных і простых побытавых традыцый, чысціні радасцей жыцця. І ў сваіх буднях Васа Барысаўна (арт. Святлана Акружная) выглядае не гаспадыняй, а пакутніцай, якая і магла б стаць узорнай апякункай хатняга агменю, крыніцай сямейнай любові, ды была змушаная ўскласці на сябе абавязкі "бізнес-лэдзі", а клопаты пра дом падмяніць дбаннем пра яго рэпутацыю... Хто ж у доме, апроч людзей патрэбных і прышлых? П'янтос і распуснік, варты жалю прыгажун-муж (арт. Вячаслаў Грушоў); пустальга і гуляка — але ж які абаяльны з гітараю ў руках! — брат Прохар (арт. Валянцін Салаўёў). Дочкі: не па-дзіцячы практычная Наталля (Ніна Обухава) ды хваравітая, інфантыльная Людміла (Тамара Краснабаева), трагічна безабаронная істота, для якой "мама Вася" — светлы ўспамін дзяцінства і адзінае апірышча... Няўгледна прысутнічае самы малодшы прадстаўнік Храпавых — Жалязновых, унук Коля: вакол яго ўсчынаецца спекулятыўная дзяльба, двубой паміж Васай, яе прагматычнай і драпежнай нявесткай Рашэллю (Алена Сладкевіч), братам Прохарам. Лейтматывам спектакля гучаць іх спробы абгрунтаваць уласную адказнасць за лёс хлопчыка; метафарычным трывожным пытаннем застаецца самотны драўляны цацачны конь на авансцэне, як на краі безвыходнасці, быццам пакінуты тут сваім юным гаспадаром: а, можа, ёсць надзея на працяг безнадзейнага роду?

Наступныя эпізоды чытайце ў бліжэйшых нумарах "ЛіМа".

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

На здымках: народны артыст Беларусі Тадэвуш Кокштыс у спектаклі "Апошнія сведкі"; сцэна са спектакля "Апошнія сведкі"; народная артыстка Беларусі Святлана Акружная ў ролі Васы; сцэна са спектакля "Васа"; Раіса Грыбовіч (Бабка) і Наталля Саламаха (Фрося) у "Ветрагонах"; сцэна са спектакля "Крыж Еўфрасінні"; Генадзь Гайдук у ролі Эйнштэйна ("Прывітанне, Альберт!").

Фота Аляксандра Дзмітрыева

Слова краязнаўцы

Алесь Марціновіч разважае пра краязнаўчыя кнігі і публікацыі:

— Пералічыць усіх аўтараў, хто шчыруе на ніве краязнаўства, проста немагчыма, але варта спыніцца хаця б на пэўных кніжных і публіцыстычных праектах. Трэба адзначыць выдавецтва "Мастацкая літаратура", якое выпускае выдатную серыю пад назвай "Гісторыя ў асобах". Гэта літаратурна-публіцыстычныя расповеды пра знакамітых гістарычных дзеячаў. У выдавецтве "Беларусь" заснавалі серыю "Землякі". Выдавецтва Беларускага Экзархата выпускае духоўна-асветніцкую літаратуру. Цікавае іх пачынанне — серыя для дзяцей пра святых. Ужо з'явіліся кнігі пра Еўфрасінню Полацкую, князя Уладзіміра, апякунку студэнцтва св. Таццяну, пра Нестара Летапісца, іншых.

Не можа не радаваць рубрыка "Наш край" у часопісе "Полымя". Прыемна, што шмат увагі краязнаўству надае газета "СБ. Беларусь Сегодня". У рубрыцы "У пошуках страчанага" друкуюцца цудоўныя паштоўкі з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава. На іх — наша Бацькаўшчына сто і нават сто пяцьдзесят гадоў таму: храмы, палацы, краявіды... А побач з гэтым філакартычным багаццем паўстае тэкст краязнаўца, які распавядае пра тыя мясціны. А таксама новая рубрыка ў "СБ" — "Рыцары і дамы". Аўтары расказваюць пра вядомых гістарычных асоб. Хацелася, каб і астатнія газеты надавалі больш увагі краязнаўчым матэрыялам. Кацярына II некалі сказала, што Расія — гэта не краіна, а Расія — гэта цэлы сусвет. Я б гэтыя словы аднёс і да нашай Бацькаўшчыны. Беларусь — гэта наша ўсё. І трэба яе спазнаваць.



"Зямля пад белымі крыламі". Так натхнёна назваў свой нарыс пра Беларусь незабыўны Уладзімір Караткевіч. Нарыс, які адразу паўстаў у якасці газетнага эсэ. Затым гэта была публікацыя для ўкраінскіх старшакласнікаў. Менавіта па-ўкраінску спачатку і выйшла аднайменная кніга. А каб зрабіць беларускае выданне, Уладзімір Сямёнавіч яшчэ працаваў пяць гадоў. Пісьменнік ахапіў нашу гісторыю ад старажытных часоў і да XX стагоддзя. На старонках кнігі ён распавядае пра славутых дзеячаў, пра помнікі, свабодна апелюе гістарычнымі падзеямі і фактамі. Не засталіся ўбаку і наша прырода, апісанне характару беларуса. Анатоль Вербей назваў працу Караткевіча працягам публікацый Адама Кіркора ў "Живописной России", "Геаграфіі Беларусі" Аркадзя Смоліча. А цяпер мы, сучаснікі, распачынаючы ў газеце краязнаўчую рубрыку, паспрабуем працягнуць працу ўсіх папярэднікаў.

"Зямля пад белымі крыламі" — гэта праект, які вядзе Сяргей Макарэвіч. Рубрыка будзе з'яўляцца ў "ЛіМе" два разы на месяц. Калі Уладзімір Караткевіч пісаў сваю кнігу-нарыс адзін, адзін працаваў над "Геаграфіяй Беларусі" і Аркадзь Смоліч, то мы пастараемся аб'яднаць аўтараў з усіх куткоў Беларусі. У кожным раёне нашай краіны ёсць людзі, якія ведаюць усё пра свой край, — краязнаўцы. Некалі "Краязнаўчая газета" друкавала даведнік, у якім з нумара ў нумар знаёміла чытача з іх біяграфіямі. Мы пастараемся таксама прадставіць партрэты гэтых аматараў даўніны. Акрамя таго, што на старонках газеты будуць з'яўляцца іх артыкулы, кожны выпуск "Зямлі пад белымі крыламі" будзе пачынацца словам краязнаўцы. Іх думкі, меркаванні наконт пэўных падзеяў, фактаў, публікацый, знаходак. А вы, паважаны чытач, сачыце за ўсім і пішыце нам пра свае ўражанні і заўвагі.

Дарагая рэліквія

Сярод чарнавых запісаў, зробленых народным мастаком Беларусі В. Бялыніцкім-Бірулем у пяцідзесятых гадах мінулага стагоддзя для памяці, каб прыгадаць дарагія яму сустрэчы з мастакамі, пісьменнікамі, дзеячамі культуры, ёсць староначкі, прысвечаныя вялікаму рускаму мастаку І. Рэпіну. На жаль, Вітальду Каэтанавічу не ўдалося скончыць свае "Запіскі мастака", але тое, што ім напісана, дапаможа нам зразумець, якім плённым для яго быў уплыў І. Рэпіна.

"У жыцці кожнага з нас, мастакоў, — піша Бялыніцкі-Біруля, — бываюць вялікія перажыванні... Жыццё мастакоў складанае! ... Колькі творчай энергіі ідзе на адны замілаванні і расчараванні, і калі застаецца ў мастака пустата, спустошанасць, то не так і проста яе нечым запоўніць. Хіба мы не маем яркіх прыкладаў, калі мастак, разгубіўшыся, страціўшы ўсялякае валоданне сабой, падае духам... Вось тут і патрэбна нам падтрымка тых людзей, якіх мы цэнім, якім мы верым, і, вядома, што зусім добра, калі мы іх любім!

Вось такой для мяне было радасцю, маральнай падтрымкай атрымаць 5 кастрычніка 1909 года ліст ад Ілы Яфімавіча Рэпіна ў тыя цяжкія дзевяцісотыя гады. У дні маіх роздумаў, адчаю майго ліст прынёс мне суцяшэнне і радасць".

Што ж гэта за ліст? Абмяжуемся толькі кароткай вытрымкай з яго: "Дарагі Вітальд Каэтанавіч! Я многа думаў пра тую мастацкую ідэю Вашага пошуку новага ў сваёй творчасці. Вы неяк акрэслілі сэнс вашых задач, і мне яны ўявіліся такімі мужнымі. Ну, думаю, гэты мастак — шчаслівец... Чым больш цяжкі шлях да яго ідэалаў, тым вышэй ён стане ў мастацтве. І што перад гэтым уяўленнем усе жыццёвыя цяжкасці!

А я, дарэчы, думаю, што найвышэйшая ўзнагарода чалавеку на зямлі: уяўленне. І ў рай, і царства памерлых, і жыццё на ўсіх планетах, нават у пратуберанцах можа пабываць чалавек; нават самога Бога можа ён убачыць і нават чуць яго голас. Нічога не варта чалавеку пражыць мільён гадоў".

Працягваючы свае нататкі, Бялыніцкі-Біруля піша: "Я шчаслівы тым, што быў часам каля яго, чуў яго і ліставаўся з ім. Хіба гэта не стала для мяне той падтрымкай, што зноў вярнула мяне да мастацтва, да жыцця?!"

В. Бялыніцкі-Біруля ўсё сваё жыццё беражна захоўваў лісты І. Рэпіна як самую вялікую рэліквію.

Вячаслаў АФАНАСЬЕЎ

«Радзімазнаўства — светлая замова...»

..Дзісеншчына (цэнтр Міёры)... — стык розных культур, які пульсуе тут ад пары неаліту. Відаць, толькі на Дзісеншчыне — і нідзе больш — ляжыць ключ-адгадка на таямніцы беларускага этнасу.

Юрый ПАЦЮПА

Дзесяць гадоў таму я, ураджэнец Прыдзвінскага краю (Міёрскі раён), падахвоціўся стварыць у родным мястэчку Лявонпаль музей Радзімазнаўства. Цяпер у былой стражніцы, дзе размяшчаюцца бібліятэка, клуб, ёсць і зала з экспанатамі гэтага музея. А праз чатыры дамы ў даўняй вяночнай сядзібе каторы год існуе яго філіял — "Хатка бабкі Ядзвінні з роду Панізнікаў". Там наведвальнікі бачаць не толькі жорны, прадметы ткацтва і хатняга быту, але і іншыя скарбы народнага ўмельства. Цэнтрам культуры ў Лявонпалі апякуецца Таццяна Кліманская. Яна прымае экскурсантаў з Мінска, Магілёва, Санкт-Пецярбурга, гасцей з Верхнядзвінска, Бабруйска, Масквы...

Як жа праходзіла святкаванне 10-годдзя музея? Напярэдадні ў клубе адкрылася выстава "Культурна-гістарычная спадчына Лапацінскіх Прыдзвінскага краю" на палотнах мастакоў Валерыя Шчаснага, Сяргея Сотнікава, Наталлі Пяўцовай, Ігара Кучарэнкі. Гэта своеасаблівая згадка аб нядаўнім пленэры маладых мастакоў "У пошуках Атлантыды", які праходзіў тут.

Юбілейны дзень пачаўся з экскурсіі па музеі. Прысутныя разглядалі абярэг бабкі Параскі і франкузскі дыван майго дзядзькі Аляксандра, драўляны ровар Вінцука Адамовіча і рукадзелле сястры Ніны, старыя кнігі. Сярод экспанатаў таксама — дакументы часоў Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі.

Мы турбуемся аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны. 40 гадоў таму я запісаў на магнітафон галасы жыхароў Лявонпаля і навакольных вёсак. Фальклорныя творы, пярліны паэтычнай народнай творчасці слухалі ўдзельнікі свята. Пацешылі прысутных мелодыі, запісаныя ў Лявонпалі летам 1969 года на вяселлі аднакласніцы Жэні Шадурскай, — "Марш для маладых", "Полька пад лён" у выкананні сямейнага ансамбля Рагоўскіх з в. Ліпава. Так што ёсць матэрыял для будучых этнапедагогаў.

Спадчына вызначае будучыню. І тут я хацеў бы сказаць пра чалавека, які працуе для наступных пакаленняў. Гэта Аляксандр Анісковіч. Ён прывёз з Віцебска новыя мемарыяльныя знакі ў Лявонпаль. Цяпер шыльды з'явіліся на калоне ў гонар Канстытуцыі Рэчы Паспалітай, на "Хаце бабкі Ядзвінні", сядзібнай афіцыне Лапацінскіх. А па дарозе да графскага палаца быў пастаўлены металічны слуп, стылізаваны пад капліцу.

Лявонпальцам варта запомніць зычэнні Рыгора Барадуліна, запісаныя ім: "Музею Радзімазнаўства — каб рос!" У кнізе наведвальнікаў музея ёсць запіса краязнаўца з Ваўкавышчыны Міхася Верацілы, які прыязджаў дзевяць гадоў таму на святкаванне 1000-годдзя Лявонпаля. "...будзіць, раскалыхваць памяць (бо без памяці няма нацыі!), адраджаць нашу багацейшую гісторыю, культуру", — такія пажаданні краязнаўцы. Многае зроблена для гэтага ў Лявонпалі. Таму і гучалі на святкаванні 10-годдзя музея Радзімазнаўства словы падзякі за плённую працу па захаванні і папулярызацыі культурнай спадчыны рэгіёна ад старшыні Беларускага фонду культуры Уладзіміра Гілепа, старшыні Міёрскага райвыканкама Ігара Кузняцова. А старшыня Далгінаўскага сельсавета Таццяна Смулька паабяцала паспрыяць таму, каб музею Радзімазнаўства надалі званне народнага.

Удзел у свяце таксама бралі музыка Андрэй Плясанаў, намеснік галоўнага рэдактара "Краязнаўчай газеты" Уладзімір Пучынскі, краязнаўцы Антон Бубала, Людміла Гагалінская, Пётр Квяцінскі, Віктар Ермалёнак.

Усцешаны, што радаводныя вытокі на Прыдзвінні віруюць. А якія надзеі пакінула святкаванне?

Запалены кадзільні
Над спадчынай жытла.
Была малой радзімай,
а з намі — узрасла.
І стане абнадзейнай,
зямлёй не на пастой, —
айчынай непадзельнай,
Вялікаю, Святой.

Сяргей ПАНІЗНІК

На здымку: удзельнікі святкавання.

Істотныя набыткі

У рамках Года роднай зямлі Магілёўская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна працягвае дзейнасць па папаўненню гісторыка-дакументальнай спадчыны роднага краю. Вынікам плённага супрацоўніцтва з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі з'явіліся набыццё 43 рарытэтных кніг краязнаўчай тэматыкі — электронных копій выданняў XIX — пачатку XX стст., якія з'яўляюцца каштоўнымі крыніцамі для вывучэння гісторыі Магілёва і Магілёўскай губерні. Цяпер Нацыянальная бібліятэка Беларусі аблічбавала для магілёўскіх чытачоў 30 краязнаўчых дакументаў, частку з якіх перадала бязвыплатна. Сярод набытых рарытэтаў — "Обзор Могилевской губернии..." за 1881 г. і 1883 г. Гэта штогадовае даведачнае выданне аб адміністрацыйным і гаспадарчым жыцці губерні, якое змяшчае даведкі аб прамысловасці, гандлі, сельскай гаспадарцы, народнай асвеце за мінулы год. Усяго было выдадзена 29 "Обзоров...", 16 з якіх зараз захоўваюцца ў краязнаўчым фондзе абласной бібліятэкі. Карыстальнікі бібліятэкі знойдуць шмат цікавай інфармацыі па гісторыі краю ў наступных кнігах: "Городские поселения в Российской империи. Могилёвская губерния" (1863), Л. Галынец "К изучению в медико-топографическом и статистическом отношении губернского города Могилёва" (1887), "Список населённых мест Могилёвской губернии" (1910), "Отчёт Могилёвской Александринской общины сестёр милосердия Российского общества Красного Креста за 1897 год" (1897), "Столетие существования Могилёвской духовной семинарии: 1885 — 1885" (1885), "Список церковноприходских школ и школ грамоты Могилёвской епархии", "Описание Могилёвского музея" М. В. Фурсова, 6 выпускаў "Белорусского сборника" Еўдакіма Раманава і яго "Указатель к неофициальной части "Могилёвских губернских ведомостей" с 1839 по 1898 год" (1899), дзе друкаваліся краязнаўчыя матэрыялы па археалогіі, гісторыі, этнаграфіі, мовазнаўстве, народным тэатры. З некаторымі артыкуламі газеты можна пазнаёміцца ў кнізе Н. А. Озерава "Могилёвские губернские ведомости за 1838 — 1844 годы" (1905).

Знамянальна, што сёлетнім юбілейным для Магілёўскай мужчынскай гімназіі годам бібліятэка набыла два выданні пачатку XX стагоддзя, прысвечаныя старэйшай навучальнай установе Магілёўшчыны, якія дапамогуць глыбей вывучаць гісторыю развіцця народнай асветы на Магілёўшчыне.

Тамара КАЛІНА,
загадчык аддзела Магілёўскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна

Пошта прынесла ліст з чэрвеньскай вёсачкі Ведрыца. Напісаў: "вёсачка"... А пэўна ж, зусім не вёсачка, а вёска. Багатае сваёю прасторай паселішча. Трэба пабываць у ім, прайсціся яго вуліцамі, вулачкамі, агледзець з масточка вадзяную плынь ракі Ведрыца. Угледзецца ў вокны ціхіх хат, паслухаць тутэйшую цішыню, каб зразумець, якой энергетыкай валодае гэтае месца. І паверце, што пасля адной-дзвюх вандровак ужо болей не зможаце раўнадушна абмінаць Ведрыцу.

Летапісец Ведрыцы

...А ліст мне прыйшоў ад Пракопа Сакава, настаўніка беларускай мовы і літаратуры Хутарскага дзіцячага сада-сярэдняй школы. Праўда, прадстаўляючыся, Пракоп Мікалаевіч гаворыць, што выкладае родную мову. Скажа так — і бачыш, як па-асабліваму свецяцца яго вочы. Пэўна ж, ёсць істотная розніца ў гэтым удакладненні.

Пра тое, які Сакаў прафесіянал, гавораць многія акалічнасці. Па-першае, сам факт, што Пракоп Мікалаевіч — настаўнік вышэйшай катэгорыі. Па-другое, узровень ведаў яго вучняў, іх адзнакі па мове і літаратуры, зароблены па-за школай, калі яны становяцца студэнтамі. А яшчэ такая дэталь, асабіста мне яна падаецца досыць яскравай характарыстыкай: дома ў Сакавых за гады настаўніцтва сабралася выдатная бібліятэка беларускай літаратуры. Найперш — паэзіі, што, між іншым, таксама паказальна.

Але ёсць у таленавітага і дасведчанага педагога яшчэ адно важкае захапленне: збіранне гісторыі роднай школы, роднай вёскі. Хутарская школа, чыя вядомасць сягае ўжо за 140 гадоў, здаўна месціцца ў вёсцы Ведрыца. Сакаў родам з суседняга Бярэзінскага раёна. А вось як прыехаў сюды пасля заканчэння педінстытута — так і прыкіпеў на чатыры дзесяцігоддзі. І ніколькі пра тое не шкадуе.

А шукаць, даследаваць было што. І школа багатая гісторыяй, і ваколіцы здзіўляюць не толькі харастом, але і шматтраннасцю самых розных гістарычных падзей. А лёсы людзей, звязаных з Ведрыцай, з Хутарам. Па іх біяграфіях можна пісаць летапіс нашай Айчыны.

На школьным падворку растуць тры дубочкі. Іх хутарскія школьнікі пасадзілі ў гонар сваіх папярэднікаў — братоў Сікорскіх. Яны — выпускнікі даваеннага часу. Мікалай большую частку жыцця правёў у Маскве, пэўны час займаў пасаду дырэктара Дзяржаўнай бібліятэкі СССР імя У. І. Леніна — славутай і вядомай "Ленінкі". Усевалад быў рэктарам Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Генадзь, пайшоўшы ў партызаны, загінуў пры выкананні баявога задання. Па-

На школьным падворку растуць тры дубочкі. Іх хутарскія школьнікі пасадзілі ў гонар сваіх папярэднікаў — братоў Сікорскіх. Яны — выпускнікі даваеннага часу. Мікалай большую частку жыцця правёў у Маскве, пэўны час займаў пасаду дырэктара Дзяржаўнай бібліятэкі СССР імя У. І. Леніна — славутай і вядомай "Ленінкі". Усевалад быў рэктарам Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Генадзь, пайшоўшы ў партызаны, загінуў пры выкананні баявога задання.

хаваны непадалёку ад роднай школы. Біяграфіі старэйшых братоў Сікорскіх добра вядомыя, увайшлі ў многія даведнікі і энцыклапедыі. Канечне ж, знайшлося месца для расповеда пра Сікорскіх і на старонках рафёнай гісторыка-дакументальнай хронікі "Памяць". Ды ў школе, на шчасце, не абмежаваліся сухімі старонкамі. Разам з Пракопам Мікалаевічам аглядаем утульны музей, якому адведзены асобны класны пакой.

Сярод іншых кніг, фотаздымкаў, дакументаў — вядомы ці не ўсім выдавецкім работнікам грунтоўны дапаможнік "Теория и практика редактирования". Гэты сур'ёзны том у Ведрыцу даслаў сам аўтар — Мікалай Сікорскі, які заўсёды адгукаўся на лісты з Чэрвеньшчыны. І калі да вучонага звярнуліся з просьбай удакладніць некаторыя моманты з біяграфіі, то Мікалай Міхайлавіч адразу ж усё падрабязна напісаў. Між іншым, не абышлося без істотных паправак да афіцыйнай біяграфіі. Адну з іх асабліва варта заўважыць і раённаму музею, і ўвогуле біёграфам Сікорскага. Вось што піша з Масквы ў Хутарскую школу Мікалай Міхайлавіч: "Я родился 17 апреля (нового стиля) 1922 года (а ў "Памяці" чытаем: "Сікорскі Мікалай Міхайлавіч. Кандыдат гістарычных навук, доктар філалагічных навук (1972), прафесар (1966). Нарадзіўся 4 красавіка 1919 г. у в. Хутар..." Але ж нам знаёма і другое сведчанне — самога вучонага. Сікорскі тлумачыць, як узнікла новая дата. — **М. М.**). Дата рождения "1919 год" возникла случайно, во время оформления документов в госпитале. Я тогда не придал значения этому факту, а после, когда эта дата утвердилась, не было времени, да и желания "восстанавливать" исторический факт".

Па просьбе школьнікаў і настаўнікаў з Ведрыцы Мікалай Сікорскі ўзгадаў і шмат што пра свайго бацьку, які ў перадваенныя гады дырэктарстваваў у Хутарскай школе. "Мой отец Сикорский Михаил Иванович родился 8 ноября 1893 года в деревне Поляны Руденского района Минской области... Моя мама — Сикорская Евгения Константиновна... родилась в 1903 году в селе Беличаны Березинского района Минской области... В 1920 году Михаил Иванович Сикорский и Евгения Константиновна Захаревич... вступили в брак и вскоре переехали на жительство в село Хутор, точнее в поселок Красная Смена (ныне — поселок Красино), где получили участок земли и построили дом...". Пра гэта старэйшы з братоў Сікорскіх напісаў у родную школу 3 красавіка 1993 года.

Увогуле краязнаўчая скарбніца Хутарскай школы падзелена на тры часткі. У першай — этнаграфічны расповед пра Ведрыцу, Хутар, іх ваколіцы. Другі раздзел расказвае пра род Сікорскіх. Трэцяя частка прысвечана пісьменніку-земляку Міхасю Пянкрату. Дарэчы, адна з яго кніг носіць назву "Ведрыцкія напевы".

Безумоўна, ёсць у музеі і іншыя матэрыялы, якія выходзяць за межы згаданых тэматычных абсягаў. Але ж акцэнт зроблены на тры асноўных экспазіцыйных блокі. У гэтым, лічыць Пракоп Сакаў, ёсць свая логіка. Этнаграфічныя зборы, прадметы матэрыяльнай культуры Беларусі — своеасаблівы дадатковы матэрыял для вывучэння асобных параграфаў па гісторыі. А што да жыццяпісу паэта і празаіка Міхася Пянкрата, то аглядаючы экспазіцыю, прысвечаную яму, прыходзіш да наступнай высновы: якраз у такіх мясцовых музеях захоўваецца памяць пра многіх творцаў, якія сціпла працавалі ў літаратуры.

...У свой час Міхась Пянкрат назваў Пракопа Сакава летапісцам Ведрыцы. І як з гэтым не пагадзіцца?

Мікола МІРШЧЫНА

Вытокі

Мабыць, кожнаму чалавеку неабыякава гісторыя ўласнага роду. Думаю, многія хацелі б ведаць, кім былі іх далёкія продкі. Шмат каму цікава, наколькі глыбока пусціла карэнне ўласнае генеалагічнае дрэва. Якое зерне нашага роду было пасаджана стагоддзі таму старажытнымі папярэднікамі? Якую частку гэтага дрэва складаем мы і нашы сваякі-сучаснікі? Колькі гадоў наканавана жыць гэтаму генеалагічнаму дрэву?

Хто ёсць хто?

На жаль, далёка не ўсе ведаюць гісторыю свайго роду больш за два-тры папярэднія пакаленні. Людзі, неабыякавыя да ўласнага радаводу, імкнуцца сабраць як мага больш звестак пра сваіх продкаў. Асабліва, калі папярэднікі былі вядомымі людзьмі, слыннымі дзеячамі альбо мелі высакароднае паходжанне. Апошнім часам стала модна складаць радаводы, даследаваць гісторыю сваёй сям'і. Некаторыя згадваюць амаль забытыя сямейныя расповеды пра шляхетных прадзедаў, іншыя, выпадкова даведваюцца, што носяць шляхетныя прозвішчы, і гэта дае імпульс да таго, каб зазірнуць углыб стагоддзяў і дазнацца: твае продкі — гэта тыя самыя шляхціцы альбо звычайныя цёзкі.

Распачынаючы гэтую тэму, давялося сустрэць людзей, цікавасць якіх да гісторыі роду абудзіў праект "Хто ёсць хто? Спадчыннікі беларускай шляхты", які некалькі гадоў таму распачало выдавецтва "Энцыклапедыкс". Аўтар і кіраўнік праекта — Ігар Чакалаў-Шыдлоўскі. Сёлета арганізацыя набыла статус грамадскага аб'яднання і атрымала назву "Мінскае згуртаванне нашчадкаў шляхты і дваранства".

Праект прадугледжвае вывучэнне родавай прыналежнасці да высакароднага саслоўя, пошук родавых гербаў і рэканструкцыю грамат, якія пацвярджаюць шляхецтва. Яго мэта — узмацненне цікавасці да гісторыі Беларусі, дэмакратызаванне агульнасці гістарычных традыцый славянскіх народаў, аб'яднанне нашчадкаў старажытных шляхецкіх родаў, адраджэнне маральна-этычных традыцый дваранства.

З дапамогай праекта "Спадчыннікі беларускай шляхты" кожны, хто жадае, можа пачаць даследаваць свой радавод. Першы крок, які дапамагае зрабіць Мінскае згуртаванне нашчадкаў шляхты і дваранства, — гэта праверка прозвішча кліента на прадмет шляхецтва. Крыніцамі інфармацыі служаць энцыклапедыя старажытных шляхецкіх родаў і спісы беларускай шляхты (па архіўных дадзеных). Пры станоўчым выніку па заказе кліента спецыялісты праекта займаюцца рэканструкцыяй грамат. У выніку заказчык атрымлівае грамату і патэнт, якія змяшчаюць прозвішча, родавы герб і яго легенду.

Для адных кліентаў дастаткова і гэтай цікавай інфармацыі, іншыя ж пачынаюць складаць сваё генеалагічнае дрэва і больш дасканала вывучаць уласны радавод. Падрабязныя звесткі і дакументальныя пацвярджэнні можна атрымаць у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі.

Паўсядзённая праца Мінскага згуртавання нашчадкаў шляхты і дваранства заключаецца ў даследаванні пытанняў генеалогіі і геральдыкі, арганізацыі навуковых і культурных мерапрыемстваў, выстаў і канферэнцый. У бліжэйшы час плануецца правесці святочную прэзентацыю грамадскага аб'яднання, на якім і сустрэнуцца нашчадкі старажытных шляхетных родаў Беларусі.

Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ

На здымках: энцыклапедыя шляхецкіх родаў (Варшава, 1839 год); старшыня Мінскага згуртавання нашчадкаў шляхты і дваранства Ігар Чакалаў-Шыдлоўскі.

Фота аўтара і Яўгена Падгайскага

Што абурыла Булгарына?

Вясной 1835 года Фадзей Булгарын здзейсніў невялікую паездку па Беларусі. Вынікам яе сталі "Путевые заметки...", што Фадзей Венедзіктавіч друкаваў у сваёй газеце "Северная пчела", якую выдаваў сумесна з Н. Грэчам.

Расказваючы пра наведванне магілёўскай гімназіі, Ф. Булгарын піша: *"Дзіўна, што тут вымушаны чытаць "Телескоп" і "Молву". Якое ўяўленне юнакі атрымаюць пра рускую славеснасць, пра аўтарскую годнасць з гэтых двух часопісаў, напоўненых ад пачатку да канца лаянкай, недарэчнымі выхадкамі, насмешкамі, грубасцямі і асобамі, што супраць пісьменнікаў нетэлескопскага прыхода! Душэўна шкадуем юнакоў і іх настаўнікаў!"*

Прычыны такога стаўлення Ф. Булгарына да ўказаных выданняў, заснавальнікам і рэдактарам якіх быў прафесар Маскоўскага універсітэта Мікалай Іванавіч Надзеждзін (дарэчы, "Молва" — не часопіс, а газета, дакладней, дадатак да часопіса "Телескоп") — суб'ектыўныя і абумоўленыя наступнымі прычынамі. У 1829 годзн М. Надзеждзін меў неасцярожнасць пакрытыкаваць раман Булгарына "Іван Выжыгін", у 1831 годзе ў адным з нумароў часопіса "Телескоп" з'явіўся артыкул пад назвай "Некалькі слоў пра мезенец Булгарына і пра іншае" за подпісам нейкага Феафілакта Касічкіна, якім аказаўся Аляксандр Пушкін. І нарэшце, ужо ў 1834 годзе ў газеце "Молва" з'явіліся "Літаратурныя летуценні" маладога крытыка-пачаткоўца Вісарыёна Бялінскага, які ўвогуле рэзка адмоўна характарызаваў усе раманы Фадзея Венедзіктавіча.

Застаецца адказаць яшчэ на адно пытанне: якім чынам часопіс "Телескоп" і газета "Молва" апынуліся ў беларускай правінцыі, ды яшчэ і ў навучальных установах?

Магчыма, падказка палягае ў тым, што ў гэты перыяд папячыцелем Беларускай вучэбнай акругі быў вядомы дзеяч асветы Р. Карташэўскі (1777 — 1840). Паводле службовага абавязку, Рыгор Іванавіч павінен быў ажыццяўляць русіфікатарскую палітыку царызму ў Паўночна-Заходнім краі. Аднак ён шмат рабіў і такога, што разыходзілася з афіцыйнымі ўстаноўкамі і мела прагрэсіўнае значэнне для развіцця адукацыі ў акрузе. Так, яму ўдалося атрымаць дазвол ад урада на падрыхтоўку "за казённы кошт" 50 юнакоў з Беларусі ў Пецярбургскім і Маскоўскім універсітэтах для іх наступнай дзейнасці ў краі.

Р. Карташэўскі сябраваў з М. Надзеждзіным, часта наведваў яго падчас сваіх камандзіровак у Маскву. Верагодна, па просьбе М. Надзеждзіна Р. Карташэўскі на працягу некалькіх гадоў (з 1831 па 1835) рэкамендаваў сваім інспектарам, дырэктарам губернскіх гімназій, павятовых вучэльняў і народных школ праводзіць сярод настаўнікаў, а таксама сярод заможных бацькоў навучэнцаў падпіску на часопіс "Телескоп" і газету "Молва", што зрабіла гэтыя выданні шырока папулярнымі сярод інтэлігенцыі ўсёй Беларусі. Пра гэта, дарэчы, сведчыць змешчаная ў газеце "Молва" (№ 21 за 1835 год) народная "Беларуская песня" з даволі вялікім да яе каментарыем, дзе ў прыватнасці, гаворыцца: *"Зазначу, дарэчы, што беларуская гаворка зусім не літоўская, як многія памылкова сцвярджаюць, і не тая, якая была ва ўжыванні пісьмовым у XVI ст.; таму што пісьмовая беларуская мова ёсць нішто іншае, як польская мова з рускімі формамі, а сапраўдная беларуская мова, як можна бачыць з гэтай песні, абсалютна не польская. Аднолькавым чынам яе нельга назваць і "руськай", як называе яе спадар Грэч у сваім "Вопыце". "Руськая", паводле беларускага вымаўлення, значыць "руская"<...> і тое ў прастамоў'і, і паказвае на блізкую роднасць Беларусі з Вялікарусіяй, хаця беларус і не скажа пра масквіча, што ён размаўляе "по-руськи", але па-маскоўску. Беларус К. К."*

Аўтар гэтай нататкі, як бачым, схаваўся за псеўданімам. Раскрыць яго, мабыць, дапамогуць далейшыя пошукі краязнаўцаў.

Уладзімір ЧУКАЛІН

«Паэт — Боская птушка...»

Сыс — гэта гучыць як "SOS"...

Алесь Спіцын

Анатолю Сысу магло б споўніцца 50... Паэту, імя якога не пакіне абыякавым нікога, незалежна ад стаўлення да яго. Чалавеку, чый зямны вобраз абкружаны незвычайным арэолам легенд і міфаў, большая частка якіх заснавана на разнастайных праявах яго надзвычай выразнага творчага тэмпераменту. Самотны пры жыцці (бо, нягледзячы на велізарную колькасць прыяцеляў, сапраўднай блізкай душы побач з ім не было, была толькі каханка-Паэзія, ды і тая ў апошнія гады яго не песціла ўвагай), пасля смерці ён раптам стаў лепшым сябрам тых, хто пры жыцці абыходзіў яго за сто крокаў, пазбягаючы ягонага з'едлівага сарказму, на самым дне якога хавалася ісціна. Жоўтая прэса пачала прыпісваць паэту заганныя схільнасці, а найлепшай яго рысай вызначыла ўменне "стрыгчы сяброў". Але нешматлікія сапраўдныя сябры былі, і яны застаюцца. Яны выдалі ў 2006 годзе гожы томік выбранага з творчай спадчыны паэта пад назвай "Лён", уключылі яго вершы ў калектыўны зборнік, што выйшаў у выдавецтве "Мастацкая літаратура", зусім нядаўна пабачылі свет кніга выбранага Анатоля Сыса "Алаіза" і зборнік вершаў-прысвячэнняў паэту "Ягамосць".

Калі ў гаворцы пра беларускую паэзію канца XX стагоддзя мы спрабуем вызначыць лепшага паэта, у творчасці якога былі б сканцэнтраваны і традыцыя, і сучасныя павевы, і каб усё гэта — у звязку з магутнай творчай і чалавечай энергіяй, то больш падыходзячага прыкладу, чым Анатоль Сыс, не знайсці. Іх, пакліканых у канцы 80-х — пачатку 90-х гадоў хваляй Адраджэння, было шмат, але абраных у рэшце рэшт аказалася мала. Жыццё — жорсткая рэч і, як гэта ні сумна, нават у творчым асяродку ўсім кіруе натуральны адбор. Мацнейшыя выжылі, але гэта не азначае, што яны адстаялі сваю правату. Каго знішчыла імкненне да славы, каго — пакланенне мамоне, а большасць патрапіла ў пастку палітычных ідэй, аднолькава згубных для сапраўднага творцы незалежна ад іх абгрунтаванасці і значнасці.

І як існы паэт, Анатоль Сыс разумеў, што адзін геніяльны, шчыра створаны верш нашмат большы і важнейшы за ўсе на свеце ідэалогіі разам узятыя. Улада, кіраўнікі, палітычныя партыі прыходзяць і сыходзяць, а паэты застануцца.

Але, на жаль (або, на шчасце), тварэнне легенды — працэс, лейцы якога ніхто ў рукі ўзяць не можа, як бы не хацеў. Уведзены Полем Верленам напрыканцы XIX стагоддзя ва ўжытак тэрмін "праклятыя паэты" надзіва арганічна прыжыўся на беларускай глебе. І менавіта Анатоль Сыс найперш асацыіруецца ў свядомасці з вобразам адрынутага грамадствам і паплечнікамі творцы, гэткага бажавольнага прарока, аголенага і бруднага. Хоць колькі іх у айчыннай літаратуры было і будзе — падобных да яго і не вельмі, але лучыць іх аднолькавая беспрытульнасць і неўладкаванасць. Ці так гэта насамрэч? А мо гэта проста ўжо вышэй згаданы спантанны працэс міфатворчасці, які нікому не спыніць?

Ёсць і іншы пункт гледжання: паэт сам стварае міф пра сябе, ад пачатку да канца. У такім выпадку Анатоль Сыс мусіў сам сябе прынесці ў ахвяру, але ў ахвяру чаму, каму? Таму, у што не верыў сам? Нешта не стасуецца ў такой гіпотэзы з логікай. Альбо гэта прыклад святога вар'яцтва? Зноў мы вяртаемся да вобраза паэта-бажаволка...

На мой погляд, тут, як і паўсюль у жыцці, на самай справе ўсё ёсць прасцей, чым здаецца. Як і прыхільнікі Сысавай паэзіі, так і іх апаненты вельмі радыкальныя ў сваіх выказваннях, яны забываюць у сваіх разважаннях пра фактар "жывога чалавека", які з'яўляецца адзінкай вымярэння вартаснасці чалавечай асобы там, дзе заканчваюцца ўсе магчымыя аргументы.

На дапамогу прыходзіць аўтарскае — не апраўданне, хутчэй: канстатацыя факта:

Я трапіў у сіло журбы,
я сам у гэтым вінаваты.

Можна шмат разважаць пра той момант, калі ў паэтавай душы адбыўся фатальны пералом, які незваротна падзяліў яго жыццё на "да" і "пасля", калі ён адчуў гэтую стому ад бессэнсоўнасці (ці ***ga*** бессэнсоўнасці), якая наблізіла ў рэшце рэшт сумнавядомы трагічны фінал. Можна тлумачыць незвычайнае жыццё гэтага незвычайнага чалавека, кіруючыся гіпотэзамі і здагадкамі, тэорыямі і практыкай, але ісціны тут ужо не дасягне ніхто.

Анатоль Сыс сам, сваёй творчасцю жорстка размежаваў зямное і нябёснае, паказаўшы нам прыклад немагчымасці суіснавання ў адной асобе паспяховага, задаволенага жыццём і сабой чалавека і — паэта, выключна духоўнай асобы. Гэта магчыма, бадай, у ідэальным, утапічным грамадстве, але толькі не ў нас. "Праклятыя паэты" былі заўжды і будуць скрозь, пакуль існуе чалавецтва — сярод музыкаў, мастакоў, сярод прадстаўнікоў усіх сфер чалавечай дзейнасці, якія выходзяць за межы простага спажывання, дзе пачынаецца эстэтычнае узвышэнне над побытам.

Таленавітыя творцы — яны не святыя і не грэшнікі, яны звычайныя людзі, адрозныя ад астатніх толькі аголенымі нервамі. Сапраўдны паэт можа агрубець з часам, кінуць пісаць вершы, мастак можа перастаць маляваць карціны, мелодыя можа пакінуць душу кампазітара, але аголеныя зоны душы застануцца і будуць муляць праз усё астатняе жыццё, нагадваючы пра страчаны рай, дзе толькі і расце адзінае ў свеце дрэва спазнання дабра і ліха. Усё астатняе — марная мітусня і пыл, прыходзіць і адыходзіць, як дзень і ноч, як дождж і вецер.

Па сутнасці, Анатоль Сыс выканаў сваю праграму вельмі хутка, за якое дзесяцігоддзе, і далейшае яго існаванне больш нагадвала агонію чалавека смяротна параненага. З уласцівай яму бравурнасцю Сыс называў сябе ў вершах "найпершым жыццялюбам", даваў у інтэрв'ю аптымістычныя прагнозы наконт новага вітка ў сваёй творчасці, рабіў іншыя заявы падобнага кшталту, але хутчэй за ўсё сам, у глыбіні душы, якая была непадуладная алкагольным ілюзіям, разумеў марнасць (а мо нават і непатрэбнасць) гэткіх спадзяванняў.

У хвіліны адчаю, бачачы аслепленых уяўнымі славай і талентам калег, ён выкрыкваў самыя крыўдныя для іх словы, якія толькі адны і маглі ўзварушыць іх закасцянелую ўпэўненасць ва ўласнай велічы. "Вы ўсе пралятаеце!.." — гучала скрозь у рэдакцыйных кабінетах і калідорах, у перапоўненых залах юбілейных вечарын, у барах, скверах, парках, кватэрах. Пісьменнікі — людзі помслівыя, гэтыя словы Сысу так ніколі і не былі дараваныя, нават пасля смерці ў авечых скурах лепшых сяброў яны працягваюць яму помсціць, імкнучыся адцягнуць той момант, калі слава пра талент Анатоля Сыса пераўзыдзе іх прыжыццёвую якую-кольвек вядомасць. Але яны ўжо даўно пралічыліся — Сыс памёр, няхай жыве Сыс! У Вечнасці няма часу. Сёння, заўтра — няважна. Найвялікшы паэтычны акт ужо выкананы, напаўжывыя вусны ўжо выдыхнулі старажытнае "Адбылося...", а свет прычакаў яшчэ аднаго ўзнясення.

І яшчэ: сапраўдны паэт — гэта абавязкова патрыёт сваёй Радзімы. Немагчыма паверыць у талент творцы, які аб'яўляе сябе касмапалітам. У плане любові да Радзімы, слугавання ёй Сыс — бездакорны. Ён зрабіў для Беларусі ў тысячу разоў больш, чым усе сучасныя "змагары" разам узятыя. Бо ён рабіў гэта бескарыслівa, без аніякага разліку.

Паўстагоддзя тамуУсвет выкінуў Паэта на свой "чырвоны, гарачы бераг", ля яго, паўз яго на шалёнай хуткасці пранесліся падзеі, людзі, ідэі... Ён прапусціў праз сваё закратаванае золатам сэрца гэтую неверагодную, перапоўненую паэзіяй і таямніцамі містэрыю, імя якой — Жыццё. Ён увасобіў яе ў вершах, як мог. А мог ён многа.

Янка ЛАЙКОЎ

Помнічкі

* * *

Купрэеў даслаў у канверце разам з лістом тры восеньскія лісточкі з Белавежскай пушчы для дачкі... На такое здольны, бадай, яшчэ Толя Сыс. Хоць, па першым уражанні, якраз ад іх такога і прадбачыць немагчыма.

* * *

Сыс нарадзіўся з хаосу, і хоча з аскепкаў хаосу склаці люстэрка, каб убачыць у ім адлюстраванне сваёй гармоніі, пра якую ён нічога не ведае. Ён толькі ведае, што яна павінна быць...

* * *

Каб напісаць вершы, больш за тое, стварыць паэзію, трэба жыць надзвычайным, неардынарным жыццём, перш за ўсё ўнутраным. І дух, і быццё, у рэшце рэшт, павінны быць на ўзроўні паэтычнай метафары...

У наш час гэтаму адпавядаюць у пэўнай меры, бадай, толькі Сыс ды Купрэеў... Адпавядалі Стральцоў і Караткевіч...

* * *

На вечарыне "Бум-Бам-Літа" ў Доме літаратара было шмат публікі і праз край слоўнага маразму, але не было сумна.

Седзячы побач са мной, сакратар СП Алесь Пісьмянкоў усё хваляваўся, што няма Сыса, які сарваў бы, як заўжды, і гэтую вечарыну. Я сказаў яму, што Сыс тут, а ён усё не мог паверыць.

Наіўны Алесь, хіба можа Сыс сарваць такую бедламную вечарыну?! Сваім з'яўленнем на сцэне ён толькі ўпрыгожыў бы яе. Але — не, дадаваць свой аўтарытэт у гэтай справе іншым Анатоль Ціханавіч і не думаў, хоць, пэўна ж, і бумбамлітаўцы, як і Пісьмянкоў, на тое падсвядома спадзяваліся...

Тым большы *гонар* Сысу...

* * *

Зусім нечакана завітаў на кватэру Сыс. Цвярозы, элегантны, падкрэслена інтэлігентны... павіншаваў жонку і дачку з жаночым святам, падараваў ім два аранжавыя апельсіны. Выпіў шклянку кока-колы. Акінуў вокам кватэру, упэўніўшыся, што падараваная ім на ўлазіны карціна тэлевізійнай мастачкі Алены Каравай з выявай туманнай Каложы на месцы, спешна адкланяўся...

"Дурдом", — падумаў я, самотна перажоўваючы яго экстравагантны цвярозапрыстойны візіт.

Зрэшты, на тое і паэты, каб зрэдку здзіўляць сваёй неардынарнай прысутнасцю нашу празаічную будзённасць...

* * *

Можаш любіць Разанава, можаш Някляева... А Сыс цябе сам палюбіць...

* * *

Зайшоў у рэдакцыю "Крыніцы" Сыс. Выцвяражаны. Выветраны. Паголены. Чыста апрануты.

Гамонім праз пень-калоду... Больш маўчым... Палім... П'ём гарбату... Кажу яму: "Давай, Анатоль, зробім з табой гутарку ды дадзім нарэшце ў нашым часопісе тваю неардынарную "постаць"...

Іранічна-змрочна фыркае: якая "постаць" (з агідай да сябе), якая гутарка? Пра што?! Пра мае запоі ды вычварэнні?..

Ды не — кажу, — навошта пра непатрэбшчыну... пра літаратуру, пра паэзію паразважаем на сваім узроўні...

— Што я табе скажу пра літаратуру? Павер мне, я пра яе нічога не ведаю...

Пайшоў, пакінуўшы мне на роздум нейкае ідыёцкае адчуванне ўласнай недасканаласці. Уся праблема чалавека — у Слове.

* * *

Гэты ўспамін пераважнай сутнасцю сваёй належыць крытыку Генадзю Шупеньку. Аднойчы, падбіваючы яго ў тэлефоннай размове да напісання артыкула пра паэзію Анатоля Сыса, я, відаць, сапсаваў яму і без таго не лепшы настрой.

"А табе хіба яшчэ не даводзілася чуць такое? — пытаецца ён і, пачуўшы мой неўразумелы мык, распавядае. — Ідзём гэта мы неяк пішучай кампаніяй у Дом літаратара. Насустрач — Сыс. Ужо ў добрым стане: "О-о-о!!! Каго бачу!.."

Ну, абдымкі, прыпаданне да ўпалых грудзей... чалавек збоку падумаў бы, што гэта гістарычна-слёзная сустрэча пасля доўгай ростані... Так сустракаюць у нас толькі салдат пасля дэмабілізацыі альбо рыштантаў пасля турмы... Ну, няважна. Працягвае ўрэшце руку і мне. "Ты мяне ведаеш?" — звяртаецца да мяне з унутранай упэўненасцю, што, вядома ж, ведаю...

А як жа, кажу, хто ж Сыса не ведае! Дабрэе на вачах...

І, раптам, пры ўсіх выпальвае самазадаволена: "І я цябе ведаю! Ты — Шкраба". Неба памеркла ў маіх вачах... Так што, прабач, браце, сапраўднага Сыса я пакуль яшчэ не ведаю, як жа я буду пісаць пра яго..."

Паклаў я трубку, ды сам себе маракую: вось, здавалася б, прасталінейны Сыс, а захаваў-такі крывізну іранічнага мыслення...

* * *

Выпадкова сустрэўся з Сысам каля лімаўскіх дзвярэй. Выпіты, худы, разбэрсаны, тужліва-апатычны... Коратка падстрыжаны, на галаве — доўгі шнар... Зусім сапсеў чалавек.

Не магу даўмецца, што зрабілася з ім (а мо зрабілі?!) за апошнія пятнаццаць гадоў. Я памятаю яго ў Каралішчавічах дваццацігадовым малайцом, звонкім, як сасновы камель, якога мы ўсім багемным кагалам ледзь угаварылі пракаўтнуць сто грам гарэлкі...

Чысценькі. Правільны такі, прыгожы паляшуцкі маладзён — аб'ект дзявочых заляцанняў.

І вось што ад яго засталося: скура, косці ды загнаны воўчы пагляд — аднекуль у нікуды...

Плата за растрачаны Боскі талент?..

* * *

— А Сыс гэты — які ён, не пазнаёміш?

— Ды п'янтос ён...

— П'янтос, а так піша?! Што ж ён п'е?..

(З падслуханага дыялога бывалага і пачаткоўца.)

* * *

Распавёў я ў рэдакцыі гісторыю пра начны візіт да мяне Анатоля Сыса, а Разанаў пераказаў нам іншы выпадак: як Алесь Суша з тым жа Сысам завалакліся апоўначы да Яўгена Лецкі. Выпілі, вядома... Слова за слова — Сыс пачаў лаяцца, крычаць... Суцяшаюць яго, ды ён усё больш распальваецца... А ў Лецкі жонка з дачкой спяць — нервы ў яго і здалі (а ў каго не здалі б?!)... Ухапіў ён ці то нож, ці то відэлец са стала і кінуўся да Сыса: "Я табе, падла, вочы мярзотныя выкалю!"

Аднак Сыс яго ўвобмірг абяззброіў, упаўшы на калені ды ўзмаліўшыся: "Лецка, Жэнечка любы, выкалі мне вочы, выкалі, прашу цябе — хачу застацца *беларускім гамерам*!.."

* * *

Лічы — анекдот.

Прыходзіць не надта п'яны Сыс у рэдакцыю "ЛіМа". Там — Вярцінскі ў атачэнні супрацоўнікаў...

Сыс і кажа, звяртаючыся да Анатоля Ільіча: "Анатоль, ты ўсё-ткі застанешся ў гісторыі беларускай літаратуры..."

Вярцінскі расплываецца ў задаволенай і трохі ніякаватай усмешцы.

Сыс ляпае яго па плечуку і, як нічога не было, дадае: "Абавязкова застанешся... Я табе верш прысвяціў..."

* * *

Многія не любяць, калі я пішу пра Сыса ці Купрэева. Чаму? Таму, што так пісаць і так жыць, як Сыс і Купрэеў, яны не могуць.

А так хочацца! Пісаць хочацца, а жыць — колецца...

Леанід ГАЛУБОВІЧ

1989—1998 гг.

Дыяменты жыцця

Беларуская зямля багатая на таленавітых людзей. Шмат асоб аздабляюць нашу літаратуру, як дыяменты, шкада толькі, што не на ўсіх хапае чалавечай памяці. І вось яшчэ адно імя, якое нельга забываць, — Зінаіда Аляксандраўна Бандарына. 10 кастрычніка споўнілася 100 год з дня нараджэння гэтай пісьменніцы.

Звесткі ў біябібліяграфічным слоўніку "Беларускія пісьменнікі" пра яе жыццё і дзейнасць спачатку здзіўляюць невялікім аб'ёмам. А пасля прачытання ўражваюць сваёй насычанасцю. На першы погляд, звычайная біяграфія. Нарадзілася будучая паэтка і празаік у Гродне, у сям'і настаўнікаў. Скончыла сямігодку ў Мінску, з 15 гадоў працавала ў саўгасе "Тарасава" Мінскай вобласці падзёншчыцай. І ўжо тут пачаў відавочна праяўляцца актыўны, неспакойны характар Зінаіды Аляксандраўны.

Дарэчы, менавіта так — "Неспакойная" — назваў свае ўспаміны пра гэтую жанчыну Мікола Хведаровіч. Ён выдатна апісаў, як дзякуючы яе намаганням у Койданава быў створаны дзіцячы садок, якім яна потым загадвала. Але было яшчэ і жаданне вучыцца, таму Зіна Бандарына і трапіла ў Мінскі педагагічны тэхнікум, дзе ў той час выкладаў Якуб Колас. Можна меркаваць, што тады і пачалося яе станаўленне як творчай асобы. Наогул, біяграфія пісьменніцы насычана самымі рознымі месцамі працы і вучобы. Яна была настаўніцай у сібірскім пасёлку Медзякова, дзе вучыліся дзеці перасяленцаў з Беларусі; у 1933 годзе скончыла ў Маскве літаратурна-сцэнарны факультэт інстытута кінематаграфіі, некаторы час загадвала сцэнарным аддзяленнем у Віцебскім кінатэхнікуме. Пасля заканчэння ў 1937 годзе аспірантуры пры Акадэміі мастацтвазнаўства ў Ленінградзе працавала на кінастудыях і ў тэатрах Масквы, Архангельска, Горкага. У перыяд Вялікай Айчыннай вайны была санінструктарам у легендарнай Панфілаўскай дывізіі, якая абараняла Маскву. У пасляваенныя гады працавала ў розных часопісах і газетах — "Бярозка", "Зорька", "Літаратура і мастацтва" і інш. І гэта далёка не падрабязны аповед пра бурлівае жыццё пісьменніцы. М. Хведаровіч прыгадваў, што ўсе перыпетыі свайго лёсу Зінаіда Аляксандраўна ўспрымала з аптымізмам, часта сама, па ўласным жаданні кідалася туды, дзе найбольш складана. Самаадданасці і апантанасці, актыўнасці гэтай жанчыны можна толькі пазайздросціць. Аднак лёс не быў да яе літасцівы. Такая праца падарвала здароўе пісьменніцы яшчэ ў Сібіры, але сухоты не зменшылі яе прагі да дзейнасці.

Афіцыйна пачатак творчага шляху Зінаіды Аляксандраўны Бандарынай датуецца 1926 годам, калі сталі з'яўляцца першыя вершы ў часопісе "Маладняк". Гэтае літаратурнае аб'яднанне адыграла значную ролю ў яе лёсе. У 1928 годзе М. Гарэцкі ў кнізе "Маладняк" за пяць гадоў. 1923—1928 гг." называе маладую пісьменніцу адной з самых выдатных маладнякоўцаў, даючы ёй наступную характарыстыку: *"Бандарына спаміж пяснярак "Маладняка" вызначаецца большаю сувяззю з грамадскасцю, з сучаснасцю і асабліваю шчырасцю пачуцця"*. Станоўча ацэньваў М. Гарэцкі і стыль паэткі: *"Строфіка звычайная, рытмы лёгкія, далікатныя. Вобразы — з прыроды і навакольнага жыцця, заўсёды вельмі далікатныя, пяшчотныя, паэтычныя, але цалкам рэалістычныя, без усякіх сентыментальных салодкасцяў"*. У 1929 годзе з друку выходзіць аповесць "Шуміць тайга", а ў 1931 — зборнік паэзіі "Веснацвет".

Наогул жа творчасць З. Бандарынай разнапланавая. Акрамя вершаў і паэм, ёй створаны апавяданні пра франтавое жыццё, гераізм людзей на вайне; апавяданні для дзяцей; вершаваныя і празаічныя казкі, шмат публіцыстычных нарысаў і артыкулаў, драматычныя творы... Літаратурны талент шукаў выйсця, патрабаваў разнастайнай рэалізацыі. Шырокую вядомасць прынесла пісьменніцы аповесць "Ой, рана на Івана" пра дзіцячыя і юнацкія гады Янкі Купалы. Гэты твор атрымаў высокую ацэнку і ў чытачоў, і ў літаратурным коле, асобнымі выданнямі ён выйшаў на беларускай, рускай і ўкраінскай мовах.

Аповесць мае рысы і мастацкага, і дакументальнага твора, што сведчыць пра арыгінальнасць творчага падыходу пісьменніцы і яе несумненны талент. Пры параўнанні дакументаў становіцца відавочным, што аповеды сяцёр Янкі Купалы і паслужылі асновай аповесці. З 1948 года па 1950 пісьменніца працавала загадчыкам філіяла музея Янкі Купалы ў Вязынцы. Тут варта казаць пра невялікі, але каштоўны ўклад Зінаіды Аляксандраўны ў гісторыю вывучэння жыцця і творчасці паэта. Акрамя гэтага, у фондзе Зінаіды Аляксандраўны ў архіве-музеі захоўваюцца рукапісы са звесткамі пра Кузьму Чорнага, Максіма Багдановіча, Элізу Ажэшку. Ужо будучы цяжкахворай, Бандарына распачала працу над аповесцю пра Якуба Коласа, але завяршыць яе не паспела.

Вера ГАРНОЎСКАЯ

Фота з фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва.

Віншуем

з **85**-годдзем **Лепешава** Івана Якаўлевіча, беларускага мовазнаўцу.

з **85**-годдзем **Мурашку** Анцінею Рыгораўну, беларускага мовазнаўцу.

з **80**-годдзем **Гроднева** Міколу (Мікалая Пятровіча), беларускага пісьменніка.

з **70**-годдзем **Мішчанчука** Мікалая Іванавіча, беларускага паэта, літаратуразнаўцу.

з **70**-годдзем **Халіпа** Уладзіміра Трафімавіча, беларускага тэатразнаўца, мастацтвазнаўца, пісьменніка.

з **60**-годдзем **Якімовіча** Аляксея Мікалаевіча, беларускага пісьменніка.

Юбілейны каляндар

190 гадоў **Незабытоўскаму** Аляксандру, беларускаму і польскаму пісьменніку, гісторыку, філосафу.

125 гадоў **Грынкевічу** Францішку, беларускаму культурнаму і рэлігійнаму дзеячу.

125 гадоў **Ждановічу** Фларыяну Паўлавічу, беларускаму акцёру, рэжысёру, тэатральнаму дзеячу.

110 гадоў **Бабарэку** Адаму Антонавічу, беларускаму празаіку, паэту, крытыку.

110 гадоў **Жыркевічу** Міхаілу Іванавічу, беларускаму мовазнаўцу.

110 гадоў **Курдзіну** Дзмітрыю Іванавічу, беларускаму драматургу, паэту.

100 гадоў **Бандарынай** Зінаідзе Аляксандраўне, беларускаму празаіку, паэту, культурнай дзяячцы.

100 гадоў **Блісцінаву** Міхаілу Міхайлавічу, беларускаму пісьменніку.

100 гадоў **Ракіце** Сяргею (Законнікаву Сяргею Васільевічу), беларускаму паэту.

90 гадоў **Міхалюту** Івану Францавічу, беларускаму тэатразнаўцу.

80 гадоў **Хромчанку** Кузьму Рыгоравічу, беларускаму літаратуразнаўцу, крытыку.

75 гадоў **Шэрману** Карласу Рыгоравічу, беларускаму пісьменніку, перакладчыку.

50 гадоў **Сысу** Анатолю Ціханавічу, беларускаму паэту.

Рэпліка

Ізноў пад клёнам

З цікавасцю прачытаў артыкулы "За мігам міг — радок за радком" Наталлі Капы і "Пасля хрышчэння ад клёна" Марыны Карабянковай наконт паэтычнага зборніка Ізяслава Катлярова "Принял я крещение от клёна". Аргументацыя Наталлі Капы, пацверджаная шматлікімі вытрымкамі, пераканаўчая і сведчыць пра дастатковае веданне крытыкам прадмета размовы. Здзівіў водгалас спадарыні Карабянковай, у якім Капа ледзьве не "кілер" — і не мае паэтычнага густу, і крытыка яе "аглабельная", некім зададзеная, і наогул артыкул яе — "опус", а кніжка Катлярова добрая, таму што падабаецца Каравянковай. І у той жа час у артыкуле спадарыні Каравянковай не абвержаны ніводзін радок артыкула Капы. Хіба ж гэта палеміка? Хутчэй гэта нагадвае вясковую сцэну, дзе апанент у запале спрэчкі пры адсутнасці аргументаў паказвае язык, альбо іншыя часткі цела.

Не трымаю я ў душы праклёна —
Зноў ужо не быць у той рацэ,
Дзе хрышчэнне
я прымаў ад клёна
Праз дубец у дзедавай руцэ.

З аглаблёю быў дубец раднёю,
Міг за мігам
час змяніўся наш
І біёлаг хрысціць аглаблёю
Крытыка,
што думае інакш...

За радком —
радок, зусім не раптам
Суб'ектыўнасць можна
і спрасціць.
Ну а чым паталагаанатам
Урэшце будзе крытыка
хрысціць?

Густу паэтычнага бракуе?
Толькі ж кожны —
майстар сваіх спраў...
Толькі тут глухі і не пачуе
Хто каго пад клёнам заказаў...

Аляксандр БАРДОЎСКІ

«Чалавек, які не чытае, варты спачування...»

Так, відаць, здараецца досыць часта. Ходзіш сабе поруч з цікавым чалавекам і не дужа задумваешся над тым, чым жа ён можа быць прыцягальны. Нэлі Іванаўна Лістапад — бібліятэкар СШ № 62 горада Мінска. І з ёю я магу сустракацца кожны дзень. Але не часта бываюць такія размовы, якая ў нас адбылася аднойчы. І як мне асабіста падаецца, думкі нашай школьнай бібліятэкаркі, яе развагі пра жыццё і кнігу — прадмет для роздуму. Слова — Нэлі Іванаўне Лістапад.

— Неяк мне давялося прачытаць пра тое, што Пётр Першы распарадзіўся бясплатна карміць тых, хто чытае. Якім жа "бонусам" можна заахвоціць да чытання сённяшніх школьнікаў? — спыталася я ў свайго школьнага бібліятэкара.

— Пытанне і для мяне цяжкае...Сённяшняя моладзь, сапраўды, не дужа любіць чытаць. Вось і ў нашу бібліятэку ў асноўным паступае вучэбная літаратура. А хацелася б, каб паліцы болей вабілі сучаснымі мастацкімі кнігамі. Не хапае і навінак пазнавальнага характару. Вось, можа быць, разнастайнасць кніжных навінак і спрыяла б большай увазе да кнігі...

— Філосаф Іван Ільін аднойчы заўважыў: па чытанню можна пазнаць чалавека. Бо кожны з нас ёсць тое, што ён чытае. Як бы вы пракаменціравалі гэтыя словы ў дачыненні да сучасных дзяцей, якія прыходзяць у школьную бібліятэку?

— На жаль, сёння многія зусім нічога не чытаюць. Канечне ж, гэта дрэнна. Бо ў таго чалавека, які не чытае, неразвітая мова, ён не можа быць цікавым суразмоўцам. Рэсурс зносін у такога чалавека, які ігнаруе кнігу, абмежаваны. Знаёмства з новымі кнігам дапамагае пашырыць кола інтарэсаў, робіць юнака ці дзяўчыну шматкроць багацейшым інтэлектуальна.

— І ўсё ж, на ваш погляд, у чым галоўныя прыярытэты моладзі: камп'ютэрная адукацыя, майстэрства зарабляць грошы альбо нешта іншае.?

— На маю думку, у сённяшні складаны час патрэбна ўсё: і камп'ютэрная адукацыя, і майстэрства зарабляць грошы, і шмат што яшчэ. Але нельга ісці наперад, нельга развівацца гарманічна без суладдзя прыярытэтаў. І калі адукацыя праз кнігу зойме ў памкненнях маладых людзей апошняе месца, то наўрад ці такая гармонія магчымая.

— А вось раптам у вас папрасілі парады тыя, хто жадае звязаць свой лёс з кнігай — стаць бібліятэкарам, кнігавыдаўцом ці нават пісьменнікам...

— Усе гэтыя тры заняткі досыць цікавыя. У кожнага — свае адметнасці, свая прафесійная скіраванасць. Але я параіла б адважыцца звязаць свой лёс з кнігай толькі таму, хто, акрамя пэўных схільнасцей, яшчэ і пасапраўднаму ўлюбёны ў літаратуру.

— Нэлі Іванаўна, у каго, як не ў вас спытаць пра будучыню беларускай літаратуры?

— Вельмі люблю чытаць класіку. Узровень сённяшняй літаратуры, на мой суб'ектыўны погляд, пакідае жадаць лепшага. Каб атрымаўся сапраўдны верш, трэба шмат працаваць. Часам якраз працы ў многіх публікацыях і не заўважна. З сучасных паэтаў вылучаю Раісу Баравікову, якая піша вельмі цікавую любоўную лірыку. А вось сярод створанага маладымі шмат такога, што, здаецца, вельмі і вельмі далёкае ад прыгожага, прыгажосці, ад непаўторнага, арыгінальнага, без чаго, пагадзіцеся, няма сапраўднай літаратуры. Іншы раз чытаеш і неўпрыкмет прыходзіш да пераканання, што аўтар і сам не разумее, дзеля чаго і што ён піша.

— А як бы вы ахарактарызавалі сённяшняга чытача нашай школьнай бібліятэкі?

— У асноўным прыходзяць вучні, якія ідуць па кнігі са школьнай праграмы. Нічога дрэннага ў гэтым няма, наадварот — малайцы, выконваюць свае вучнёўскія абавязкі, клапоцяцца пра адзнаку. Але так хочацца, каб чытанне выходзіла яшчэ і за рамкі праграмы, каб да кнігі, у тым ліку і да кнігі на беларускай мове, цягнуліся без прымусу, з настроем на адкрыццё новага і раней невядомага.

— Ці патрэбна бібліятэкару быць разважлівым і спагадлівым да чытача?

— А як жа! Бібліятэкар — партнёр чытача ў пошуку патрэбнай кнігі. Іначай і не варта служыць кнізе. Трэба многа самому чытаць, каб даць правільную параду.

— А вы самі ў дзяцінстве любілі чытаць?

— Вельмі. Бацька быў вайскоўцам, маці — настаўніцай. Матуля купляла мне шмат дзіцячых кніг. Іх я, здаралася, перачытвала па некалькі разоў, штораз адкрываючы ў кнігах нешта новае.

— І ўсё ж такі, што ёсць для вас бібліятэка? І як вы асабіста разумееце такое выслоўе: "Кнігі — лекі душы"..?

— Бібліятэка для мяне і ёсць месца для адпачынку душой, сэрцам. Калі чытаеш сімпатычныя табе кнігі, то як быццам лечыш свой унутраны, фізічны, псіхалагічны стан. Мне даспадобы творы Пушкіна, Дастаеўскага.

— Скажыце, ці марылі вы ў маладосці менавіта пра такую прафесію?..

— Спярша выбрала інстытут замежных моў. Але так здарылася, што моцна захварэла. І пасля, пакінуўшы інстытут, доўгі час ляжала ў бальніцы. А калі вылечылася, то пайшла вучыцца ў інстытут культуры на бібліятэчнае аддзяленне. Закончыла інстытут і стала працаваць бібліятэкарам, аб чым ніколькі не шкадую.

— Кажуць, што чытанне — адукацыя розуму і сэрца...

— З чытаннем развіваюцца і душа, і інтэлект. Набыццё ведаў праз кнігі, газеты, часопісы — гэта дарога наперад. А жыццё ж і ёсць пастаянны рух, пастаяннае развіццё... Іначай хіба цікава існаваць у гэтым няпростым свеце?!.

Гутарыла Дар'я ШОЦІК,
вучаніца 11 "В" класа
СШ № 62 г. Мінска

Зміцер Папоў нарадзіўся ў Адэскай вобласці, скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут у 1965 годзе па спецыяльнасці скульптура. Вучыўся ў слынных майстроў А. Бембеля і А. Глебава.

За час працы ў Гомельскіх мастацка-вытворчых майстэрнях прымаў удзел у абласных, рэспубліканскіх, усесаюзных і міжнародных выставах — Польшча і Нямеччына, Чэхаславакія і Малдова, Украіна і Латвія.

Скульптурныя працы З. Папова знаходзяцца ў Дзяржаўным нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, у Музеі сучаснай беларускай скульптуры імя А. Бембеля, у Дырэкцыі мастацкіх выставак у Маскве, у Палацы Румянцавых-Паскевічаў, у шэрагу рэгіянальных галерэй і музеяў, у прыватных калекцыях.

Маюць цікавасць яго гістарычныя партрэты. Ім створаны выдатны вобраз князёўны Ірыны Паскевіч у Гомелі, помнік-бюст Ф. Паскевічу ў Добрушы, бюст фельдмаршалу князю І. Паскевічу.

Створана каля трыццаці мемарыяльных дошак. Сярод іх — акадэміку С. Чуніхіну, вучонаму-псіхолагу С. Выгодскаму, народнаму артысту Беларусі А. Рыбальчанку, старшыні Гомельскага абласнога выканкама — арганізатару ліквідацыі наступстваў Чарнобыльскай катастрофы — Аляксандру Грахоўскаму...

Князёўна Ірына — візітоўка Гомеля

Мы сядзім у майстэрні Зміцера Папова, вядзём размову.

Побач з намі скульптуры Васіля Быкава і маршала Георгія Жукава, народнага артыста Расіі Юрыя Куклачова і скульптара Грэцыі Рокаса Кірыакаса, народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа і Героя Савецкага Саюза Пятра Галавачова...

—Паступіў на трэці курс мастацкага вучылішча ў Кішынёве. На аддзяленне скульптуры. Гэты жанр мяне чамусьці больш вабіў, чым жывапіс. Паўгода лічыўся вольным слухачом, але дасягнуў свайго — мяне залічылі, нават стыпендыю прызначылі. Ну, а потым Беларусь — тэатральна-мастацкі інстытут. Першыя мае творчыя працы — бюсты М. І. Кутузава і фельдмаршала Русянцава-Задунайскага, рэльеф "Кутузаў і Суворaў пры штурме Ізмаіла". Дарэчы, яны сёння знаходзяцца ў краязнаўчым музеі горада Кагула — у Малдове.

— ***Зміцер, а чаму менавіта ў Беларусь была выбрана дарога? Выпадкова?***

— Ды не зусім... Сталася так, што ўсе выпускнікі Кішынёўскага вучылішча вырашылі паступаць вучыцца далей. А каб не рушылі ўсе ў нейкую адну навучальную ўстанову, стварыўшы сабе канкурэнцыю, дамовіліся разбіцца на асобныя маленькія купкі. Я марыў паступаць у піцерскую акадэмію мастацтваў — бліжэй да мора. А туды намерыліся паехаць два маіх аднакурснікі. З двух паступіў толькі Віктар Фяцісаў. У Мінск са мной паехалі два жывапісцы і адзін графік. Паступіла двое — я і Васіль Бондар.

— ***Кожны творца — пісьменнік, мастак, дойлід, паэт — працуе з творчым запалам, беручы ў памочнікі Музу натхнення. Хто і што стала тваім натхненнем у тваім мастакоўскім жыцці?***

Зміцер усміхаецца, перавадзіць позірк некуды ўбок:

— А яна тут, побач. Вось яна, мая Муза.

Прымружыўшы вочы, падстаўляючы гожы і малады твар сонцу і паўднёваму ветру, задумена застыла дзяўчына. Маўкліва пытаюся ў яго, прашу растлумачыць, якія адносіны мае скульптура да яго натхнення.

— Ды гэта мая Людачка, — смяецца мастак, — я ўвасобіў яе ў бронзе і граніце і назваў "Паўднёвы вецер". Ужо на апошнім курсе, як заканчваў вучобу, сустрэў нечакана дзяўчыну, якая паступала на акцёрскае аддзяленне. Зірнуў у вочы — і... Другім вачэй, акрамя яе, я ўжо не бачыў, гэта быў акіян, па якім я паплыў пад ветразямі, у якія дзьмуў паўднёвы вецер. Яна стала маёй жонкай. Прыехалі да яе на радзіму — у Рэчыцу — і наладзілі вяселле.

— ***Ірына Паскевіч, князёўна... Выдатная скульптура! Як яна знайшла прапіску ў горадзе? Чыя гэта была ініцыятыва?***

— Аляксандра Якабсона — старшыні аблвыканкама. На адной з творчых сустрэч ён выказаў меркаванне ці папрок, што добра было б, каб горад упрыгожыла скульптура жанчыны, маці, беларусачкі... Звярнуліся да мяне. Я з радасцю згадзіўся вырабіць скульптуру Жанчыны. Былі дзесяткі варыянтаў, і яе амаль зацвердзілі, але... Але нечакана паступіла новая, канкрэтная ўжо, прапанова — зрабіць скульптуру Ірыны Паскевіч.

— ***Ірына была высокаадукаваным чалавекам?***

— Так, перад тым, як узяцца за гэты вобраз, мне прыйшлося адшукваць пра яе звесткі. Даведаўся, што яна пераклала на французскую мову "Вайну і мір" Л. Талстога. Сама пісала апавяданні, вершы. У яе хаце збіраліся мастакі і пісьменнікі, паэты і вучоныя. Яна была вялікай мецэнаткай. Сваіх дзяцей Бог не даў, дык яна ўсю сваю пяшчоту аддавала дзецям-сіротам і абяздоленым. Пражыла больш як дзевяноста гадоў. Жыла ў беднасці. Памерла не ад старасці, а ад запалення лёгкіх. Жанчыне не аказалі своечасова дапамогу... Я прадставіў на суд аблвыканкама пяць варыянтаў скульптуры — у поўны рост і калі яна сядзіць на лаўцы, трымаючы ў руках раскрытую кнігу. Выбралі два варыянты. А потым спыніліся на той, якая стаіць па вуліцы Ірынінскай.

На рахунку Зміцера Аляксандравіча Папова звыш пяцідзесяці выстаў — ад гарадскіх і раённых да рэспубліканскіх і міжнародных. І ўсюды прызнанне. Сотні надрукаваных матэрыялаў і фотарэпартажаў ў розных газетах, часопісах, тэле- і радыёнарысы. Усяго не пералічыць.

За цыкл прац, прысвечаных моладзі, стаў лаўрэатам прэміі абласнога камітэта камсамола (1975). Узнагароджаны ў 2001 годзе Граматай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі Беларусі, Спецыяльнага фонду Прэзідэнта краіны за працу па падтрымцы таленавітай моладзі (з 1996 па 2001 гады вёў курс скульптуры ў Гомельскім мастацкім вучылішчы, набраў і выпусціў восем маладых скульптараў). Мае Ганаровую грамату аблвыканкама – 1987 год, граматы Беларускага Саюза мастакоў, упраўлення культуры Гомельскага аблвыканкама, Грамадскага аб'яднання "Таварыства Кірылы Тураўскага", медаль БСМ "За заслугі ў выяўленчым мастацтве" — 1999 год.

Сёлета, у верасні, адбылося адкрыццё персанальнай выставы Зміцера Папова ў Палацы паркавага ансамбля Паскевічаў у Гомелі. Падчас адкрыцця выставы майстар сказаў:

— Я прыняў рашэнне падараваць Гомелю трыццаць сваіх скульптур. Няхай гарадскія ўлады знойдуць месца, дзе іх размясціць, і каб гэта было пастаянным месцам — залай пад назвай "Паўднёвы вецер" ці "Сожскія актавы"...

У гэтым годзе будзе адкрыты помнік графу Захару Чарнышову ў Чачэрску, які пакінуў добры след у памяці нашчадкаў. Выказалі жаданне працягнуць такую добрую традыцыю Рэчыца, Добруш, Калінкавічы...

А марыць мастак стварыць вобразы Тадэвуша Касцюшкі і Кастуся Каліноўскага, вялікіх князёў Вялікага княства Літоўскага...

...У мастака мноства задум, мноства праектаў. І няхай Бог дапаможа яму здзейсніць усё, ажыццявіць!

Анатоль БАРОЎСКІ,
Гомель
Фота аўтара

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

Рэдакцыйная калегія:
Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар,
намеснік — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
крытыкі
і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі — 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнэце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя
не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі
можа не супадаць
з меркаваннямі
і думкамі аўтараў
публікацый.
Набор і вёрстка
камп'ютэрнага цэнтра
РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова
"Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства
"Выдавецтва
"Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3016
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк
29.10.2009 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 7
Заказ — 5943

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686

У наступным нумары «ЛіМа»

Пад рубрыкай "Гусіным пяром"
Леанід Галубовіч піша пра паэтку з Ганцаўшчыны, сацыяльнага работніка Ніну Кавальчук, маці чатырох дзяцей, якая выдала ў мясцовай друкарні свой першы вершаваны зборнік "Летуценніца". Хіба не вартыя чытацкай увагі вось такія радкі:

Зноў душу агарнуў мне адчай,
Пазайздросціла тым, хто не піша.
Спяць спакойна. Прашу, выбачай, Божа.
Ты за паэзію вышай.

"На жаль, зямны свет створаны так, — піша Л Галубовіч, — што і дзівакоў забываюць, Але — не самае дзівацтва, А калі яно яшчэ і дзейнатворчае, то пра яго і распавядаюць."

З глыбінкі

Магія колеру

Трывожнае чырвонае неба. Усплеск гэтай чырвані ў перадсвітальных хвалях ракі. Сінява далёкіх узвышшаў, зарослых саснякамі... І коні, прыгожыя коні на беразе. Трывогай павявае ад гэтага невялікага па памеры палатна. І подпіс — "Коні ў 30-кіламетровай зоне. Май 1986-га".

Праз вобраз пакінутых коней, вечных спадарожнікаў працоўнага чалавека, яна, трагедыя гэта, асабліва ўражвае. А побач — спакойная плынь начной Прыпяці з дарожкай месяца на хвалях. І аганькі бакенаў як вечны сімвал ракі-працаўніцы... Вось так стварыць у кароткія мінуты для нас розны па афарбоўцы настрой пад сілу толькі мастаку. Гэта яшчэ раз пацвярджаецца персанальнай выстаўкай хойніцкага мастака Генадзя Чачанкова, якая ладзілася ў Хойніцкай дзіцячай школе мастацтваў.

Каля трэці ўсіх напісаных ім работ — на тэму ракі Прыпяць і яе стану ва ўсе поры года. Прыкметна, што аўтар занепакоены яе лёсам.

Увогуле ж, напружаным годам для мастака, калі лічыць па датах стварэння карцін, быў менавіта 1986, які ў гісторыю Хойнік занесены як час ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Значная частка работ створана менавіта ў гэты перыяд як адлюстраванне смутку па тым, што мы згубілі, як заклік берагчы прыроду, разумна гаспадарыць на зямлі і любавацца яе краявідамі. Вялікую ўвагу прыцягваюць карціны "Нацюрморт з зялёнай бутэлькай", "Восень", "Іней", "Вязуць сена", "Пара цвіцення сон-травы", "І зноў я наведаў...", "Верас цвіце".

Карціны мастака экспанаваліся на абласных рэспубліканскіх прафесіянальных выстаўках. Адно з палотнаў Чачанкова было падаравана дэлегацыі з Польшчы, многія знаходзяцца ў асабістых калекцыях грамадзян Беларусі, Расіі, Італіі, Германіі, Ірландыі. Карціну "Да апошняга патрона" аўтар падарыў Хойніцкаму краязнаўчаму музею.

Клаўдзія БОСАК